Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 ЛІСТАПАДА 2008 г.
АЎТОРАК
№ 222
(26335)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр Косінец назначаны старшынёй Віцебскага аблвыканкама

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 лістапада прыняў са справаздачай віцэ-прэм'ера Аляксандра Косінца — упаўнаважанага прадстаўніка Прэзідэнта па Віцебскай вобласці.

Аляксандр Косінец ва ўрадзе курыруе сацыяльную сферу. Ён далажыў Прэзідэнту аб стане спраў у гэтай галіне, аб ходзе рэалізацыі шэрагу дзяржаўных праграм.

Ён таксама праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб сацыяльна-эканамічным развіцці Віцебскай вобласці, выкананні прагнозных паказчыкаў. Размова ішла аб праблемных пытаннях у галіне эканомікі, аграпрамысловага комплексу, у прыватнасці, аб прычынах невыканання прагнозных паказчыкаў у АПК. Прэзідэнтам была пастаўлена задача дасягнуць тэмпу росту вытворчасці сельгаспрадукцыі на ўзроўні 108,5 працэнта, а фактычна ён склаў 104,4 працэнта.

На сустрэчы абмяркоўваліся вынікі дзейнасці прамысловага сектара, у прыватнасці, былі закрануты пытанні бясстратнай работы прадпрыемстваў, развіцця будаўнічай галіны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і сацыяльнай сферы.

У гэты ж дзень, 24 лістапада, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам назначыў Аляксандра Косінца старшынёй Віцебскага аблвыканкама, вызваліўшы яго з пасады намесніка прэм'ер-міністра. У адпаведнасці з заканадаўствам кандыдатура Аляксандра Косінца ўносіцца на зацвярджэнне Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, сесія якога адбудзецца 25 лістапада.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «пасада губернатара — ключавая ў дзяржаве, без яго нельга вырашыць практычна ні аднаго пытання».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Тыя функцыі, якія ў свой час выконвалі партыйныя органы, зноў ляглі на плечы губернатараў — у частцы кадравай, ідэалагічнай работы, палітычных кампаній, таму тут роля губернатараў узрастае». Прэзідэнт падкрэсліў, што для Аляксандра Косінца гэтыя пытанні не з'яўляюцца новымі, яму даводзілася займацца імі на ранейшых пасадах. Будучы віцэ-прэм'ерам, Аляксандр Косінец быў упаўнаважаным прадстаўніком Прэзідэнта па Віцебскай вобласці і добра знаёмы з сітуацыяй у рэгіёне, у якім ён раней працаваў.

Да гэтага Віцебскую вобласць узначальваў Уладзімір Андрэйчанка, які выбраны старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, і таму ў адпаведнасці з заканадаўствам вызвалены з пасады губернатара.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю агенцтву «Франс-Прэс»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Франс-Прэс» адказаў больш як на 50 пытанняў, якія закранаюць шырокае кола тэм, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У прыватнасці, размова ішла аб адносінах Беларусі з Еўрасаюзам, Расіяй, Злучанымі Штатамі Амерыкі і ў цэлым аб напрамках знешняй палітыкі рэспублікі. Французскія журналісты цікавіліся таксама ўнутраным ладам дзяржавы, яе сацыяльна-эканамічным развіццём. Шмат увагі было ўдзелена пытанням эканомікі. Кіраўнік дзяржавы адказаў і на шэраг асабістых пытанняў.

Інфармацыйнае агенцтва «Франс-Прэс», заснаванае ў 1835 годзе, — адно з самых буйных у свеце. Мае 150 прадстаўніцтваў у розных краінах. Навіны агенцтва даступныя на англійскай, арабскай, іспанскай, нямецкай, партугальскай і французскай мовах. У штаце агенцтва — больш як 1,2 тыс. прафесійных журналістаў, у тым ліку каля 200 фатографаў, а таксама больш як 2 тыс. карэспандэнтаў, якія працуюць на дагаворнай аснове ў 165 краінах. Усяго ж на агенцтва па ўсім свеце працуюць каля 4 тыс. чалавек. Акрамя стужкі навін «Франс-Прэс» прапануе радыёрэпартажы, камп'ютэрную графіку і мультымедыйныя паслугі для сеткі інтэрнэт.

БЕЛТА.

Усевалад ЯНЧЭЎСКІ:

«ІНТЭРНЭТ БЕЛАРУСІ БЫЎ, ЁСЦЬ І БУДЗЕ СВАБОДНЫМ»

Аб гэтым учора заявіў у Мінску падчас работы «круглага стала» на тэму: «Інтэрнэт-СМІ: выклікі XXI стагоддзя» памочнік Прэзідэнта — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Усевалад Янчэўскі.

Сустрэча за «круглым сталом» прадстаўнікоў дзяржаўных і недзяржаўных друкаваных выданняў, інфармацыйных агенцтваў, радыё і тэлебачання, інтэрнэт-СМІ, дыпламатаў, юрыстаў, аналітыкаў, замежных гасцей — спецыялістаў у гэтай галіне была арганізавана Міністэрствам інфармацыі, Міністэрствам замежных спраў краіны сумесна з АБСЕ (Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе), а дакладней, яе Бюро па пытаннях свабоды СМІ і офісам АБСЕ ў Мінску.

У сваім прывітальным слове Усевалад Янчэўскі пачаў, бадай, з галоўнага — тлумачэння той асноўнай прычыны, якая стала нагодай для правядзення «круглага стала». Па словах памочніка Прэзідэнта, ужо адносна працяглы час у грамадстве мусіруюцца чуткі аб тым, што дзяржава мае рашучы намер увесці цэнзуру ў інтэрнэце, сур'ёзна абмежаваць доступ у сетку яе беларускіх карыстальнікаў, закрыць шэраг апазіцыйных сайтаў. Усевалад Янчэўскі ўнёс яснасць: нічога такога не плануецца. Таму дыскутаваць на гэту тэму — марнаваць час, перакананы ён. Калі і ўзнікне неабходнасць у нейкім рэгуляванні інтэрнэта, то ніхто гэтага не будзе рабіць келейна. Усе захады будуць абмяркоўвацца адкрыта, галосна і з удзелам стваральнікаў інтэрнэт-СМІ, нават і тых, хто крайне непрымірыма ставіцца да ўлады.

Разам з тым ён звярнуў увагу на тое, што не трэба блытаць нармальнае, па яго словах, прававое рэгуляванне з цэнзурай. Усевалад Янчэўскі агучыў яшчэ адзін цікавы тэзіс: дзяржава вельмі зацікаўлена ў імклівым развіцці інтэрнэту. Больш за тое, яна будзе ўсяляк садзейнічаць гэтаму, каб Беларусь па ўзроўні развіцця інтэрнэту стала побач з вядучымі краінамі свету.

Увагуле падчас работы «круглага стала» адбылася цікавая і змястоўная дыскусія на зададзеную тэму, карысны абмен думкамі і інфармацыяй. У многім гэта было выклікана тым, што ў параўнанні з традыцыйнымі друкаванымі і электроннымі выданнямі інтэрнэт-СМІ — гэта новая журналістыка, дакладней, яе новы від, які толькі знаходзіцца ў пачатку свайго станаўлення. З аднаго боку, іх адрознівае выключная аператыўнасць у падачы інфармацыі, неабсяжнасць аўдыторыі, вельмі нізкі сабекошт распаўсюджвання звестак і г.д. А з іншага боку, інтэрнэт-СМІ нярэдка ператвараюцца ў месца канцэнтрацыі хлусні, плётак, неправераных чутак, наўмысна скажонай інфармацыі, становяцца інструментам абразы апанентаў. Таксама гэтыя СМІ грашаць плагіятам, парнаграфіяй, даюць парады і рэкамендацыі па тэхніцы экстрэмізму, махлярства і падману органаў улады. Невыпадкова больш за трэць новых інтэрнэт-СМІ хутка памiраюць пасля выхаду ў Сетку. Праўда, на іх месца прыходзіць яшчэ большая колькасць інтэрнэт-СМІ.

Інтэрнэт-СМІ — з'ява, якая яшчэ да канца не вывучана і не асэнсавана ні ў нас, так і за мяжой. Такую выснову можна зрабіць з выступленняў беларускіх і замежных удзельнікаў «круглага стала», у прыватнасці, дырэктара офіса АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Роланда Блеса, кіраўніка офіса АБСЕ ў Мінску пасла Ханса-Ёхенса Шмідта, якія гаварылі аб падыходах арганізацыі, якую яны прадстаўляюць, да прабалем інтэрнэт-СМІ. Дарэчы, у ходзе дыскусіі высветлілася, што і асаблівых разыходжанняў у падыходах па іх вырашэнні паміж імі і памочнікам Прэзідэнта няма. Усевалад Янчэўскі сказаў, што ён згодны з многім, аб чым гаварыў у сваім выступленні Роланд Блес. А ён, нагадаю, зрабіў даклад аб прынцыпах АБСЕ ў рэгуляванні інтэрнэт-СМІ.

Дарэчы, дырэктар маскоўскага Інстытута праблем інфармацыйнага права Андрэй Рыхтар параіў не перайматься расійскі вопыт у гэтай сферы, бо ён пакуль вельмі недасканалы. А вось што датычыцца Беларусі, то Андрэй Рыхтар даў высокую ацэнку сучаснаму ўзроўню развіцця інтэрнэту ў нашай краіне, які вышэй, чым у Расіі і іншых дзяржавах СНД. Ён прызнаўся, што быў прыемна здзіўлены некаторымі апошнімі звесткамі статыстыкі Міжнароднага саюза электрасувязі, згодна з якімі Беларусь і па інтэрнэт-рэсурсах, і па колькасці іх карыстальнікаў лідзіруе ў СНД. У пэўным сэнсе «круглы стол» у канферэнц-зале мінскага гатэля «Вікторыя» стаў значным укладам у вывучэнне феномена інтэрнэта і яго маладой журналістыкі. Удзельнікі размовы паспрабавалі даць свой адказ на пытанне: у чым выклік з боку інтэрнэт-СМІ нашаму XXI стагоддзю?

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Жыхар вёскі Кублічы Ушацкага раёна Канстанцін БАРАТЫНСКІ з дочкамі Настассяй, Марыяй і Аленай складвае зімовы запас дроў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Іван Церцель назначаны намеснікам старшыні КДБ па забеспячэнні эканамічнай бяспекі і барацьбе з карупцыяй

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў палкоўніка Івана Церцеля намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі па забеспячэнні эканамічнай бяспекі і барацьбе з карупцыяй. Адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 лістапада.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АПАДКІ ЗАХАВАЮЦЦА ДА ВЫХАДНЫХ

У бліжэйшыя суткі характар надвор'я амаль не зменіцца, бо амаль паўсюдна будзе ісці снег, удзень па паўднёвым усходзе дождж, слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Ужо з серады надвор'е пачне паляпшацца. Толькі месцамі пройдзе невялікі кароткачасовы снег, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы мінус 2—8 градусаў, удзень ад 0 да 5 марозу. У чацвер захаваюцца невялікія ападкі, тэмпература ўначы мінус 1—6, удзень — ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. У пятніцу ападкі будуць назірацца па паўночнай палове краіны галоўным чынам у выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. На выхадныя да нас завітае больш цёплае паветра з боку Заходняй Еўропы. Ападкаў амаль не будзе, толькі па паўднёвым захадзе чакаецца кароткачасовы мокры снег. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак каля 0. Снежнае покрыва памерам больш як 13 сантыметраў у апошняй дэкадзе лістапада бывае ў нашай краіне раз у 15 гадоў.

Сяргей КУРКАЧ.

КРЭДЫТ МВФ: ПРАЦЯГ У СНЕЖНІ

Першы этап работы беларускага Урада і Нацыянальнага банка з місіяй Міжнароднага валютнага фонду над пагадненнем аб прадастаўленні нашай рэспубліцы крэдыту ў памеры 2 мільярдаў долараў ЗША завяршыўся паспяхова, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

У Нацбанку нагадалі, што наша краіна звярнулася па атрыманне гэтага крэдыту з мэтай павелічэння дзяржаўных золатавалютных рэзерваў і стварэння «падушкі бяспекі», якая неабходна для стабільнай працы эканомікі ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу. Ужо ў снежні, калі місія МВФ зноў будзе знаходзіцца з візітам у Беларусі, абмеркаванне пытанняў, што маюць тэхнічны характар, працягнецца.

Ігар ГРЫШЫН.

РУЖЖО СУПРАЦЬ СНЕЖАК. ХТО КАГО?

Першы снег, што выпаў у мінулую суботу, выклікаў у групы падлеткаў вёскі Ліпаў Калінкавіцкага раёна жаданне пагуляць у снежкі. Спачатку яны «абстрэльвалі» імі саміх сябе, разбіўшыся на «атрады», а потым выбралі ў якасці мішэні вокны мясцовага пенсіянера, 1933 года нараджэння. Той, як кажуць, гульню прыняў. Толькі настолькі неадэкватна, што выйшаў на двор і распачаў стральніну, дарэчы, з незарэгістраванага паляўнічага ружжа «ТОЗ-БМ» 16 калібру. Першыя пяць стрэлаў — у неба. А шосты — у перапалоханых хлапцоў, якія пусціліся наўцёкі. Зарад трапіў у галаву дзевяцікласніка, які падчас дастаўкі ў бальніцу памёр. Цяпер высвятляюцца ўсе абставіны гэтай трагедыі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

МЗС БЕЛАРУСІ БЫЛІ ПРЫНЯТЫ НЕАБХОДНЫЯ МЕРЫ ДЛЯ ВЯРТАННЯ ТАЦЦЯНЫ КАЗЫРЫ З ЗША

Для вяртання непаўналетняй беларускі Таццяны Казыры на радзіму са Злучаных Штатаў знешнепалітычнае ведамства Беларусі і амерыканскі бок прынялі ўсе неабходныя меры. 23 лістапада дзяўчынка паспяхова вярнулася з ЗША ў Беларусь. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі Міністэрства замежных спраў Беларусі Марыя Ваньшына. Паводле яе слоў, МЗС Беларусі ў кантакце з кампетэнтнымі органамі ЗША прыняў неабходныя меры па вяртанні Таццяны на радзіму ў адпаведнасці з заявай Надзеі Новік, якая з'яўляецца яе бабуляй і апекуном.

СМЕРЦЬ НА СУСТРЭЧНАЙ...

Снегапад, слізкая дарога і няправільны выбар хуткасці — вось, бадай, асноўныя прычыны, якія выклікалі на дарогах рэспублікі ў мінулыя выхадныя мноства дарожна-транспартных здарэнняў: за пятніцу і выхадныя ў ДТЗ загінулі 18 і пацярпелі 67 чалавек.

Днём у суботу ў Смалявіцкім раёне на дарозе паблізу пасёлка Зялёны Бор 25-гадовы жыхар вёскі Александрыя Шклоўскага раёна на аўтамабілі «Опель» выехаў на сустрэчную паласу, дзе сутыкнуўся з грузавым «Вольва». У выніку гэтага ДТЗ вадзіцель легкавушкі, а таксама яго 21-гадовая жонка, 44-гадовы цесць і 41-гадовая цешча загінулі. Гэтакі ж манеўр каштаваў жыцця бацькам 43-гадовага мінчаніна, які знаходзіўся за рулём «Жыгулёя»: яго машына на сустрэчнай паласе не размінулася з аўтафурай. 62-гадовая маці вадзіцеля «жыгулёя» загінула на месцы, а бацька быў дастаўлены ў бальніцу, дзе, на жаль, урачы не змаглі выратаваць пенсіянера.

Не менш трагічныя наступствы аварыі, што здарылася ў суботу каля паловы дзясятай раніцы паблізу вёскі Маглышы Слуцкага раёна. Жыхар Салігорска, кіруючы «Фольксвагенам», на сустрэчнай сутыкнуўся з МАЗам. 13-гадовы сын вадзіцеля «Фольксвагена» загінуў на месцы, а ён сам разам з жонкай і 24-гадовым пасажырам былі дастаўлены ў бальніцу, дзе вадзіцель памёр.

Ігар ГРЫШЫН.

Заробкі

Налічаная сярэдняя зарплата работнікаў у кастрычніку склала Br958 тыс. 358

Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА у Нацыянальным статыстычным камітэце. Для параўнання: сёлета ў верасні гэты паказчык складаў Br942 тыс. 941.

Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у кастрычніку гэтага года склала Br975 тыс. 418 (яна ў верасні была Br960 тыс. 430).

Мінск лідзіруе сярод рэгіёнаў Беларусі па ўзроўні сярэдняй заработнай платы

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені-кастрычніку гэтага года склала Br867 тыс., у тым ліку ў кастрычніку — 958,4 тыс. Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка, сярэдняя зарплата ў кастрычніку павялічылася ў параўнанні з вераснем на Br15,4 тыс. (на 1,6 працэнта).

Сярод рэгіёнаў Беларусі па ўзроўні заработнай платы традыцыйна лідзіруе Мінск. У кастрычніку сярэдні заробак у сталіцы склаў Br1 млн 277,9 тыс., а самы нізкі гэты паказчык быў у Віцебскай вобласці (Br834,4 тыс.). На прамысловых прадпрыемствах сярэдняя заработная плата ў кастрычніку склала Br1 млн 104,1 тыс., у будаўнічых арганізацыях — Br1 млн 339,9 тыс., на прадпрыемствах транспарту — Br1 млн 138,4 тыс., у арганізацыях сельскай гаспадаркі — Br620,3 тыс., гандлі і грамадскага харчавання — Br828,3 тыс. Ва ўстановах аховы здароўя сярэдні кастрычніцкі заробак быў роўны Br699,4 тыс., у тым ліку ўрачоў — Br1 млн 200,5 тыс., сярэдняга медыцынскага персаналу — Br673,6 тыс., малодшага медыцынскага персаналу — Br419,4 тыс. Ва ўстановах адукацыі гэты паказчык быў Br623,1 тыс., у тым ліку педагагічных работнікаў — Br680,9 тыс., настаўнікаў — Br715,7 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — Br1 млн 365,8 тыс.

Рэальная налічаная заработная плата (заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені-кастрычніку 2008 года ў параўнанні са студзенем-кастрычнікам 2007 года павялічылася на 9,5 працэнта. Максімальны паказчык зафіксаваны ў Мінску (на 12,2 працэнта), мінімальны — у Магілёўскай вобласці (на 7,2 працэнта). Рэальная налічаная заработная плата за кастрычнік узрасла на 0,6 працэнта.

Што датычыцца галін эканомікі, то самыя высокія тэмпы росту рэальнай налічанай заработнай платы за студзень-кастрычнік 2008 года да аналагічнага мінулагодняга перыяду зафіксаваны на прадпрыемствах машынабудавання і металаапрацоўкі (117 працэнтаў), самыя нізкія — у сферы адукацыі (99 працэнтаў).

БЕЛТА.

Напярэдадні

Сяргей КРЫВЕЦ:

«Раней марыў згуляць супраць «Рэала», зараз — выйграць»

Сёння ўвечары на мінскім стадыёне «Дынама» адбудзецца матч пятага тура групавога раўнда Лігі чэмпіёнаў УЕФА паміж барысаўскім БАТЭ і мадрыдскім «Рэалам». Нагадаем, што беларускі клуб у групе Н з двума ачкамі займае апошняе, чацвёртае месца. Узначальвае турнірную табліцу італьянскі «Ювентус», які мае 10 ачкоў, іспанскі «Рэал», з шасцю ачкамі — другі, расійскі «Зенiт» (4 ачкі) — трэці. Напярэдадні матча галоўны трэнер барысаўскага клуба Віктар Ганчарэнка і паўабаронца каманды Сяргей Крывец сустрэліся з беларускімі журналістамі.

У прыватнасці, Віктар Ганчарэнка паведаміў, што падрыхтоўка да матча вядзецца ў штатным рэжыме, усе гульцы (акрамя траўмаванага ў матчы з «Зенітам» абаронцы Уладзіміра Ржэўскага, які выбыў да канца сезона) у добрай форме. У той жа час, зазначыў Віктар Ганчарэнка, «Рэал» знаходзіцца ў пэўным крызісе — каманда прайграла некалькі матчаў унутранага першынства і толькі ў суботу атрымала перамогу з мінімальным лікам над «Рэактывам». Акрамя таго, у камандзе шмат траўмаваных — выбылі са строю Руд ван Ністэлрой, Гансала Ігуаін, Фабіа Канавара. Галандскі футбаліст Уэслі Снайдэр таксама траўмаваўся, але Бернд Шустэр уключыў яго ў заяўку на мінскі матч. «Але клас «Рэала» дазваляе гэтай камандзе перамагаць нават тады, калі яе гульцы выходзяць на поле не ў аптымальным складзе. Лаўка запасных каралеўскага клуба дазваляе дастойна замяніць футбалістаў, якія выбылі», — заўважыў Віктар Ганчарэнка. «Але я не магу пазбавіцца ад думкі, што ўсё будзе добра», — растлумачыў трэнер свой прыўзняты настрой. «Калі ў дэбютным матчы для нас галоўным было адчуць атмасферу Лігі чэмпіёнаў, набрацца вопыту і паказаць дастойную гульню, то зараз хочацца перамагаць. Нават калі ёсць мінімальная магчымасць выйсці ў наступную стадыю турніру, трэба за яе чапляцца, інакш не ўдасца нічога дасягнуць ні ў футболе, ні ў жыцці. Зараз мы нашмат больш упэўненыя ў сабе, чым на старце турніру, дзе сустракаліся з «Рэалам» у Мадрыдзе. Мы зразумелі, што можам гуляць на такім узроўні і перамагаць», — падзяліўся сваімі думкамі Ганчарэнка.

Надвор'е, а ў дзень матча паводле прагнозаў чакаецца снег і да трох градусаў марозу (на раздзіме каралеўскага клуба зараз +14), не стане дадатковым плюсам ні для адной з камандаў, лічыць галоўны трэнер барысаўчан. «Не думаю, што зімовыя ўмовы маюць прынцыповае значэнне, у тым ліку і для сапернікаў. Наўрад ці для мадрыдскай каманды наша надвор'е стане сюрпрызам — яна гуляла ў гэты час ў Лізе чэмпіёнаў з камандамі былога СССР, у прыватнасці з маскоўскімі «Лакаматывам», «Спартаком». Галоўнае ў такіх умовах — правільна падабрась буцы», — заўважыў Віктар Ганчарэнка. Учора раніцай, дарэчы, поле і трыбуны стадыёна «Дынама» былі замецены снегам, які расчышчалі вайскоўцы. Газон дынамаўскай арэны абсталяваны сістэмай падагрэву, яна і будзе скарыстана.

Паўабаронца БАТЭ Сяргей Крывец расказаў, што раней яго марай было згуляць супраць аднаго з самых тытулаваных клубаў свету, цяпер жа, калі яна ажыццявілася, з'явілася жаданне перамагчы. «Будзем змагацца за кожны мяч і біцца да апошняга, чаго б нам гэта ні каштавала, пастараемся вырваць неабходную нам перамогу. Калі заб'ю гол, майкай ні з кім мяняцца не стану, падару яе бацькам. Гэта падзея, якая застанецца ў маёй памяці на ўсё жыццё», — расказаў футбаліст. Віктар Ганчарэнка дадаў, што хацеў бы, каб у Аляксандра Юрэвіча з'явілася нагода зайсці ў распранальню «Рэала» і падарыць сваю майку Раулю. Справа ў тым, што пасля першай сустрэчы з мадрыдскім клубам абаронца БАТЭ звярнуўся да «зоркі» каралеўскага клуба і папрасіў памяняцца майкамі. Рауль прапанаваў зрабіць гэта крыху пасля. Беларускі футбаліст вырашыў, што гэта дыпламатычная адмова, тым не менш, да здзіўлення ўсёй каманды, праз нейкі час у распранальні БАТЭ сапраўды з'явіўся Рауль і працягнуў майку Юрэвічу...

Крывец таксама паведаміў, што пасля матча з «Мінскам» 20 лістапада ў межах 1/8 фіналу Кубка Беларусі, дзе барысаўскаму клубу пасля першага паядынку, прайгранага з лікам 1:4, удалося адыграць чатыры мячы, надаў дадатковыя сілы камандзе. (У асноўны час барысаўчане выйгралі з лікам 4:1, дадатковы час прайшоў безвынікова, у серыі пенальці мацнейшымі аказаліся футбалісты БАТЭ.) «Нягледзячы на 120 хвілін складанай гульні, нервознасць падчас серыі пенальці, мы атрымалі станоўчыя эмоцыі напярэдадні паядынку з «Рэалам» і зразумелі, што ніколі нельга страчваць надзею, хоць многія паспелі спісаць нас з рахункаў у розыгрышы Кубка Беларусі», — падзяліўся паўабаронца. «Мы будзем прымаць «Рэал» дома і хочам атрымаць першую ў групавым раўндзе перамогу. Хочацца спадзявацца, што трыбуны нам у гэтым дапамогуць». Віктар Ганчарэнка таксама звярнуўся да балельшчыкаў з просьбай падтрымаць каманду нават у тыя моманты, калі ў яе не ўсё будзе атрымлівацца. «Падтрымка трыбун можа стаць тым фактарам, які падгоніць каманду. А халоднае надвор'е павінна прымусіць хварэць энергічней, каб не змерзнуць», — лічыць галоўны трэнер.

Паводле паведамленняў Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама, на матч чакаецца прыблiццё каля 400 іспанскіх балельшчыкаў. Учора ў 16 гадзін каля 60 прыхільнікаў «вяршковых» прыбылі ў Мінск чартарам разам з камандай. Яшчэ адзін чартар чакаецца сёння ў 16 гадзін. Частка балельшчыкаў прыбудзе ў беларускую сталіцу праз Маскву. Іспанскія фанаты размесцяцца ў 11-м сектары. Каля дзвюх тысяч балельшчыкаў БАТЭ прыбудзе ў Мінск электрычкамі з Барысава. Пропуск на стадыён пачнецца за дзве з паловай гадзіны да матча. Нягледзячы на надвор'е, людзі ў стане алкагольнага ап'янення на трыбуны не трапяць. «Сагравацца лепш з дапамогай адзення, а не спіртнога», — парэкамендавалі ў ГУУС Мінгарвыканкама.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

УП «Минский городской центр недвижимости»

ИНФОРМИРУЕТ

В извещении о проведении 28 ноября 2008 года 80-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 15 ноября 2008 г.), лоты № 10, 11, 24, 66 исключить.

Телефон для справок 227-40-22.

Грошы

РАСІЙСКІ РУБЕЛЬ — У ДВУХБАКОВЫХ РАЗЛІКАХ...

На пасяджэнні Міжбанкаўскага валютнага савета ў Маскве, якое прайшло 22 лістапада з удзелам старшынь праўлення цэнтрабанкаў Беларусі і Расіі Пятра Пракаповіча і Сяргея Ігнацьева, разгледжаны праекты пастаноў Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы і Пагаднення паміж дзвюма краінамі аб пашырэнні прымянення расійскага рубля ў разліках паміж суб'ектамі гаспадарання нашай рэспублікі і РФ.

Як адзначаюць ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка, на пасяджэнні вызначана задача аб максімальна магчымым выкарыстанні гэтай валюты ў двухбаковых разліках паміж Беларуссю і Расіяй. За студзень — верасень гэтага года доля выкарыстання расійскага рубля ў разліках паміж дзвюма краінамі складае каля 56 працэнтаў усяго аб'ёму гандлёвага абароту. Пры гэтым плацяжы расійскіх прадпрыемстваў за імпарт беларускай прадукцыі ў расійскіх рублях дасягнулі каля 89 працэнтаў, а беларускіх прадпрыемстваў за прадукцыю, што пастаўляецца з Расіі, — крыху больш за 44 працэнты.

Ігар ГРЫШЫН.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.11.2008 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
1 долар ЗША	2 151,00	Цэнтрабанк РФ	
1 еўра	2 707,57	USD	27,6613
1 латвійскі лат	3 818,23	10 UAH	34,9141
1 літоўскі літ	784,09	1000 BYR	12,9138
1 чэшская крона	105,17	EUR	41,5959
1 польскі злоты	696,08	Курс у гандлёвых кампаніях (на 24.11.2008 г.)	
1 расійскі рубель	77,76	USD	2135 / 2210
1 украінская грыўня	336,09		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МІНАБАРОНЫ І МЗС РАСІІ АБВЕРГЛІ ФАКТ АБСТРЭЛУ КАРТЭЖА КАЧЫНЬСКАГА І СААКАШВІЛІ

Прадстаўнік Мінабароны РФ абверг факт абстрэлу картэжа прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага і прэзідэнта Грузіі Міхаіла Саакашвілі, назваўшы паведамленні аб гэтым «не больш чым правакацыяй».

«Расійскія вайскоўцы, размешчаныя на тэрыторыі ваеннай базы ў Паўднёвай Асеціі, а таксама на блокпастах у гэтай рэспубліцы, ніякага агню, тым больш у бок грузінскай тэрыторыі, не адкрывалі», — заявіў прадстаўнік расійскага ваеннага ведамства. З абвяржэннем інфармацыі выступіў і МЗС Расіі. Як заявіў намеснік кіраўніка міністэрства Рыгор Карасін, «у чарговы раз грузінскім бокам жаданае было выдадзена за сапраўднае». Раней паведамленне аб абстрэле абверглі ў штабе расійскіх міратворцаў. Кіраўнік КДБ Паўднёвай Асеціі Барыс Аттоеў паведаміў, што інцыдэнт адбыўся побач з пагранічным пастом непадалёк ад сяла Масабруні. Паводле слоў Атоева, да паста пад'ехаў картэж Качыньскага і Саакашвілі, які складаўся прыблізна з 30 машын, аднак памежнікі адмовіліся яго прапусціць. «Некалькі машын усё-такі паспрабавалі прарвацца праз першую заслону, пасля чаго ім было зроблена паўторнае папярэджанне аб незаконнасці іх дзеянняў. Затым картэж развярнуўся і з'ехаў у бок Грузіі», — заявіў Атоеў, падкрэсліўшы, што стральбы памежнікі не адкрывалі. Нагадаем, першым аб абстрэле картэжа двух прэзідэнтаў у нядзелю днём паведаміў польскі тэлеканал TVN. Па інфармацыі тэлежурналістаў, картэж быў абстраляны з аўтаматаў, аднак у выніку інцыдэнту ніхто не пацярпеў. Пры гэтым прадстаўнік канцылярыі Качыньскага не змог сказаць, былі стрэлы зробленыя ў бок картэжа або ў паветра. Паводле сцвярджэння грузінскага боку, картэж прэзідэнтаў быў абстраляны расійскімі вайскоўцамі. Качыньскі пазней на сумесным брыфінгу з Саакашвілі заявіў толькі, што чуў рускую мову з боку, адкуль былі зробленыя стрэлы.

НА ВЫБАРАХ У ВЕНЕСУЭЛЕ ПЕРАМАГЛІ ПРЫХІЛЬНІКІ ЧАВЕСА

На рэгіянальных выбарах у Венесуэле, якія прайшлі ў нядзелю, пераканаўчую перамогу атрымала Адзіная сацыялістычная партыя, лідарам якой з'яўляецца прэзідэнт Уга Чавес.

Прыхільнікі Чавеса сталі губернатарамі 17 з 22 штатаў краіны. У той жа час кандыдаты ад апазіцыйных партый перамаглі ў асноўным нафтаздабыўным штаце Сулія, прамыслова развітым і найболей населеным штаце Міранда і Нуэва Спарта. Мэрам венесуэльскай сталіцы таксама абраны апазіцыйны лідар Антоніа Ледэсма. У адрозненне ад антыамерыканіста Уга Чавеса, апазіцыя выступае за развіццё супрацоўніцтва з Вашынгтонам, а не з Масквой. Пры гэтым мясцовыя ўлады карыстаюцца значнымі паўнамоцтвамі, якія дазваляюць ім уплываць на лёс стратэгічных інфраструктурных аб'ектаў.

МЭРЫ ЧЭШСКІХ ГАРАДОЎ ЗАКЛІКАЛІ АБАМУ АДМОВІЦЦА АД ПРА Ў ЕЎРОПЕ

Мэры 30 чэшскіх гарадоў падпісалі калектыўны ліст да абранага прэзідэнта ЗША Барака Абамы з заклікам адмовіцца ад размяшчэння элементаў амерыканскай ПРА ў Еўропе, паведамляе France Presse, у якога атрымалася азнаёміцца з тэкстам пісьма.

«Мы просім вас перагледзець стаўленне ўрада ЗША да пытання размяшчэння элементаў нацыянальнай сістэмы ракетнай абароны ў Еўропе і спыніць рэалізацыю гэтага небяспечнага праекта. Намер ЗША размясціць элементы ПРА ў самым цэнтры Еўропы ўжо прывёў да росту напружанасці ў адносінах ЗША і Расіі, а таксама ЗША і Еўрапейскага Саюза, і сваім вынікам будзе мець новую гонку ўзбраенняў», — гаворыцца ў лісце. Мэры, якія падпісалі пісьмо, таксама нагадалі, што дзве трэці насельніцтва Чэхіі выступаюць супраць размяшчэння элементаў ПРА на тэрыторыі краіны, а ўдзел Чэхіі ў амерыканскім праекце не ўваходзіць у праграму ні адной нацыянальнай палітычнай партыі.

Прэзідэнцкі аркестр павінен стаць стартавай пляцоўкай для з'яўлення новых зорак беларускай эстрады

Прэзідэнцкі аркестр Беларусі мае вялікі творчы патэнцыял, які неабходна ў бліжэйшы час раскрыць у поўнай меры. Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з калектывам аркестра.

Прэзідэнт лічыць, што аркестр павінен стаць стартавай пляцоўкай для з'яўлення новых зорак беларускай эстрады і новых песень.

На сцэне мінскага Палаца Рэспублікі адбылася творчая справаздача Прэзідэнцкага аркестра. У яго складзе сабраліся маладыя артысты — дыпламанты і лаўрэаты прэстыжных міжнародных конкурсаў, стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. На момант стварэння аркестра ў 2002 годзе сярэдні ўзрост калектыву быў 23 гады.

Звяртаючыся да калектыву, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў цэлым аркестр апраўдвае надзеі. «Вы сталі сапраўднай камандай аднадумцаў і прафесіяналаў. Культурнае жыццё Беларусі ўжо немагчыма ўявіць без Прэзідэнцкага аркестра, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але запомніце: першыя дасягненні — зусім не падстава для таго, каб спачываць на лаўрах або захварэць на зорную хваробу».

У час размовы Прэзідэнта з калектывам былі абмеркаваны як бліжэйшыя творчыя планы, так і праблемныя пытанні функцыянавання аркестра. У бліжэйшы час у складзе Прэзідэнцкага аркестра на конкурснай аснове будзе створана вакальная група. На думку кіраўніка дзяржавы, гэта пашырыць творчы дыяпазон аркестра, узбагаціць яго рэпертуар і яшчэ больш прыцягне таленавітую моладзь.

Нягледзячы на тое, што аркестр вядзе паўнацэннае творчае жыццё, дае канцэрты не толькі ў Мінску, але і ў розных рэгіёнах краіны, кіраўнік дзяржавы лічыць неабходным яшчэ больш пашыраць яго канцэртную дзейнасць, у тым ліку ўнутры рэспублікі. Неабходна таксама, на думку Аляксандра Лукашэнкі, набываць большую вядомасць за мяжой. Калектыў ужо сёння плённа супрацоўнічае з многімі вядомымі замежнымі выканаўцамі. Да аркестра пачалі праяўляць цікавасць зоркі сусветнай музыкі, такія як, напрыклад, Мішэль Легран і Дзмітрый Хварастоўскі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПРЭЗІДЭНТ НАК БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎДАСТОЕНЫ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ УЗНАГАРОДЫ ЕЎРАПЕЙСКАГА АЛІМПІЙСКАГА КАМІТЭТА

Еўрапейскі алімпійскі камітэт (ЕАК) узнагародзіў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта (НАК) Беларусі Аляксандра Лукашэнку спецыяльнай узнагародай «За выдатны ўклад у алімпійскі рух», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе НАК. Гэта рашэнне прэзідэнт ЕАК Патрык Хікі абвясціў на 39-й Генеральнай асамблеі ЕАК, якая праходзіла 21-22 лістапада ў Стамбуле. Як адзначыў Патрык Хікі, Беларусь у апошнія гады зрабіла вялікі прарыў у развіцці спорту і алімпійскага руху. Асабліва адзначана паспяховае выступленне беларускіх спартсменаў на Алімпіядзе-2008 у Пекіне (7-е месца сярод еўрапейскіх дзяржаў) і маштабнае будаўніцтва спартыўных аб'ектаў у краіне.

ХАКЕЙНАЯ КАМАНДА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ АБГУЛЯЛА Ў ВЕНЕ АМАТАРСКУЮ ДРУЖЫНУ АЎСТРЫІ 12:7

Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Паядынак адбыўся на «Альберт Шульц-Арэне» ў сталіцы Аўстрыі і стаў адным з этапаў падрыхтоўкі да пятага Міжнароднага калядняга турніру сярод аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
проводит открытый аукцион
по продаже обращенного в доход государства административного корпуса со встроенными гаражами (общ. пл. 941,7 кв.м), расположенного: г. Мядель, ул. Интернациональная, 17. Начальная цена снижена на 10 % и составляет 141 792 120 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.07.2008 г. Аукцион состоится 09.12.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.12.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.
Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by
КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

НАЗВАЛІСЯ РАБОТНІКАМІ ПАДАТКОВАЙ

У Аршанскі РАУС звярнуліся са сваёй бядой дзве пенсіянеркі — жыхаркі вёскі Сафіеўка, якіх падманулі махляркі. Яны расказалі міліцыянерам, што дзве незнаёмыя ім жанчыны каля чатырох гадзін дня прыйшлі да іх у хаты і адрэкамендаваліся работнікамі падатковай інспекцыі. Сказалі пра неабходнасць заплаціць нейкія падаткі. У выніку ў адной такім чынам узялі 128 тысяч беларускіх рублёў, у другой — 37 тысяч.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НА ДРОБЯЗІ НЕ РАЗМЕНЬВАЛІСЯ

Такога маштабнага крадзяжу ў сістэме закрытага акцыянернага таварыства «БЕСТ» не было да мінулага тыдня. Ён прынёс страты прадпрыемству амаль на Br 15 млн. Гэта з'явілася вынікам таго, што нехта ўзламаў антывандальны кантэйнер, што знаходзіўся на неахоўнай тэрыторыі рэтрансляцыйнай вышкі ў вёсцы Баец Буда-Кашалёўскага раёна, і ўкраў два прыборы ахоўна-пажарнай сігналізацыі, 4 пажарныя дымавыя апавяшчальнікі, абсталяванне сувязі сілкавання для ВТС-900М, стойку для батарэі, сістэму кандыцыянавання і ўводны размеркавальны шчыток.

На адной з новабудоўляў Гомеля вежавы кран застаўся без 43 метраў сілкавальнага кабелю. У тую ж ноч з базы адпачынку Рэчыцкага метызнага завода, якая знаходзіцца каля вёскі Горваль, нехта сцібрыў халадзільнік, набор мэблі і пластыкавую лодку. У невядомым напрамку знікла і металічная агароджа задзвіжкі высокага ціску газаправоду, што знаходзіцца недалёка ад вёскі Вошчанкі Буда-Кашалёўскага раёна.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
проводит открытый аукцион
по продаже здания ателье № 5, об. пл. 155,0 кв.м, расположенное: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Площадь зем. уч. 0,0595 га. Начальная цена снижена на 35 % и составляет с НДС — 52 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.02.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 02.12.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 01.12.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к.326.
Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by
КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ЦУД ПАД НАЗВАЙ КІНО

Гэтага трэба было чакаць: калі фільм Гаварухіна ў праграме, то ў яго на фестывалі асабліва роля. Альбо адкрываць яго па-за конкурсам, альбо закрываць — як пераможцы конкурсу. Але сёлета арганізатары здзівілі тым, што фільм-пераможцу не паказалі пасля ўрачыстасцяў. Парушылі традыцыю. Але нейкая рацыя ў гэтым ёсць: каб скласці ўражанні пра фестываль, мала паглядзець толькі адзін фільм. Асабліва сёлета, калі такія выдатныя карціны былі паказаны ў Мінску. Шмат якія з іх ужо былі адзначаны прызамі на міжнародных кінафорумах. Вось толькі ў **«Пасажыркі» Станіслава Гаварухіна** гэта першы міжнародны поспех і глядацкае **«золата» ў Мінску.** Я лічу — вельмі значнае. Таму што ў барацьбе за прыязнасць гледача ён абышоў цудоўны **румынскі фільм «Мары пра Каліфорнію»,** які быў летась адзначаны ў Канах. У маленькай Румыніі, якая дагэтуль гучна не заяўляла пра сябе з кінаэкрана, з'явіўся фільм шматслойны, дзе шэраг вострых і цікавых тэмаў заплятаюцца ў вузел, дзе камізм сітуацый перакрываецца драмай жыцця. Драма жыцця прыпыніла і працу над мантажом гэтага фільма маладога рэжысёра Крысцяна Нямеску. Але фільм жыве сваім жыццём і атрымлівае ўзнагароды, напрыклад, **«срэбра» «Лістапада».** І сапраўдным цудам сярод такой канкурэнцыі можна лічыць **трэцяе месца беларускай стужкі Івана Паўлава «На спіне ў чорнага ката»**. Тыя, хто яе бачыў, ведаюць, што ў фільме ёсць свае чараўнікі. А што калі яны сапраўды існуюць і спрыяюць не толькі героям, але ўсім, хто меў дачыненне да гэтай фантастычнай гісторыі? Ды яшчэ ў родных сценах... У такім суквецці кінашэдэўраў атрымаць «бронзу» — фантастычны поспех айчыннага кіно. З ласкі роднага гледача.

Пра будучыню айчыннага кіно гаварылі сёлета шмат. Народная артыстка Расіі Святлана Дружынін, якая ўзначальвала прафесійнае журы, адзначыла: «Думаю, што наперадзе адраджэнне вашай кінастудыі. Адчуваюцца некаторыя праблемы, адна з галоўных у тым, што вам патрэбны маладыя кадры. Гэта вялікая зямля, тут шмат прыгожай натуры — здымай і здымай кіно. І яно павінна быць».

Ёсць жа ў нас кінафестываль, які не падобны больш ні на адзін у свеце: столькі відаў кінамастацтва адразу спаборнічае ў конкурсах. Старшыня журы прызналася: «Гэта цудоўны і значны фестываль. Я шмат бачыла фестываляў у розных краінах. Але гэты ўражвае размахам і любоўю да кіно». Шмат якія карціны ўжо былі адзначаны на розных фестывалях і гэта стварала некаторыя складанасці ў працы журы. Цяжка было выбіраць лепшую — амаль усе фільмы, на думку Святланы Сяргееўны, вартыя ўвагі.

Але на тое і існуюць кінафестывалі — каб прафесійнае журы патлумачыла гледачу, што такое добрае кіно, і якое кіно трэба лічыць мастацтвам. Мастацтва — гэта **«Маўклівае святло».** Так называецца фільм мексіканскага рэжысёра Карласа Рэйгадаса. Да ведама — леташні пераможца ў Канах. За што прафесіяналы кіно адзначаюць такія фільмы — не толькі ў Канах? І прыз **«За лепшую рэжысуру» на «Лістападзе»** патрэбны не столькі самому гэтаму фільму, колькі нам — каб засведчыць, што ў Беларусі цэняць і любяць сапраўднае кіно. Тым больш, што гэта нават не кіно, а сапраўдны цуд. Цуд мастацкі і цуд мастацтва.

«Карціна дае адказы на шмат якія пытанні», — адзначыла Святлана Дружыніна. Нязвыклы для сучаснага рытму марудны расповед пра любоўны трохкутнік. Але менавіта дзякуючы гэтай запаволенасці ты нібыта сочыш за натуральным жыццём суполкі нямецкіх вернікаў у Мексіцы і паступова ўцягваешся, сам становішся часткай іх свету. Замілавана назіраеш за сямю дзеткамі, якія растуць у сям'і, адчуваеш, як тата з мамай адчайна імкнуцца склеіць адносіны. І разумееш, што каханка — зусім не бессаромная сцерва, а вельмі адзінокая жанчына, не прыгажуня і не шалава. І разумееш, што яна таксама пакутуе. І герой ведае ўсе Боскія законы, але ніяк не можа ўтаймаваць сваё сэрца. Здараецца нечаканае — жонка героя раптоўна памірае. Яе рыхтуюць да пахавання. І калі абмываюць ногі, стрыгуць пазногці, чэшуць валасы, хочацца крычаць, таму што седзячы ў зале, ты адчуваеш сапраўдны смутак, нібыта ўсё адбываецца насамрэч. Трохкутнік быццам бы разбураны. Але героі раскайваюцца настолькі моцна, што гавораць пра тое, як бы ўсё хацелася павярнуць назад і змяніць. У жыцці немагчыма ўсё павярнуць, гаворыць яна. І ідзе развітацца з нябожчыцай. Схіляецца, каб пацалаваць яе. І на безжыццёвым твары застаецца сляза. Яна коціцца па шчацэ так, нібыта плача сама нябожчыца. А потым ты адчуваеш: яна сапраўды плача. Уздых прайшоў па яе шыі, дрыгнулі павекі. І яна прачнулася. Усё вярнуць назад можа толькі цуд пад назвай кіно. Яно можа нават ажывіць чалавека!

Безумоўна, такія фільмы нельга вымяраць галасамі гледачоў. Яны не з разраду забавы, якая дазваляе неяк запоўніць час. Але менавіта яны нагадваюць, што кіно — гэта не пэўная колькасць кадраў у хвіліну, а сутнасць і напаўненне гэтых кадраў. Журы адзначыла менавіта тыя фільмы, якія вылучаліся сваёй напоўненасцю. Згаданыя вышэй **«Мары пра Каліфорнію»** адзначаны — **за лепшае выкананне мужчынскай ролі** атрымае **прыз акцёр Разван Васілеску. Жаночая роля,** на думку журы, была выдатна сыграная актрысай **Барбарай Сараф'ян у бельгійскай карціне «Масква, Бельгія».** Рэжысёру Крыстофу Ван Рампаю ўдалося раскрыць свет сучаснай жанчыны, якая ўжо не маладая, засталася з трыма дзецьмі, калі муж сышоў да палюбоўніцы. І нічога светлага няма на яе гарызонце, ні пра што яна не марыць акрамя таго, як пражыць кожны новы дзень, нават супраціўляецца пачуццям, якія нечакана ўзварухнулі душу. І аказалася, што жыць вельмі-вельмі хочацца.

Чалавечае кіно, якое распавядае пра звычайныя рэчы, прыкмячае дэталі, эпізоды, моманты, дзе праяўляецца якраз-такі душа — яе боль, пакуты і памкненні — сёння ствараецца ў самых розных краінах. Менавіта за такі фільм сёлета паедзе прыз у Польшчу. Рэжысёр карціны **«Запаведнік» Лукаш Палкоўскі** адзначаны **«За лепшы дэбют»** спецыяльным дыпломам імя Віктара Турава. Прыз **«За аператарскую працу»** імя Юрыя Марухіна атрымае **Радаслаў Уладзіч** з Сербіі за працу ў стужцы **«Апошні вальс у Сараеве».**

Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА.

І прафесіяналы, і журы кінапрэсы адзначылі і іншыя фільмы, якія ўздымаюць няпростыя пытанні чалавечага існавання. Такі, напрыклад, брытанскі фільм **«Кантроль»** ці нарвежскі **«О'хортэн».** Апошнюю карціну журы кінапрэсы адзначыла прызам, які мае асаблівую назву: **«Фільм як з'ява ў кінамастацтве».** Вельмі проста, але змястоўна распавядаецца ў стужцы пра набліжэнне старасці, якая можа стаць прыстанкам адзіноты, а можа аказацца часам ажыццяўлення тых учынкаў, пра якія дагэтуль баяўся нават думаць.

Такія фільмы — простыя, але зробленыя з душой — знаходзяць свайго гледача. І менавіта такія фільмы здольныя мяняць чалавека, узбудзіць яго душу. Гэта як асноўная прыкмета мастацтва.

А што такое тады тэлекіно? На гэтую тэму на «Лістападзе» разгарэлася нават дыскусія падчас «круглага стала».

Сумесны расійска-беларускі тэлефільм «У чэрвені 41-га» якраз прадставіў героя-памежніка, які адзін умудраецца змагацца з наступаючай фашысцкай машынай. Аднак галоўны прыз конкурсу тэлевізійнага кіно гэтая стужка не атрымала. Журы тэлевізійнага конкурсу лепшым прызнала фільм **расійска-ўкраінскі «Шчаслівай дарогі»** рэжысёра Аляксандра Баршака. Але надзеі «Беларусьфільма» апраўдаліся ўсё-такі ў тым, што прызы за выкананне лепшай жаночай ролі атрымала **Маша Возба** за працу ў тэлефільме **«Рыфмуецца з любоўю»,** а **Расіслава Янкоўскага** паставілі вышэй за Сяргея Бязрука-ва ў стужцы **«У чэрвені 41-га».** Зрэшты, рэжысёр гэтага фільма **Аляксандр Франскевіч** забраў адмысловую ўзнагароду «Лістапада» — **Прыз Прэзідэнта Беларусі «За гуманізм і духоўнасць у кіно».**

Віцэ-прэм'ер урада Беларусі Аляксандр Косінец, які ўручаў гэты прыз, сказаў: «Не буду хаваць сваёй радасці, што менавіта гэтая стужка адзначаецца прызам Прэзідэнта. Мы напярэдадні вялікага свята — 65-годдзя Перамогі, якое будзем святкаваць у 2010 годзе. Хачу падзякаваць арганізатарам, якія ладзілі гэтае вялікае свята кіно: больш за 200 тысяч гледачоў паглядзелі лепшыя фільмы ў 65 кінатэатрах краіны».

Ларыса ЦІМОШЫК.

Грамадзянін Беларусі спрабаваў перасячы мяжу на надзіманым матрацы

Пры сабе ён меў 2 мабільныя тэлефоны, крыху польскай валюты і помпу для надзімання матраца. У Дзяржпагранкамітэце адзначылі, што беларускім грамадзянам, нават калі ў іх няма дакументаў, для вяртання на радзіму няма неабходнасці парушаць мяжу. «Беларусы заўсёды будуць прынятыя на радзіме. Памежнікі не маюць права іх не прыняць», — заявіў начальнік прэс-цэнтра.

Кар. БЕЛТА.

РАБОЧАГА ЗАВАЛІЛА ЦЭГЛАЙ

У суботу а палове другой дня ў вёсцы Плебанцы Мінскага раёна абрынулася воданапорная вежа: пацярпеў адзін чалавек.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар МНС Віталь Навіцкі, здарэнне адбылося падчас дэмантажу дзесяціметровай вежы, якая была пабудавана ў 1958 годзе.

Ігар ГРЫШЫН.

МІЛІЦЫЯНЕРЫ ЛЕПЕЛЬСКАГА РАУС ВЫРАТАВАЛІ 5-ГАДОВУЮ ДЗЯЎЧЫНКУ, ЯКАЯ ТАНУЛА Ў САЖАЛЦЫ

Сведкай здарэння стаў начальнік мясцовага аддзялення ДАІ Аляксандр Трусаў, які не раздумваючы кінуўся ратаваць дзіця.

На дапамогу яму падаспеў дазнавалец аддзялення папярэдняга расследавання Дзмітрый Каралёў, які праходзіў міма. Мужчынам удалося выратаваць дзіця, якое ўжо ішло пад ваду. Калегі выратавальнікаў даставілі дзяўчынку ў бальніцу.

БЕЛТА.

Абзац

■ Перабоі з забеспячэннем электрычнасцю з-за снегападу на мінулыя выхадныя зафіксаваны ў 7117 населеных пунктах Беларусі. Адбылося гэта з-за наліпання мокрага снегу на правады ліній электраперадач і іх абрыву. Часова былі абясточаныя 494 трансфарматарныя падстанцыі. К вечару нядзелі падача электрычнасці была паўсюдна адноўленая. Адключэнні адбыліся ў Мінскай, Магілёўскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях.

■ **У расійскай сталіцы ў нядзелю быў пабіты тэмпературны рэкорд, які пратрымаўся 85 гадоў, — паветра ў гэты дзень прагрэлася да 10 градусаў цяпла. Пратрымалася такое надвор'е ўсяго некалькі гадзін — ужо ўвечары тэрмометр паказваў нуль.**

■ Сёлета за 10 месяцаў у Гомельскай вобласці за ваджэнне аўтамабіля ў нецвярозым стане звольнена 15 супрацоўнікаў міліцыі. Апошняга п'янага міліцыянера ў чыне прапаршчыка затрымалі 16 лістапада. За кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане ўсе работнікі праваахоўных структур, па сведчаннях ДАІ, у абавязковым парадку звальняюцца.

■ **Пенсіянерка з Бешанковіцкага раёна больш чым паўвека пражыла на складзе боепрыпасаў. Небяспечны «клад» у выглядзе 43 мінамётных мін часоў Вялікай Айчыннай вайны былі знойдзеныя бабуляй 1939 г.н. і яе роднымі пры правядзенні рамонту веранды дома, пабудаванага ў пасляваенныя гады. Боепрыпасы вывезеныя ў бяспечнае месца і ўзарваныя.**

■ Дзвюх расіянак, што заблудзіліся ў лесе, выратавалі ў Докшыцкім раёне. Жанчыны 1939 і 1949 гадоў нараджэння з горада Мыцішчы Маскоўскай вобласці адпачывалі ў мясцовым санаторыі «Лясное». Падчас пасляабедзеннай прагулкі, не разлічыўшы сваіх магчымасцяў, пенсіянеркі заблудзіліся ў лесе. Іх выратавальнікам стаў мабільны тэлефон. Набраўшы нумар 101, жанчыны паклікалі на дапамогу. Арганізаваная пошукавая група ў складзе 33 чалавек і 6 адзінак тэхнікі была адпраўленая на пошукі. Іх знайшлі праз некалькі гадзін, здароўе падарожніц не пацярпела.

■ **У Мінску ў перыяд з 19 па 23 лістапада галалёдныя траўмы атрымалі 155 чалавек. Спачатку назіраўся рост траўматызму — 118 пацярпелых з серады да пятніцы, з якіх каля паловы атрымалі пераломы рознай ступені цяжкасці. Да выхадных камунальныя службы мінімізавалі наступствы снегападу, і сітуацыя стабілізавалася. У суботу было 17 галалёдных траўмаў, у нядзелю — 20.**

Поўны абзац

■ У Маскве здзейснены разбойны напад на морг гарадской клінічнай бальніцы. Сігнал у міліцыю паступіў каля 23.30, вартаўнік морга патлумачыў, што каля 10 гадзін вечара ў дзверы пазванілі невядомыя і сказалі, што прывезлі труны. Пасля таго як вартаўнік адчыніў дзверы, зайшлі чацвёра ў масках з пісталетамі і звязалі яго скотчам. Пасля гэтага злачынцы ўзламалі сэйф залы рытуальных паслуг, забралі адтуль усю наяўнасць і зніклі.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЛЕТНЯЯ ГУМА Ў СНЕГАПАД?

У сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я ў Магілёўскай вобласці ўтрая павялічылася колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх, як правіла, не церпяць людзі, але аўтамабілі атрымліваюць механічныя пашкоджанні. У выхадныя дні колькасць такіх здарэнняў даходзіла да 40 за суткі. Інспектары адзначаюць, што яшчэ далёка не ўсе аўтаўладальнікі перайшлі на зімовую гуму. Напрыклад, 22 лістапада на тэрыторыі Мінскай вобласці адбылося здарэнне з маршрутным таксі з Магілёва. Маршрутка легла на бок, і з 10 пасажыраў пацярпелі 4. Адна з акалічнасцяў аварыі: у снегапад мікраўтобус адправіўся ў рэйс на летняй гуме.

Алена КАЗЛОВА.

«ШАРСЦІЛІ» БАНКАМАТЫ

Крымінальны «квартэт», у які ўваходзілі двое грамадзян Турцыі і двое — Грузіі, затрыманы ў Мінску.

Аперацыю па іх затрыманні правялі супрацоўнікі ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС і УДАІ ГУУС. А падазраюцца яны ў тым, што з дапамогай падробленых банкаўскіх картак выкрадалі грошы з банкаматаў. У прывятнасці, як мяркуецца, махляры зрабілі «набег» на банкаматы ў Гродне і беларускай сталіцы. У аўтамабілі «Вольва», дзе іх і ўзялі праваахоўнікі, было знойдзена і канфіскавана 40 падробленых банкаўскіх картак.

Ігар ГРЫШЫН.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Михановичского посисполкома Минского района

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Минском районе:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Кайково, 623684202601000203	0,2320 га	сети электро-, газоснабжения	598 131	43 808 653	4 300 000
2	д. Кайково, 623684202601000202	0,2292 га		598 131	43 280 928	
3	д. Чуриловичи, 623684206601000196	0,1498 га	вблизи сети электроснабжения	598 131	21 211 680	2 100 000
4	п. Михановичи, 623684204601001203	0,2372 га	сети электро-, газо-, водоснабжения	611 046	20 263 996	2 000 000

Примечание: *Лоты №№ 1, 2 имеют ограничения в использовании земель на площади 0,0182 га, 0,0320 га соответственно (охранная зона систем газоснабжения); Лот № 4 – на площади 0,0120 га (охранная зона линии электропередачи напр. до 1000 вольт).*

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«26» декабря 2008 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион

по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Воложинского района, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для его обслуживания, составляющих единые предметы аукциона

На аукционные торги выставляются:

№ лота	Наименование недвижимого имущества	Характеристика недвижимого имущества	Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка для участия в аукционе, рублей	Продавец недвижимого имущества
1	Здание базовой школы (инв. № 632/С-17668), с сараем, уборной и колодцем, расположенные по адресу: Минская обл., Воложинский район, Ивенецкий с/с, д. Шикути	Здание школы 1938 года постройки, одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки бревенчатые, перекрытие деревянное утепленное, крыша 2-скатная металлическая, полы дощатые, отопление печное, вентиляция естественная, имеется электроснабжение. Общая площадь 335,6 кв.м. Территория огорожена забором деревянно-решетчатым на бетонных столбах	Площадь 0,8204 га. Срок аренды земельного участка 99 лет. Имеется ограничение в использовании в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Волма	**66 906 623** (в том числе недвижимое имущество – 66 479 773, право заключения договора аренды земельного участка – 426 850)	6 000 000	Ивенецкий сельский исполнительный комитет, расположенный по адресу: Минская область, Воложинский район, г.п. Ивенец, ул. 1 Мая, 13 тел. (801772) 53388
2	Здание базовой школы № 1 (инв. № 632/С-19128), здание базовой школы № 2 (инв. № 632/С-19129), здание сарая (инв. № 632/С-19130), расположенные по адресу: Минская обл., Воложинский район, Ивенецкий с/с, д. Родники	Здание базовой школы № 1 1917 года постройки, одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки бревенчатые, частично блочные, перегородки бревенчатые, дощатые, перекрытие деревянное утепленное, крыша 2-скатная шиферная, полы частично дощатые. Инженерные коммуникации отсутствуют. Общая площадь 173,9 кв.м. Здание базовой школы № 2 1917 года постройки, одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки бревенчатые, перекрытие деревянное утепленное, крыша 2-скатная шиферная, полы 1/2 дощатые. Инженерные коммуникации отсутствуют. Общая площадь 44,8 кв.м. Здание сарая 1917 года постройки, одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки бревенчатые, перекрытие деревянное утепленное, крыша 2-скатная дранка. Общая площадь 56,8 кв.м	Площадь 0,8385 га. Срок аренды земельного участка 99 лет	**19 576 187** (в том числе недвижимое имущество – 19 139 917, право заключения договора аренды земельного участка – 436 270)	1 500 000	
3	Здание больницы (инв. № 632/С-1461), расположенное по адресу: Минская обл., Воложинский район, Вишневский с/с, д. Вишнево	1963 года постройки, одноэтажное, фундамент бутобетонный, ленточный, стены бревенчатые, облицованные кирпичом, перегородки кирпичные, дощатые, перекрытие дощатые, железобетонные, крыша шиферная по наклонным стропилам, полы дощатые, линолеум, керамические, отопление центральное, водопровод – металлические трубы, канализация – чугунные трубы, вентиляция естественная, имеется электроснабжение. Общая площадь 632,2 кв.м. Также имеются 2 пристройки и 2 веранды	Площадь 0,2622 га. Срок аренды земельного участка 99 лет	**163 668 411** (в том числе недвижимое имущество – 163 531 991, право заключения договора аренды земельного участка – 136 420)	15 000 000	Учреждение здравоохранения «Воложинская центральная районная больница», расположенное по адресу: Минская область, г. Воложин, ул. М. Горького, 13, тел. (801772) 58704
4	Здание прачечной (инв. № 632/С-1463), расположенное по адресу: Минская обл., Воложинский район, Вишневский с/с, д. Вишнево	1962 года постройки, одноэтажное, фундамент бетонный ленточный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия — ДВП по деревянным балкам, крыша шиферная по наклонным стропилам, полы керамические, бетонные, отопление центральное, водопровод – металлические трубы, канализация – чугунные трубы, вентиляция естественная, имеется электроснабжение. Общая площадь 70,5 кв.м. Также имеются пристройка и тамбур	Площадь 0,0480 га. Срок аренды земельного участка 99 лет	**14 740 438** (в том числе недвижимое имущество – 14 715 468, право заключения договора аренды земельного участка – 24 970)	1 000 000	
5	Здание кухни (инв. № 632/С-1464), расположенное по адресу: Минская обл., Воложинский район, Вишневский с/с, д. - Вишнево	1972 года постройки, одноэтажное, фундамент бутобетонный ленточный, стены бревенчатые, облицованные кирпичом, перегородки дощатые, перекрытия – ДВП по деревянным балкам, крыша шиферная по наклонным стропилам, полы керамические, отопление центральное, водопровод – металлические трубы в коробах, канализация – чугунные трубы, вентиляция естественная, имеется электроснабжение. Общая площадь 122,4 кв.м. Также имеются пристройка и веранда	Площадь 0,0935 га. Срок аренды земельного участка 99 лет	**10 904 072** (в том числе недвижимое имущество – 10 855 422, право заключения договора аренды земельного участка – 48 650)	1 000 000	

Земельные участки отведены для обслуживания и эксплуатации недвижимого имущества.

Арендодатель земельных участков: Воложинский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заявление на участие в аукционе, заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон, по формам, утвержденным постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов»;

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

Воложинский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

2. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 30 декабря 2008 года.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

**Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел.: 224 57 09, 500 47 10. Последний день под

Ну і ну!

Маладая жанчына пацярпела ад сабак

Уначы 21 лістапада бабруйчанін вяртаўся дадому праз прыватны сектар з позняй працоўнай змены, калі сустрэў зграю брахлівых сабак. Адагнаўшы іх, мужчына пачуў крыкі аб дапамозе: непадалёк на зямлі ляжала жанчына. У разадраным адзенні, са шматлікімі пакусамі рук, тулава і твару 20-гадовая бабруйчанка была шпіталізаваная ў рэанімацыю Бабруйскай бальніцы хуткай дапамогі.

Як паведаміла старшы інспектар групы інфармавання УУС Бабруйскага гарвыканкама Таццяна Гарбанюк, пацярпелай зрабілі аперацыю, і медыкі цяпер ацэньваюць яе стан як стабільна цяжкі. Жанчына пакуль не можа размаўляць, таму ўсе падрабязнасці начнога здарэння яшчэ не высветленыя. Аднак разам з тым у міліцыі ўпэўненыя, што адпаведныя службы павінны своечасова прымаць меры па адлове бяздомных сабак, якія могуць быць небяспечнымі для людзей.

Алена КАЗЛОВА.

УПУСЦІЛІ «ГОСЦЯ» Ў КВАТЭРУ

У адну з кватэр па вул. Куйбышава ў Брэсце позна вечарам зайшоў знаёмы, які ўжо пабываў у турме за разбой і рабаванне. Госць, жыхар в. Мікалаева Камянецкага раёна, пасля сумеснай выпіўкі задушыў 52-гадовую гаспадыню і яе 17-гадовую дачку. Узбуджана крымінальная справа.

Ул. інф.

СХАПІЎ НАЖНІЦЫ І...

У в. Малыя Сахновічы Жабінкаўскага раёна загарэлася хата. Падчас тушэння пажару знайшлі труп 29-гадовай жыхаркі Жабінкі. Следства ўстанавіла, што забойства нажніцамі ўчыніў 22-гадовы бязногі інвалід, які быў п'яны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АВАРЫЯ З УДЗЕЛАМ ТРОХ МАШЫН

На аўтадарозе Віцебск — Гомель — мяжа Украіны ля вёскі Шчытоўка Сенненскага раёна «Шкода-Актавія», якой кіраваў 26-гадовы жыхар Оршы, урэзалася ў «Фольксваген» і «Форд-Транзіт», што ехалі па паласе сустрэчнага руху. У выніку гэтага сутыкнення чатыры пасажыры «Шкоды» і «Форда» (па два ў кожнай легкавушцы) былі траўмаваныя і шпіталізаваныя ў Віцебскую абласную клінічную бальніцу. Устаноўлена прычына аварыі — кіроўца «Шкоды» не справіўся з кіраваннем.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Постаці

«Я ТУТ — СВАЯ І БОЛЕЙ АНІЧОГА...»

На Піншчыне адсвяткавалі юбілей Яўгеніі Янішчыц

На радзіме любяць і шануюць паэтэсу. У Рудцы, Мерчыцах, Парэчы, Велясніцы жыве нямала людзей, якія ведаюць Яўгенію, вучыліся з ёю, вучылі яе, хадзілі аднымі сцежкамі. Тут гавораць: «Наша Жэня». І пачуццё гэта ўзаемнае. Яе прызнанне ў любові землякам засталося ў многіх і многіх вершах.

А памяць пра Жэню жыве найперш у школе, якую скончыла паэтка. Настаўніца роднай мовы і літаратуры Антаніна Сідарук са сваімі вучнямі, калегамі восем гадоў шчыравала над стварэннем музея. Музей адчынілі дзесяцігоддзе таму, напярэдні юбілею. А цяпер настаўнікі і вучні Парэцкай школы не без гонару адзначаюць, што музей за гэты час наведалі больш за дзесяць тысяч чалавек. І вось напярэдадні 60-годдзя паэтэсы прыйшла чаканая вестка: школе прысвоена імя знакамітай зямлячкі. Школа гэтага заслужыла. Тут вельмі беражліва захоўваюць памяць. У кожным класе ўрокі літаратуры пачынаюцца з яе творчасці. Асаблівым гонарам лічыцца прыходзіць на заняткі ў той клас, дзе некалі вучылася Жэня. І многія вучні — землякі Яўгеніі Янішчыц, пішуць вершы, прозу, спрабуюць сябе ў даследчыцкай працы. Яны нібы цягнуцца за духам слыннай паэткі, адчуваюць яго. Ды і не толькі пра дзяцей гэта можна сказаць. У Велясніцкім доме культуры на вечарыне з нагоды 60-годдзя Яўгеніі сталыя жанчыны слухалі яе вершы з вачамі, поўнымі слёз.

А на наступны дзень пінская грамадскасць сабралася ў Палескім драматычным тэатры на мерапрыемства, якое арганізатары назвалі радком паэтэсы «Каб застацца ў нязменнай любові к табе». Зноў гучалі вершы, шчымліва-пранікнёныя, трапятліва-пяшчотныя, і такія знаёмыя, нават калі чуеш іх першы раз. Пра Жэню згадвалі кіраўнікі вобласці і раёна, мінскія літаратары, навукоўцы. Гасцямі імпрэзы былі брэсцкія паэты, пісьменнікі, Ніна Мацяш, сын Яўгеніі Янішчыц Андрэй.

Спецыяльна да свята было прымеркавана ўручэнне абласной літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка. Прэмія заснавана Брэсцкім аблвыканкамам летась. Сёлета яе атрымлівалі другі раз. Старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар адзначыў падчас цырымоніі: «Творчы чалавек, які аддае свой талент краіне, будзе мець спрыянне з боку дзяржавы». Званне лаўрэата прэміі сёлета было прысуджана Алесю Каско, Міколу Пракаповічу, Міхасю Рудкоўскаму за паэтычны зборнік «Трохперсце», Зінаідзе Дудзюк за кнігу-даследаванне беларускай міфалогіі «Кола Сварога», Васілю Ласковічу за дакументальную аповесць пра вайну «Водгук далёкай навальніцы» і Расціславу Бензеруку за кнігу казак «Зайцаў кажушок». Была ўзнагароджана таксама група пачаткоўцаў — юных паэтаў, празаікаў, даследчыкаў, якія ўдзельнічалі ў конкурсе, прымеркаваным да юбілею Янішчыц.

Ізноў гучалі вершы віноўніцы ўрачыстасці. **Губернатар, напрыклад, пачаў сваю прамову з таго, што адрасаваў прысутных да чацвяргоўскага нумара «Звязды», у якім апублікаваны, на яго погляд, самы шчыры, узнёслы, запамінальны верш «Ты пакліч мяне. Пазаві».** Усе радкі былі ў той дзень да месца. Яна глядзела на нас з вялікага партрэта і нібыта сама ціха гаварыла:

Суцішыцца ў роздуме дарога,
Што памятае маладосць і тлен.
Я тут — свая і болей анічога
Не трэба мне да скону узамен.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Незалежная экспертыза Леаніда ЗАІКІ

СПАЖЫВЕЦКІ РЫНАК — АДБІТАК НАШАЙ ПСІХАЛОГІІ

Фота Пятра ФАМІНА.

Мы не заўважылі, як сталі жыць па правілах грамадства масавага спажывання. Плюсы і мінусы гэтай з'явы сёння ў цэнтры ўвагі вядомага беларускага эканаміста і даследчыка, старшыні Савета аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Л.Ф. Заікі.

— Складваецца ўражанне, што апошнім часам нашых людзей ахапіла спажывецкая ліхаманка. Паўсюдна толькі і чуваць: мы набылі новую дарагую іншамарку, а што ў вас? У нас хатні кінатэатр, а ў вас? І так з усіх бакоў: узялі крэдыт на кватэру, робім еўрарамонт, мадэрнізацыю дачы з пабудовай лазні і печы для барбекю і г.д. І амаль не гавораць аб навінках літаратуры, мастацтва, тэатральных прэм'ерах, музейных выставах, іншых вартых увагі падзеях. Усе нематэрыяльныя каштоўнасці, чым мы так некалі ганарыліся, паступова выціскае спажывецкі дух. Толькі тавары і грошы, грошы і тавары. Куды мы заблукалі?

— Не трэба так ужо змрочна глядзець на рэаліі жыцця. Так, большасць людзей кінуліся ўвасабляць у канкрэтныя рэчы свае матэрыяльныя мары і не варта перашкаджаць ім у гэтым. Нічога не атрымаецца. Майце на ўвазе, што наша краіна ўступіла ў новую фазу развіцця — грамадства масавага спажывання. Яе трэба прайсці і перажыць. Спажывецкі рынак — гэта ў пэўнай ступені люстэрка нашай псіхалогіі, таму і размовы вакол адпаведныя.

Можна доўга спрачацца аб тым, што рухае чалавецтвам: грошы ці тавары. Толькі навошта? Увогуле з сярэдзіны мінулага стагоддзя рынкавая эканоміка ператварылася ў грашовую эканоміку. Грошы пачалі ўсё вырашаць. Не тавары даюць грошы, а грошы ствараюць тавары, фарміруюць псіхалогію людзей. Грошы сталі ўсеагульнай формай руху глабальнай эканомікі. Гэта цяпер, але не факт, што так будзе далей. У будучым рынкавая эканоміка трансфармуецца ў лічбавую. Электронныя грошы створаць свае катэгорыі, нормы і псіхалогію іх карыстальнікаў. Ці інакш кажучы, узнікнуць новыя парадыгмы эканомікі і грамадства.

— Да гэтых парадыгмаў трэба яшчэ дажыць, а таму давайце вернемся ў дзень сённяшні. Якія факты і паказчыкі сведчаць аб нашым пераходзе да грамадства масавага спажывання?

— Галоўная прыкмета — мы дасягнулі ўзроўню 4500 амерыканскіх доларaў валавога ўнутранага прадукту (ВУП) на душу насельніцтва. Гэта важны паказчык. Мы сталі эканамічнай супольнасцю з вельмі высокім тэмпам росту даходаў у 15 працэнтаў, што вышэй за паказчык дынамікі ВУП. У снежні мінулага года сярэдняя зарплата складала 795 тысяч рублёў, ці 369 доларaў. Хоць урад планаваў толькі 340 доларaў. Праўда, гэта лічба адпавядала 73,8 працэнта сярэдняй зарплаты расіян, але ўсё роўна зусім няблага. Наша краіна паступова набывала рысы грамадства спажывання, людзі адчулі сябе заможнымі і з галавой кінуліся купляць, купляць і купляць... Летась з сукупнага даходу 27,44 мільярда доларaў ЗША жыхароў краіны на спажывецкія патрэбы пайшло 22,2 мільярда доларaў. Яшчэ нядаўна ў нас ВУП быў меншым. На Захадзе лічыцца выдатным, калі спажывецкі попыт за год вырас на 1,5-2 працэнты, а ў нас больш чым на 20 працэнтаў. Эканамічная сенсацыя ды і толькі. Назіраць за такой спажывецкай эйфарыяй цікава і адначасова трывожна.

— Чаму? Што сёння вас здзіўляе і насцярожвае ў паводзінах нашых суайчыннікаў?

— Не пазнаю беларусаў, якіх заўсёды адрознівалі рацыянальны падыход у справах і ашчаднасць. Колькі знойдзена глячкоў з манетамі і папяровымі царскімі грашыма, «керанкамі» пры разборы старых дамоў і сядзіб. Не толькі для мяне, але і многіх спецыялістаў у галіне макраэканомікі сюрпрызам стала тое, што насельніцтва ўвогуле не хоча зберагаць грошы. Браць у доўг у банках — калі ласка. А вось збіраць свае працоўныя рубельчык да рубельчыка, як некалі рабілі дзяды і бацькі, не хочуць. У выніку беларусы зусім мала ў параўнанні з жыхарамі іншых краін адкладваюць грошай на заўтра. У нас толькі 4 працэнты ад усіх даходаў ідзе на зберажэнне. Гэта вельмі нізкі паказчык.

Японцы, нагадаю, свой эканамічны цуд пачыналі пры 30-працэнтнай норме зберажэнняў хатніх гаспадарак. Не ведаю, можа беларусы бяруць прыклад з амерыканцаў, якія нічога не эканомілі і жылі на шырокую нагу да крызісу. Але гэта не ўзор для перайманне.

ЗДАЕЦЦА, ШТО БЕЛАРУСЫ БЯРУЦЬ ПРЫКЛАД З АМЕРЫКАНЦАЎ, ЯКІЯ ЖЫЛІ НА ШЫРОКУЮ НАГУ ДА КРЫЗІСУ.

— Сёння ў свеце ў сувязі з глабальным фінансавым крызісам паўсюдна адчуваецца дэфіцыт наяўных грошай. Як, на ваш погляд, ці дазволяць істотныя змены ў банкаўскай сферы, у прыватнасці, амністыя капіталаў, адмена абавязковых дэкларацый на іх паходжанне, прыцягнуць у вялікіх аб'ёмах сродкі насельніцтва і з-за мяжы? І тым самым палепшыць грашова-крэдытную сітуацыю ў краіне.

— Будзем рэалістамі. Я моцна не разлічваў бы на хуткую перарыентацыю замежных фінансавых плыняў у Беларусь. На жаль, яе яшчэ недастаткова ведаюць у свеце. Гэта стрымліваючы фактар. З іншага боку, калі ўсё ж мы здолеем прыцягнуць вялікія мільярды з-за мяжы, то, скажыце, што мы будзем з імі рабіць ва ўмовах чаканага рэзкага зніжэння спажывецкага попыту? Гэтыя мільярды трэба будзе адпрацаваць ці, як сёння кажуць, «адбіць» іх гаспадарам. Бо сёння банкі даюць высокія гадавыя працэнты (10-12) на валютныя дэпазіты. Вельмі шмат грошай нам не трэба. Іх колькасць неабходна сувымяраць з тымі рэальнымі праектамі, якія мы плануем рэалізаваць у бліжэйшы час. А вось калі б прыток укладаў насельніцтва складаў 3-4 мільярды амерыканскіх доларaў штогод, было б вельмі нядрэнна.

Нам хоць бы давесці норму зберажэнняў да 10 працэнтаў. Выходзячы з гэтых паказчыкаў мы маглі б прыцягнуць сродкі насельніцтва ў нашы банкі прыкладна 2,5 мільярда ў доларавым эквіваленце. А пры норме зберажэнняў 20 працэнтаў гэта лічба падвоіцца. Нам трэба пераканаць людзей быць ашчаднымі ва ўмовах няпэўнай крызіснай сітуацыі ў свеце. Не варта хлусіць самім сабе, што гэта навала нас абыдзе. Закране, будзьце ўпэўнены. Гэта справа часу. Таму сёння жывіце па сродках. Вобразна кажучы, не трэба шмат есці, не праядаць у спажывецкім сэнсе, не класціся спаць на поўны страўнік, а лепш мець на рахунку ў банку нейкую суму на «чорны» дзень. Спакайней будзе.

— Яшчэ адносна нядаўна ў 90-х гадах асноўнай формай зберажэнняў была таварная. Ці не прымусіць крызіс беларусаў успомніць мінулае?

— Не выключана, што ў часткі нашых людзей псіхалогія спрацуе ў гэтым накірунку. Бо ёсць кур'ёзныя прыклады мінулага, калі ў многіх заможных сем'ях, якія мелі выхады на гандаль, былі назапашаны мяхі цукру, мукі, круп, скрыні гарэлкі, два халадзільнікі і тры тэлевізары ва ўпакоўцы, шматгадовы запас пральных парашкоў і г.д.

Але не думаю, што поўнасцю паўтарацца грымасы мінулага спажывецкага ажыятажу. Хутчэй, таварная форма зберажэнняў увасобіцца не ў рэчах доўгатэрміновага попыту, а ў золаце, брыльянтах, нерухомасці. Многія людзі будуць дзейнічаць з аглядкай на нядаўняе мінулае, якое зрабіла адбітак на фарміраванні эканамічнай псіхалогіі беларусаў. А што вы хочаце? Жорсткі ўрок пачатку 90-х гадоў, калі ў адзін момант абясцэніліся ўклады ў Ашчадным банку СССР, не забыты.

— Дарэчы, у час крызісу і гіперінфляцыі 90-х гадоў пасля развалу СССР менавіта ўкладанні ў нерухомасць дазволілі самым спрытным і маючым сувязі ў банках добра пагрэць рукі. Сёння такое магчыма?

— Сумнеўна. А тады, сапраўды, тыя, хто здолеў узяць крэдыты пераважна ў дзяржаўных банках на ўзвядзенне катэджаў, своечасова па танных цэнах закупіць будаўнічыя матэрыялы і дамовіцца з начальнікамі будаўнічых арганізацый, аказаліся ў вялікім выйгрышы. Такі варыянт эканамічных паводзінаў быў паспяховым і неверагодна прыбытковым. У выніку галапіруючай інфляцыі за сімвалічныя сумы, амаль задарма пэўнае кола людзей стала гаспадарамі дарагой маёмасці. А банкі моцна страцілі. Дзіўная і непаўторная, спадзяюся, з'ява.

— Але тады банкі выдавалі крэдыты толькі на жыллё (іх яшчэ і не кожны мог атрымаць)... Цяпер — на што душа пажадае. Відаць, шмат нашых людзей трапілі ў капканы «чароўных» крэдытаў? Адзін з банкаў так і назваў свой крэдыт — «чароўным».

— Што такое крэдыты? Гэта грошы, якія бяруцца з нашага нацыянальнага кашалька. Калі эканоміка стабільная, то яны працуюць цалкам эфектыўна. Але цяпер стабільнасць пад знешняй пагрозай. Сёння працягваць жыць у доўг — значыць моцна рызыкаваць, бо перспектывы росту даходаў і захавання працоўнага месца становяцца няпэўнымі. Асабліва на фоне не абвалу крэдытаў на сусветных рынках. Таму лепш не паддавацца спакусе набыць усё і адразу за крэдыты.

— А які золатавалютны запас трываласці павінна мець Беларусь, каб вытрымаць раптоўны абвал фінансавай сістэмы планеты?

— У памерах трохмесячнага імпарту ці прыкладна 6-7 мільярдаў доларaў ЗША. Але не думаю, што правільным будзе пасіўна чакаць развіцця падзей у свеце. Неабходна ўзмацніць пошук шляхоў развіцця ўнутранага рынку, мэтанакіраваную і паўсядзённую работу па прасоўванні нашага эксперту. І трэба мець на ўвазе, што ў час сусветных крызісаў адны краіны страчваюць свае пазіцыі, а іншыя набіраюць эканамічную вагу. І хацелася, каб Беларусь дастойна выйшла з гэтых выпрабаванняў і ўзнялася.

Гутарыў
Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На гэтым тыдні дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай лініі» Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

25 лістапада — вядучы спецыяліст аддзела першаснай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Алена Валянцінаўна ЦІТКОВА.

26 лістапада — галоўны спецыяліст аддзела медэкспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Тамара Канстанцінаўна МАРТУСЕВІЧ.

27 лістапада — намеснік дырэктара РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі Аксана Мікалаеўна РАМАНАВА.

28 лістапада — галоўны педыятр Міністэрства аховы здароўя Алена Георгіеўна НЕВЕРА.

Графік работы «гарачай лініі» з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.30.

У графіку магчымыя змяненні.

Прамая лінія

ДЗЕЦІ ЯК ЛЮСТЭРКА БАЦЬКОЎ

На пытанні чытачоў адказвала асістэнт кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Іна ПЯТНІЦКАЯ.

(Працяг. Пачатак за 21, 22 лістапада.)

☎ — Галіна, Мінск. Маёй дачцэ 7 гадоў. Да нядаўняга часу мы сям'ёй спалі ў адным пакоі. А цяпер з'явілася магчымасць паставіць ложак дзяўчынкі ў асобны пакой. І пачаліся праблемы. Вось ужо месяц як яна прачынаецца ў тры гадзіны ночы, падыходзіць да дзвярэй нашага пакоя і стаіць, кажа, што хоча спаць з намі. Калі я на яе сваруся, яна сыходзіць, але спаць не кладзецца, проста сядзіць у ложку. Што нам рабіць?

— Па ідэі, яна спрабуе адвязваць вашу максімальную ўвагу. Аднак месяц — яшчэ не тэрмін, і сітуацыя не выходзіць за рамкі нормы. Да трох месяцаў з гэтым можна змагацца... Пакуль яна правярае, наколькі можа маніпуляваць паводзінамі бацькоў.

Вы павінны абмеркаваць з ёй тое, што яна ўжо дарослая дзяўчынка і павінна начаваць адна. Скажыце ёй, што вы разумееце, што ёй хочацца быць з мамай. Але з мамай можна быць днём, вечарам. Ноччу трэба ўкладвацца ў свой ложак. Далей кажыце: «Давай дамовімся. Увесь гэты тыдзень, калі ты будзеш прачынацца і прыходзіць, я буду зноў класці цябе ў твой ложак і даваць табе 10 хвілін, каб ты заснула. Гэты час я буду сядзець каля цябе, раскажу казку. Праз дзесяць хвілін я пайду ў свой пакой, а ты застанешся ў сваім». Але ні ў якім разе не кладзіцеся з ёй, толькі пасядзіце побач. Можна ўключыць ёй начнічок. І прыдумаць гісторыю, што ў яе ёсць сябар — начнічок, унутры якога жыве светлячок, з якім не страшна, які разгоніць цемру і будзе дачушку ахоўваць.

А далей можна ёй прапанаваць «кантрактную сістэму». У гульнявой форме з дзецьмі значна лягчэй дамаўляцца. Вы гаворыце, што калі яна не прыходзіць дзве ночы, то на выхадныя вы пойдзеце ў парк, цырк. Толькі не купляйце вялікіх падарункаў. Сумесныя паходы куды-небудзь больш важныя, тым больш што яна патрабуе эмацыянальнай сувязі.

Давядзецца праявіць настойлівасць. Ваша дзіця дакладна ведае, чаго хоча. Але вы таксама дакладна ведаеце, чаго хочаце. Не бойцеся, гэтым вы яе не пакрыўдзіце, не прыведзяце да нейкага неўрозу. Тут проста ідзе барацьба характараў, хто каго перагуляе, хто акажацца больш настойлівым. Але прагаворваць гэту сітуацыю вам давядзецца, можа быць, кожны дзень. Кажыце: «Я цябе разумею, я, магчыма, таксама так змагалася б, але ўсё роўна будзе па-мойму, я ўсё ж старэйшая, я — мама і я вырашаю». Калі яна выйграе ў гэтай сітуацыі, то ў наступны раз яна яшчэ ў нечым выйграе.

Трэба скарэктаваць глыбіню сну ў бок павелічэння. На ноч даваць травы, адвары ў выглядзе чаю. Перад сном можна рабіць ванны з хвояй, валяр'янам. Гэта робіцца ў падтрымку тэрапіі паводзінаў.

— А калі не дапаможа?

— У Мінскім гарадскім клінічным дзіцяча-падлеткавым дыспансэры ў Кунцаўшчыне ёсць псіхалагічная лабараторыя. Там вам змогуць прадаставіць розныя сюжэты таго, як можна паступаць у гэтай сітуацыі, а вы іх проста апрабуеце на практыцы.

☎ — Інга Мікалаеўна. Гомель. Дачцэ 13 гадоў. Яна вельмі дрэнна спіць. Часта прачынаецца па начах ад кашмараў. Што рабіць?

— Па тэлефоне цяжка даваць кансультацыю. Трэба абследавацца, звярнуцца да спецыялістаў. У Гомелі працуюць цудоўныя псіхіятры і псіхатэрапеўты. На базе Гомельскай псіхіятрычнай бальніцы ёсць дзіцячае дыспансэрнае аддзяленне, дзённы стацыянар. Звярніцеся туды.

☎ — З Лоева звоніць Святлана. Скажыце, доктар, ці праўда, што наступствам дэпрэсіі могуць быць розныя хваробы?

— Так, хваробы могуць быць. Падчас дэпрэсіі парушаецца сон і апетыт і, адпаведна, пагаршаецца фізічны стан чалавека. Могуць з'явіцца праблемы са страўнікава-кішачным трактам, абвастраюцца гастрыты. На фоне дэпрэсіі можа абвастрыцца тая ж бранхіяльная астма. Інакш кажучы, на дэпрэсію рэагуюць самыя слабыя месцы арганізма, асабліва хранічныя захворванні.

☎ — Светлагорск турбуе, мяне завуць Серафіма Іванаўна. Унуку 12 гадоў. Ён часта паражае бацькам, што сыдзе з дому, а яшчэ горш, учыніць суіцыд, калі яны не будуць выконваць яго капрызы. Як быць?

— Да такіх пагроз трэба ставіцца вельмі сур'ёзна. Падлеткавы ўзрост характарызуецца тым, што ўсе гэтыя суіцыдальныя выказванні носяць, як правіла, дэманстрацыйны і маніпуляцыйны характар. Такім чынам дзеці спрабуюць прымусіць бацькоў рабіць тое, чаго яны хочуць. Але гэты суіцыд напаказ часам нечакана можа ператварыцца ў завершаны суіцыд. Дапусцім, дзіця не разлічыла дозу лекаў, час прыходу бацькоў.

Калі ў доме ёсць такі хлопчык, пажадана, каб за ім быў кантроль. Не яўны, не навязлівы. Але канталяваць яго неабходна. Бацькі не павінны выконваць яго капрызы, бо спрацуе жаданне маніпуляваць дарослымі ў большай ступені. Трэба паспрабаваць разабрацца ў сітуацыі. Высветліць, чаму ён хоча менавіта гэтага, і што бацькі могуць прапанаваць яму ў замен. Скажыце яму прыкладна так: ты задумаў суіцыд, але нас гэта зусім не ўражвае. Давай лепш знойдзем іншыя варыянты выхаду з дадзенай сітуацыі. Трэба не проста адмовіць у капрызе, а адмовіць абгрунтавана, даходліва. І зноў-такі бацькі могуць звярнуцца па кансультацыю да спецыялістаў.

☎ — Мінск, Ірына вас турбуе. 13-гадовы хлопчык баіцца павукоў. Скажыце, як можна з гэтым змагацца?

— Наколькі моцна праяўляецца гэта боязь?

— Ну, напрыклад, на дачы ён не зойдзе ў адрыну, дзе тыя могуць быць...

— Зразумела. Страх — абарончая рэакцыя арганізма. Калі дзіця не страчвае прытомнасці, не істэрыць пры выглядзе павука, то тады маюць месца нармальныя абмежавальныя паводзіны. Хлопчык не хоча сустракацца з тым, што яму непрыемна. Нічога паталагічнага тут няма. Іншая справа — зафіксаваны стан, калі дзеці прачынаюцца па начах, скардзяцца на тое, што «гэтыя павукі зноў прыходзілі» і г.д. Гэта ўжо неўратычнае расстройства. Наколькі я разумею, у вашым выпадку такіх парушэнняў няма. Ні сон, ні паводзіны, ні настрой хлопца не мяняюцца. З цягам часу страх, можа быць, аслабее...

Дарэчы, у дачыненні да малых дзяцей ёсць паняцце дэсенсібілізацыі да страху. Калі дарослыя хочуць пазбавіць дзіця боязі тых жа павукоў, можна прымяніць такую практыку: маляваць «страшны» аб'ект у не страшным выглядзе: дамалёўваць яму банцікі на ножках, фарбаваць яго ў жоўты колер, інакш кажучы, страшны вобраз ператвараць у смешны. Далей можна зрабіць сувенір — вылепіць павука з падручнага матэрыялу. Але тут важна не перабраць, паколькі нелюбоў часам можа перарасці ў процілеглы стан, калі дзеці захапляюцца развядзеннем павукоў...

— Скажыце яшчэ, а калі хлопец не можа адзін знаходзіцца ў цёмным пакоі, спусціцца па цёмнай лесвіцы — просіць, каб яму патрымалі дзверы расчыненымі?..

— Гэта не выходзіць за межы. Працэнтаў 70 дзяцей і частка дарослых баяцца цемры. Хлопчык засынае са святлом?

— Просіць, каб начнік гарэў.

— Гэта нармальна.

— Памятаеце, некалькі гадоў таму па тэлебачанні паказвалі серыю перадач «Нянька спяшаецца на дапамогу». Як вы ставіцеся да такой практыкі і ці можна верыць, што яна існуе рэальна?

— Я бачыла некалькі перадач з гэтага цыкла. І мне яны спадабаліся. Думаю, што гэта рэальна. За мяжой такой справай займаюцца прыватныя канторы. У Беларусі такіх няма.

— Значыць, трэба «завадзіць»...

— І я так лічу.

☎ — Слуцкі раён, Тамара Мікалаеўна. Унучцы 11 гадоў. Стала надта раздражняльная — проста не дакрануцца да яе, злуецца, крычыць... На твары нейкія балячкі выскачылі, часта ўзнімаецца тэмпература... Урачу яшчэ не паказвалі... Што з ёю можа быць?

— Я не бачу вашу ўнучку, і мне цяжка дакладна патлумачыць сітуацыю. Тым не менш рызыкну выказаць такое меркаванне. Бабулі нярэдка надта актыўна і настойліва прапануюць сваю дапамогу, апеку ў дачыненні да ўнукаў. Унукі ж, асабліва калі яны ўжо выйшлі з дашкольнага ўзросту, спрабуюць адстойваць сваю самастойнасць. Адсюль і рэакцыя пратэсту. З другога боку, у дзяўчынкі, хутчэй за ўсё, ёсць праблемы са здароўем, і паводзіны дзіцяці могуць тлумачыцца нейкім захворваннем. Калі дзіця хварэе, то, безумоўна, у яго абвастраецца жаданне «адбівацца» ад дарослых. Трэба паказаць дзяўчынку педыятру.

☎ — Таццяна Валер'еўна з Пінскага раёна звоніць. У мяне расце 3-гадовая ўнучка. Скажыце, калі ласка, якую тактыку ў выхаванні такога дзіцяці лепей абраць — прыслухоўвацца да яго жаданняў або нацэліць на дасягненне пэўных вынікаў у будучыні, вадзіць у розныя секцыі, гурткі, патрэбныя яму з пункту гледжання дарослых?

— Ні ў якім разе не параю насільна рыхтаваць 3-гадовае дзіця да школы ці для «дасягнення пэўных вынікаў у будучыні». Сапраўды, ёсць такое меркаванне, што таленты лепш развіваць як мага раней, з 3 гадоў, калі дзеці хутка запамінаюць інфармацыю, пачынаюць чытаць. Аднак калі дзіця добра загрузіць усім гэтым «навучаннем», то акрамя магчымых талентаў могуць прачнуцца і праблемы псіхалагічнага кшталту. Бацькі проста адбяруць у дзіцяці дзяцінства, той час, калі яно павінна бегаць, «сябраваць» з равеснікамі і г.д. Гэты перыяд, дарэчы, павінен працягвацца да пачатку школьных заняткаў. Калі ж бацькі ўсё ж такі хочуць штосьці даць 3-гадоваму дзіцяці, то яны павінны заўважыць, ці падабаецца яму той ці іншы занятак, ці атрымлівае яно станоўчыя эмоцыі? Калі гэта патрэбна толькі бацькам, значыць, яны маюць шанц дабіцца цалкам адмоўнай рэакцыі. Пры навучанні неабходна ўлічваць два моманты: па-першае, яно павінна насіць характар гульні, а па-другое, мець на ўвазе здольнасці і схільнасці таго, каго ўцягваюць у гэты працэс...

Дарэчы, часам бацькі пераацэньваюць сваіх дзяцей, рэалізуюць свае амбіцыі. Яны водзяць дзяцей у некалькі секцый, і разважаюць прыкладна так: я дам свайму дзіцяці ўсё, чаго некалі не далі мне. Такія бацькі, быццам і заўважаюць, што нічога ў іх дзіцяці не атрымліваецца, але настойліва суцішаюць сябе тым, што ўсё можна развіць. Аднак, дакладна вядома, што калі ў дзіцяці няма жадання, нічога добрага не будзе.

— А што вы скажаце пра моду на навучанне дашкалят замежным мовам?

— У першую чаргу ў дзіцяці не павінна быць лагапедычных праблем. Калі такія ёсць, то вывучэнне другой мовы недапушчальнае. Займацца вывучэннем іншай мовы трэба, калі няма дэфектаў маўлення і ўжо ёсць асноўная маўленчая база.

☎ — Валянціна, Мінск. Майму дзіцяці — 3,7 года. Дзяўчынка не падобная ні на мяне, ні на бацьку. Я маю на ўвазе яе актыўнасць. Пастаянна патрабуе да сябе ўвагі, хутка асвойвае новыя рэчы, адным словам, мы ў яе ўзросце такімі не былі... Я чытала, што сучасных дзяцей называюць «індыга»... А што вы думаеце пра гэта?

— Часам такім словам — «індыга» — называюць гіперактыўных дзяцей. Некаторыя прымяняюць яшчэ словазлучэнне «камп'ютарныя дзеці» — за здольнасць апошніх хутка асвойваць камп'ютарныя гульні... Гэтыя дзеці растарможаныя ў рухах, не ўтрымліваюць увагі, пастаянна патрабуюць змены дзейнасці, высока імпульсіўныя ва ўчынках — спачатку робяць і толькі потым разумеюць, што яны зрабілі. Ім цяжка ўвайсці ў агульную, калектыўную гульню. Максімальна прыцягваюць да сябе ўвагу. Гэта цяжкія для бацькоў і педагогаў дзеці. Па сутнасці, нават праблемныя. Нягледзячы на адсутнасць засяроджанасці, вучыцца яны могуць добра. Памылкі будуць, хіба, толькі за няўважлівасці...

Самае важнае для такіх дзяцей — строгі рэжым ва ўсім. Прычым ужо з 2-гадовага ўзросту дзіця павінна ведаць, калі яму трэба прачынацца, снедаць і г.д. Строгі распарадак такім дзецям павінны забяспечыць дарослыя. Абмежаванні павінны дзейнічаць да моманту пераходу ў старэйшую школу.

☎ — Жодзіна тэлефануе. Марына Іванаўна, бабуля 4-гадовага ўнука. Хлопчык наведвае дзіцячы садок. Часта хва-рэе, але яго бацькі не хочуць, каб ён заставаўся дома са мной. Скажыце, што добрага ў наведванні садка і ці можа частая захваральнасць сведчыць аб псіхалагічных праблемах?

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

— Сапраўды, дзіця можа часта хварэць з-за таго, што яму не хочацца ісці ў садок. У норме лічыцца, што на працягу 1,5-2 месяцаў дзіця можа быць капрызным, плаксівым, хварэць — прывыкаць да садка.На першым часе, пакуль не «перахварэюць» рознымі інфекцыямі і не набудуць уласны імунітэт дзеці абавязкова будуць хварэць. Як толькі імунітэт стане ўстойлівым, дзіця будзе хварэць менш. Але псіхалагічны складнік таксама мае тут вялікае значэнне. Дзеці, якія негатыўна ставяцца да садка, хварэюць часцей і даўжэй.

Ёсць наогул «нясадаўскія» дзеці, якія пастаянна пакутуюць ад хваробаў. Магчыма, такім лепей заставацца з бабуляй. Аднак калі ў дзіцяці ёсць праблемы ў кантактах з равеснікамі, калі яно замкнутае, трывожнае, можаце сабе ўявіць, якім яно прыйдзе да школы. Садок — гэта сацыялізацыя, магчымасць атрымаць першыя навыкі стасункаў, знайсці сабе сябра, уключыцца ў агульную гульню і г.д. Нават калі дзіця застаецца з бабуляй, усё роўна трэба наведваць садок хоць на некаторы час, таму што бабулі не могуць даць такіх ведаў, якія сёння забяспечваюць у садках. У садаўскіх дзяцей мысленне развіваецца значна лепш у параўнанні з тымі, якія застаюцца дома.

— А з якога ўзросту ўсё ж такі лепш аддаваць дзіця ў садок?

— З пункту гледжання псіхалагічнай адаптацыі — дзесьці з 2-гадовага. Аднак імунітэт фарміруецца бліжэй да 3 гадоў, таму лічыцца, што пасля 3 гадоў дзеці радзей хварэюць.

☎ — Віцебская вобласць, Алена Андрэеўна. Сын маёй пляменніцы пакутуе ад нетрымання мачы. Хлопцу — 11 гадоў. Падкажыце, да каго ім звярнуцца па дапамогу?

— Лічыцца, што да 4-гадовага ўзросту наяўнасць энурэзу не выходзіць за межы нормы. Але ніхто нават не чакае такога ўзросту. Адразу як толькі выяўлена праблема, пачынаюць лячэнне. Імкнуцца да «сухога» перыяду трэба абавязкова і як мага хутчэй. Тым больш, праблема гэта добра вывучана і цудоўна лечыцца. Варта паказаць дзіця неўролагу або псіхіятру.

«Прамую лінію» правялі
Святлана БАРЫСЕНКА
і Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Наименование предмета аукциона	**Здание детского сада-яслей с сооружениями и право заключения договора а

ДАРОГІ ДА ВЫБОРАЎ

Генеральнага дырэктара КУП «Брэстаблдарбуд» Пятра СКАРАБАГАЦЬКУ яе заўсёды засталі ў традыцыйных клопатах аб дарожнай гаспадарцы вобласці: на гэты раз цана на беларускі шчэбень павялічылася ў 1,8 раза. А гэта адбіцца і на асноўных будаўнічых матэрыялах для дарожнікаў, і змяненне яго кошту, вядома ж, не можа не адбіцца на выніках іх работы.

Тым не менш прадпрыемству ўдалося выйсці на даволі прыстойныя эканамічныя паказчыкі — многія з іх у параўнанні з вынікамі мінулага года складаюць 130—140 працэнтаў. Рэнтабельнасць прадпрыемства па выніках года складзе звыш 9 працэнтаў. Аб'яднанне не мае стратных філіялаў — кожнае падраздзяленне выконвае бізнес-план па асноўных паказчыках. З году ў год расце колькасць ардымантаваных кіламетраў дарог, развіваецца прадпрыемства.

Традыцыйна істотны ўклад дарожнікі ўнеслі ў падрыхтоўку абласнога фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2008», які сёлета праводзіўся ў Століне. Адным словам, вядзецца рытмічная, мэтанакіраваная, выніковая работа.

— Прагрэсу работ, якія нам даводзяцца губернатарам, кіраўніцтвам галіны, прадпрыемствам цалкам выконваюцца, — адзначыў Пётр Андрэевіч. — Адзін прыклад. Нам даравалі заданне добраўпарадкаваць 247 аб'ектаў (мэтавары, зернетакі, малочнатаварныя, жывёлагадоўчыя фермы і пад'ездаў да іх) у 43 аграгарадках вобласці, якія здаюцца сёлета. Гэта 80 працэнтаў ад усіх падобных аб'ектаў у вёсцы. «Брэстаблдарбуд» ужо ў першай палове пяцігоддзя рапартаваў аб патрэбнікоўкай рэалізацыі гэтых аб'ёмаў дарожных работ у аграгарадках, што вельмі важна для сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці. Зразжа працягваем работу па прамых дамовах там, дзе ёсць крыніцы фінансавання.

Значнасць добрай дарогі гарадскому жыхару, які штодня «кыюе» на асфальтабетоне, пояснаю адчуць складана. Адчаю для вясковца перацяніць яе цяжка. І разбіта, не камфортная, небяспечная дарога, якая непасрэдна ўплывае на сувязь з райцэнтрам ці аграгарадком, выклікае ў жыхароў глыбокі вельмі негатыўны эмоцыі, пачуццё адарванасці ад вялікага жыцця. Гэта яскрава пацвярджаецца ў дачыненні да вёсак, што па магчымасці і робіцца. Аднак пытанне ўпіраецца ў фінансаванне. Асфальтабетоннае пакрыццё — вельмі нятанное задавальненне. Таму ў першую чаргу такія дарогі з'яўляюцца там, дзе гэта мэтазгодна з-за наўпрасці вытворчасці ці кампактнага пражывання значнай колькасці насельніцтва, наяўнасці пэўнай нагрузкі на дарогу. Пагадзіцеся, правесці бетонкі да кожнага хутара за дзясяткі кіламетраў — гэта проста разбазараванне дзяржаўных грошай. Такога не можа дазволіць сабе нават самая багатая краіна свету — ЗША. Аднак нягледзячы на адсутнасць асфальтабетону, абсалютна ўсе дарогі Брэсцкай вобласці праезныя ў любую пару года.

— І тым не менш, штогод мы далучаем да гэтага дасягнення цывілізацыі некалькі дзясяткаў населеных пунктаў, — заўважае Пётр Андрэевіч. — Адна з такіх невялічкіх вёсачак, дарэчы, тупіковых, — Каладзеевічы. Дзякуючы пабудаванай дарозе, вёска ажыла: туды ўжо тройны на тыдзень пачаў хадзіць аўтобус. Нават людзі пачалі сябе адчуваць па-іншаму — больш годна, ці што, плечы распавілі...

І так паўсюль, дзе, дзякуючы прафесіяналам у яркаранжавай спецвопратцы «Брастаблдарбуда», добрая дарога звяла людзей ці аб'екты з вялікім жыццём.

А тое, што ў аблдарбудзе працуюць вы ключна прафесіяналы, ні ў кога не выклікае сумненняў — такіх вынікаў дасягнуць за кожнае пад ціск. Пётр Скарабагацька пераканаў — калі належным чынам працаваць з кадрамі, можна дабіцца добрых вынікаў і на самых старанных і тапенавітых супрацоўніках. Таму кадравых «рэвалюцый» у «Брэстаблдарбудзе» і не здараецца. Дарэчы, гэта надае дадатковую упэўненасць яго работнікам.

— Лічу, што вакол кожнага чалавека трэба стварыць такія ўмовы, каб ён праявіў і актыўнасць, і праяўленасць, і ініцыятыву, і абыякавасць

да працы за свае месцы. Натуральна, даходы павялічваюцца выключна ў жорсткай прывязцы да прадукцыйнасці працы. Прычым прадукцыйнасць заўсёды апераджае зарплату. Менавіта такая формула эканамічна апраўдваня і стварае пэўны запас трываласці: дазваляе прадпрыемству абнаўляць вытворчасць, устойлівы і дынамічна развіваецца.

Пацікавіліся ў Пятра Андрэевіча мы і вось якім пытаннем. Брэсцкая вобласць — заходнія вароты Беларусі. Да Польшчы, як кажуць, рукой падаць. Улічваючы гэты факт, а таксама работу польскага боку па ўвядзенні сумнавядомай «карты палякаў», ці не падаліся асобныя брэсцкія дарожнікі на доўгі еўра да сусядзяў?

— Увогуле адток кадраў для нас — выпадкі адзінкавыя і нават можна сказаць надзвычайныя, — адзначае Пётр Андрэевіч. — І дакладна магу сказаць, што замяняць «польскага сантэхніка», якім усё палохаюць Еўропу, ніхто з нашых работнікаў не кінуўся. На работу ў Расію сапрэзіс ці некалі спецыялістаў з'ехалі. Але гэта, паўтарэся, выключэнні. Самі падумайце, ну чаго нашым дарожнікам кідаць сем'і, абжытыя кватэры і за нейкія 700—800 еўра ехаць у тую ж Польшчу ці Расію? Калі чалавек добра працуе, ён і ў нас заробіць блізка да гэтага. Да таго ж на падначёмжыцця, праезд, харчаванне трацціца не трэба. Зноў жа, у сям'і жыве. Не, для нас такой праблемы не існуе.

Жыццё — гэта дарога, а дарога — гэта жыццё. Філасофская ісціна, якая ўзгадваецца ў культурах і рэлігіях розных народаў і розных часоў, не страціла сваёй актуальнасці і сёння. Аднак ёсць людзі, якія ў сілу сваёй прафесіі ставяцца да яе з асаблівай павагай — гэта дарожнікі. Але і сярод іх ёсць такія, што ўспрымае дарогу як нешта больш, чым проста інжынернае збудаванне. Можа таму і адрамяшаецца ў іх крыху больш і крыху лепш, чым у калег.

— І ўсё ж такі мы дарогі будуем, рамантуем, утрымліваем не ўласна дзеля дарог, а каб яны спраўна служылі людзям, — падкрэсліў генеральны дырэктар КУП «Брэстаблдарбуд» Пётр Андрэевіч СКАРАБАГАЦЬКА. — Спакон вякоў людзі сяліліся побач з дарогамі, шляхамі. Бо дзе ёсць дарога, там цячэ само жыццё. І сёння завершаны сацыяльна-эканамічны, гісторыка-культурны аб'ект з'яўляецца толькі тады, калі да яго маецца добры пад'езд.

Гэта ў поўнай ступені датычыцца і гістарычных мясцін і помнікаў. Як толькі да іх будуецца добрая дарога, яны тут жа трапляюць у кола інтарэсаў турыстычных агенцтваў, заможных гасцей. Такіх прыкладаў на Брэстчыне — дзясяткі. Тут можна ўзгадаць і маёнтак слыннага паэта Адама Міцкевіча Завоссе ў Баранавіцкім раёне, і малую радзіму маршала, кампазітара, музыканта Напалеона Орды ў Івацэвіцкім раёне, і радавое гняздо Сапегаў у Рэчыцах... Плынь турыстаў да знакамітых мясцін Брэстчыны ў апошнія некалькі гадоў павялічылася настолькі, што дарожнікі разам з кваранцінацыйным саветам вобласці па гісторыка-культурнай спадчыне на чале з губернатарам правялі работу па ўстаноўцы дарожных знакаў маршрутнага арыентавання побач з помнікамі гісторыі і культуры.

Налета 600-годзіе з моманту ўстанаўлення запаведнага рэжыму аднайчыны спярадзіна жамчужына Беларусі, самы стары лес Еўропы Белавежская пушча. Падрыхтоўка да гэтай падзеі вядзецца не адзін год. Прыклалі свае рукі і дарожнікі. Сёлета ў вёсцы Камянюкі, якая па сутнасці з'яўляецца ўваходнымі варотамі Белавежы, дарожнікі ўклалі больш як паўмільярда рублёў на добраўпарадкаванне дарог. Налета на гэтыя мэты плануецца выдаткаваць і асвоіць яшчэ больш за мільярд рублёў.

Аднак памыляцца апяваць нікчэмнасці, але вельмі важкі ўклад дарожнікаў у папулярызацыю спадчыны, развіццё турызму толькі тымі некалькімі сотнямі метраў, што вядуць непасрэдна да таго ці іншага помніка. Турысту, а тым больш распешчанаму іншаземцу, зусім не абыякава, як увогуле ён патрапіць у той ці іншы раён, размешчаны ўбаку ад магістральных дарог. Таму якасць дарожнага пакрыцця, бяспека і камфорт руху на мясовых дарогах маюць велізарнае значэнне не толькі для айчыннага карыстальніка дарог і для народнай гаспадаркі. І на выкананне гэтай задачы «Брэстаблдарбуд» працуе з дня ў дзень на працягу дзясяткаў гадоў.

Гэта работа будзе працягнутая і ў іншых нашых ДРБУ. Натуральна, работа няпростая, разлічаная не на адзін месяц і нават год. Аднак спыняцца на дасягнутым ці збочваць з абранага шляху, нягледзячы на цяжкасці і выдаткі, дарожнікі не збіраюцца.

Памыляюся лічыць, што «Брэстаблдарбуд» быў прызнаны адной з лепшых арганізацый у вобласці па выкананні Дырэктывы № 3 выключна з-за дасягненняў па перавозцы цыклічнай на масцовыя відэ паліва. Спіс энергазберагальных мерапрыемстваў, праведзеных дарожнікамі, ледзь умяшчаецца ў дзесяці «ўпітанай» папцы.

Гаворачы выключна пра дарожную тэматыку, варта ўзгадаць актыўны пераход прыладаў ямачнага рамонту і ўстройстве дарожнага палатна ад выкарыстання гарачага і даволі энергаёмістага асфальтабетону да халоднага і цёплых сумесяў на аснове бітумнай эмульсіі. Энергетычны і экалагічны эфекты ад выкарыстання новай тэхналогіі сапрадуны ўражваюць.

Нельга скідваць з рахунку і сучасную тэхніку. Увогуле для тэхнічнага пераўзбраення прадпрыемства існуе некалькі крыніц. Першая — цэнтралізаванае мэтавае фінансаванне, за якое вялікі дзякуй дзяржаве, галіне, кіраўніцтву вобласці.

Есць і іншая крыніца — амартызацыйны фонд. З-за недахопу абаротных сродкаў ён засвойваецца не заўсёды і не ўсюды: фонд быццам бы ёсць, а жывых грошай у ім няма. Некалькі гадоў таму так было і ў нас. Аднак мы пераламалі такую сітуацыю. І вось

Даведка:
Косаўскі замак *— руіны, размешчаныя ў Брэсцкай вобласці побач з гарадам Косава. Вядомы як палац Пуласлоўскіх. Палац і навакольны парк былі закладзены ў 1838 годзе па праекце архітэктара Ф. Яшчолда. У будаўніцтве браў удзел В. Марконі. У палацы было 132 пакоі. Палац пабудаваў на ўласныя сродкі вавода Казімір Пуласлоўскі, які быў буйным прамыслоўцам. Палац моцна пацярпеў у гады Вялікай Айчыннай вайны.*

У Кобрынскага краю багатая гісторыя. Па яго дарогах за мінуўшыя стагоддзі прайшлі не толькі шматлікія войны. Гэтыя мясціны захавалі сляды стваральнай працы многіх пакаленняў. Кіраўнік Кобрынскага ДРБУ-201 Аляксандр МАРЫНЕВІЧ ахвотна пазнаёміў нас са свежым прыкладам плённай працы свайго калектыву — добраўпарадкаванай дарогай на ўскраіне горада, дзе растуць-пашырастаюць новыя будынкі. Завітаўшы на базу ўпарэнняе, мы пазнаёміліся там з перадавымі працаўнікамі — машыністам асфальтаўкладчыка Вячаславам НІКІЦЮКОМ, вадзіцелем катка Святаславам ДЗЕМІДЗЮКОМ, вадзіцелем пагрузчыка Аляксандрам МАЛЬШКАМ, машыністам аўтаграйдара Віктарам БРЫТАННУКОМ. Яны агледзелі тэхніку, якая шмат папрацавала ў летні перыяд. Тут жа мы сфатаграфавалі свежапафарбаваны ЗІЛ-131. Гэты перабаставляваны аўтамабіль — прыклад аградарчага падыходу да павышэння эфектыўнасці тэхнікі і ашчаднага выкарыстання паліва.

КУДЫ ВЯДУЦЬ ДАРОГІ БРЭСТЧЫНЫ

Пэўным чынам на нашым шляху ляжаў Кобрын. Горад з багатай і гераічнай гісторыяй — заснаваны яшчэ ў XI—XII стагоддзях — і даволі светлай перспектывай: налета менавіта тут запланавана правесці рэспубліканскі фестываль-кірмаш «Дажынкі». І каб патрыярх паспеў сустрэць сядзіб свята хлебаробаў ва ўсёй красе, рамонтныя і будаўнічыя работы ўжо цяпер ідуць поўным ходам. Самы актыўны ўдзел у іх бяруць і дарожнікі.

— Сёлета наша ДРБУ разам з калегамі з ДРБУ-140, 178 і 179 заасфальтавала дзевяць вуліц у раёне старой забудовы, — расказаў **начальнік кобрынскага філіяла Аляксандр МАРЫНЕВІЧ.** — Да халадоў паспелі закончыць аддзелачныя работы: умацаванне абочын, устаноўку дарожных знакаў, нанясенне разметкі. Гэта даволі значны падарунак гораду і асабліва яго жыхарам. Напрыклад, тая ж вуліца Фабрычная, якую даводзілася да ладу наша ўпраўленне, была фактычна непраезнай. Падчас будаўніцтва дарогі свае машыны ледзь не бульдозерам выцягвалі. А зараз, вы толькі гляньце!

У праекце на наступны год даць заданне аблдарбуду добраўпарадкаваць яшчэ 25—30 кіламетраў вуліц Кобрына. Пры ўмове своечасовага належнага фінансавання, лічу, дарожнікі справядзяц.

Аднак і акрамя дажынак клопатаў у кобрынцаў хапае — задачу па ўтрымянні сеткі мясцовых дарог, натуральна, ніхто не адменіў. Дарожнікі і тут не стаяць на месцы.

— Сёлета мы зрабілі яшчэ адзін эксперыментальны участак стабілізацыі гравійнага пакрыцця з устройствам двайнога сандвіча. Кошт аднаго кіламетра такой дарогі — каля 76 млн рублёў. Гэта значна танней за асфальтабетон. Для дарог з малой інтэнсіўнасцю руху, дзе не ходзіць цяжкагрузны транспарт, гэта аптымальны варыянт. Дарэчы, адна з дарог, выкананая па новай тэхналогіі, вядзе якраз да аднаго з турыстычных аб'ектаў Кобрыншчыны — дуба, пад якім у свой час адпачываў знакамітый рускі паказводзец Аляксандр Сувораў. Як вядома, у 1795 годзе сядзіба ў Кобрыне была падаравана фельдмаршалу, тут ён жыў з 1797-га па 1800 год.

Налета па тэхналогіі плануем зрабіць дарогу Каменічы — Акцябр, бо апошняя вёска на сёння не мае ні адной дарогі з асфальтабетонным пакрыццём, якая звязвала б яе з райцэнтрам. Пачнём з абяспыльвання.

Яшчэ адзін аб'ект, які карыстаецца папулярнасцю ў турыстаў, — страусіная ферма. Участак дарогі да яе выкананы таксама па адной з сучасных эканамічных тэхналогій з выкарыстаннем гравійна-эмульсійных сумесяў.

На Дузе Струвэ

Наведанне Іванаўскага раёна пачалі з малочнатаварнай фермы ЧУП «Моладаваграра». Менавіта падчас візіту на гэты аб'ект, да якога, дарэчы, дарожнікі зрабілі камфартабельны пад'езд, кіраўнік дзяржавы і даў даручэнне добраўпарадкаваць суседнія дарогі.

— Першапачаткова дарога была ў гравійным выкананні, — расказаў **начальнік ДРБУ-139 Васіль ГЕТМАНЧУК.** — Прэзідэнт Беларусі падчас наведвання раёна восенню 2007 года па просьбе мясцовых жыхароў даў даручэнне два ўчасткі дарогі ад Дастоева да Моладава і ад Моладава да Моталя пакрыць асфальтабетонам. Што мы і зрабілі. Пры тым што даручана было гэту работу выканаць да першага снежня, першы ўчастак мы здалі яшчэ вясной, другі — у жніўні гэтага года. Іх асфальтаваннем займаліся ўжо наш ДРБУ ў тупік не паставіла. Аж да самага знака, што ўказвае месцазнаходжанне аб'екта, рухаемся даволі хутка і камфортна — дарожнікі пакапаліся. Асабліва гэта цэніш, калі з'язджаеш на палявую, а потым трапляеш на лясную дарожку.

— Гэта ўжо зона не нашай адказнасці, аднак грэйдарам трэба прайсціся, — заўважае Васіль Канстанцінавіч.

Тым хто прыедзе пасля нас, дабіцца будзе больш зручна.

Шчыра кажучы, калі б не гранітны помнік, які сведчыць, што аб'ект занесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, гэадэзічны пункт наўрад ці прыцягнуў бы ўвагу падарожніка. Гэта ўсяго толькі фрагмент бруса з пясчаніку, цэгла ў зменае з бутавым каменем ці, яшчэ бывае, гранітны куб з поласцю, залітай свінцом у мэце з бульожніка. Аднак значэнне Дугі Струвэ, ці вымярэнні дугі мерыдыяна, цяжка пераацаніць. Дуга складаецца з 258 пунктаў працягласцю 2880 кіламетраў, дзе з 1816 па 1855 год праводзіліся самыя буйнамаштабныя ў гісторыі вымярэнні, што дазволілі вызначыць дакладны памер і форму Зямлі. Яны былі настолькі дакладныя, што праверыўшы звесткі спадарожнікавымі тэхналогіямі, сучасныя вучоныя проста дзіву даліся: пагрэшнасць склала ўсяго некалькі сантыметраў.

На тэрыторыі Беларусі знаходзіцца 31 пункт Дугі. Пяць з іх уваішлі ў аб'ект сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Увогуле, у нашай краіне гэта чацвёрты аб'ект пасля такіх сусветна вядомых, як Белавежа, Мірскі і Нясвіжскі замкі.

Багатая іваэвіцкая зямля і таленавітымі людзьмі. Помнік аднаму з іх — мастаку, кампазітару, літаратару, падарожніку Напалеону Ордзе — устаноўлены ў райцэнтры. Сорамна прызнацца, але пазнаёміцца ў гадоў таму пра слыннага земляка ў Беларусі ведалі нямногія. Хоць яго ўклад у сусветную культуру важкі нават па сённяшнім часе.

Багатая іваэвіцкая зямля і таленавітымі людзьмі. Помнік аднаму з іх — мастаку, кампазітару, літаратару, падарожніку Напалеону Ордзе — устаноўлены ў райцэнтры. Сорамна прызнацца, але пазнаёміцца ў гадоў таму пра слыннага земляка ў Беларусі ведалі нямногія. Хоць яго ўклад у сусветную культуру важкі нават па сённяшнім часе.

Таму аб'яднанне ўжо не першы год працуе над пераводам кацельняў на мясцовыя віды паліва. Так, у цэлым шэрагу нашых ДРБУ — Ганцавіцкім, Лунінецкім, Пінскім і іншых — мы поўнасцю адмовіліся ад спалывання дарагі і еўра ў топках. І пры гэтым на вытворчых базах, а гэта велізарныя плошчы, забяспечаны тэмпературны рэжым нашае лепшы, чым пры іх ацяпленні газам ці мазутам. Пры гэтым дровы мы не набываем, а нарыхтоўваем падчас навядзення парадку ў прыдарожных палосах.

Лікбез

КАБ РЭЧЫ ВІРТУАЛЬНЫЯ НЕ ПЕРАЎТВАРЫЛІСЯ Ў ПРАБЛЕМЫ РЭАЛЬНЫЯ

або Што трэба ведаць пры набыцці тавараў праз інтэрнэт-магазіны

Як сведчыць практыка, апошнім часам усё больш спажыўцоў і ўсё часцей пачалі набываць розныя тавары ў інтэрнэт-магазінах. Карысць ад такога кроку, здавалася б, відавочная: на пошук патрэбнага ідзе значна менш часу, чым пры паходах па магазінах, сам працэс адбываецца ў больш камфортных умовах, выбраны тавар могуць даставіць у любое месца па жаданні пакупніка. Усё гэта сапраўды так. Але, як у любога медаля, у азначанага спосабу набыцця тавараў ёсць і іншы бок, магчыма, часам не вельмі прыемны для кліентаў. Прынамсі, тых з іх, хто не зусім дасведчаны ў прававых нюансах існавання і працы інтэрнэт-магазінаў. Не выпадкова ж апошнім часам па тэлебачанні вядомыя асобы беларускага шоу-бізнэсу праз невялікія ролікі праводзяць своеасаблівы спажывецкі лікбез сярод патэнцыяльных пакупнікоў: што трэба абавязкова ведаць, карыстаючыся паслугамі вышэйназваных інтэрнэт-магазінаў.

Сёння мы вырашылі пагаварыць аб гэтай праблеме больш падрабязна. Дапаможа нам у гэтым эксперт «Звязды» — *галоўны спецыяліст упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Святлана ВАЙЦЭХОЎСКАЯ*.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ШТО ЁСЦЬ ІНТЭРНЭТ-МАГАЗІН?

Напачатку важна разабрацца: чым жа ўласна з'яўляецца інтэрнэт-магазін, ці любы сайт, на якім маецца пэўная інфармацыя пра тавар і прадаўца, можна аднесці да тэмы нашай гутаркі?

— Інтэрнэт-магазін — гэта сайт, які забяспечвае продаж праз інтэрнэт з выкарыстаннем электроннага каталога ці іншага спосабу прадстаўлення прадукцыі і які ўтрымлівае адпаведную патрабаванням заканадаўства інфармацыю або зместкі пра суб'ект гандлю і тавары, — тлумачыць Святлана Віктараўна.

Адной з памылак спажыўца пры набыцці тавару праз інтэрнэт-магазін з'яўляецца купля яго праз сайты, размешчаныя ў даменнай прасторы іншай дзяржавы (напрыклад, com ці ru). У гэтым выпадку інфармацыю пра ўладальніка (прадаўца) такога сайта, калі яна на ім адсутнічае, атрымаць вельмі праблематычна. Даменнае імя такіх сайтаў, як правіла, зарэгістравана на стараннюю асобу, якая тавар спажыўцу не прадавала.

Большасць сайтаў, якія прысутнічаюць у беларускім сегменце сеткі інтэрнэт і што належаць суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці, якія займаюцца рознічным гандлем, — не што іншае, як «вітрына» для сваіх тавараў, рэкламная аб'ява. Спажыўцу прапануецца набыць тавар, аформіўшы свой заказ адным з наступных спосабаў: патэлефанаваць па пэўным нумары, указаным на сайце, або «загрузіць тавар у кошык» і адправіць паведамленне на электронны адрас, што ўказаны на гэтым сайце, і пры дастаўцы тавару разлічыцца з кур'ерам. Такія сайты з'яўляюцца інтэрнэт-магазінамі. У дадзеным выпадку даменнае імя такога магазіна павінна быць зарэгістравана суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, пацвярджана дакументам, які выдаецца Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, даменнае імя павінна быць указана ў ліцэнзіі на рознічны гандаль (уключаючы алкагольныя напоі і тытунёвыя вырабы) і грамадскае харчаванне як месца рэалізацыі тавару.

ТЫПОВАЯ ПАМЫЛКА СПАЖЫЎЦОЎ

Тут варта прыпыніцца і зрабіць важнае адступленне, якое мае дачыненне да вышэйпералічаных звестак.

Паводле слоў Святланы Вайцэхоўскай, аналіз зваротаў грамадзян засведчыў: адной з памылак спажыўца пры набыцці тавару праз інтэрнэт-магазін з'яўляецца купля яго праз сайты, размешчаныя ў даменнай прасторы іншай дзяржавы (напрыклад, com ці ru). У гэтым выпадку інфармацыю пра ўладальніка (прадаўца) такога сайта, калі яна на ім адсутнічае, атрымаць вельмі праблематычна. Даменнае імя такіх сайтаў, як правіла, зарэгістравана на стараннюю асобу, якая тавар спажыўцу не прадавала. У такой сітуацыі практычна немагчыма даказаць факт продажу спажыўцу тавару з дадзенага сайта, калі рэальны прадавец яго адмаўляе.

Пры разглядзе Міністэрствам гандлю зваротаў грамадзян аб набыцці няякасных тавараў праз сайты, размешчаныя ў даменнай прасторы com ці ru, было ўстаноўлена, што іх рэалізацыя адбывалася фізічнымі асобамі, якія не былі зарэгістраваны ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. У дачыненні да такіх асобаў, калі яны ажыццяўлялі сваю дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, былі прыняты меры адміністрацыйнага ўздзеяння з боку прававахоўных і падатковых органаў. А вось што датычыцца падманутых спажыўцоў... Ім было рэкамендавана па абарону сваіх правоў звярнуцца ў суд. Чаму? Пад дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» трапляюць толькі адносіны паміж грамадзянамі і суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці, і забяспечыць першым дасудовую абарону не ўяўляецца магчымым...

КАЛІ ПРОСТА РЭКЛАМА — ГЭТА САЙТ

Што ёсць інтэрнэт-магазін — разабраліся. Якія могуць быць іншыя варыянты і ў чым іх адрозненне?

Калі сайт утрымлівае толькі рэкламную інфармацыю пра тавар у выглядзе ўказання яго кошту, апісання, калі маюцца фотаздымкі тавару, водгукі пакупнікоў і г.д., а таксама ўказаны толькі найменне і адрас гандлёвага аб'екта, дзе можна набыць дадзены тавар (без указання нумара тэлефона і іншай кантактнай інфармацыі), такі інтэрнэт-сайт не з'яўляецца інтэрнэт-магазінам.

— У дадзеным выпадку не патрабуецца ўказання даменнага імя ў ліцэнзіі на рознічны гандаль (уключаючы алкагольныя напоі і тытунёвыя вырабы) і грамадскае харчаванне. Каб пазбегнуць непаразумненняў са спажыўцамі суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці, якія размяшчаюць на сайтах толькі інфармацыйна-рэкламныя звесткі, мэтазгодна рабіць на сайце аднаку, маўляў, дадзены сайт не з'яўляецца інтэрнэт-магазінам і для набыцця тавару, што рэкламуецца, неабходна звяртацца па адрасе, які тут і ўказаны, — кажа галоўны спецыяліст упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай міністэрства Святлана Вайцэхоўская.

КАБ НЕ БЫЛО Ў БУДУЧЫМ ПРЭТЭНЗІЙ

Пра плюсы набыцця тавараў праз інтэрнэт-магазіны мы сказалі ў самым пачатку. Каб не сутыкнуцца з мінусамі — а віртуальнасць часам ставіць перад спажыўцом такое пытанне рубам — варта запомніць некалькі нескладаных парад.

— Самае галоўнае: пры набыцці тавараў па ўзорах праз інтэрнэт-магазін за пакупніком захоўваюцца ўсе правы, гарантаваныя Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў», — адназначна падкрэслівае Святлана Віктараўна.

Самае галоўнае: пры набыцці тавараў па ўзорах праз інтэрнэт-магазін за пакупніком захоўваюцца ўсе правы, гарантаваныя Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўца».

Набываючы тавар праз інтэрнэт-магазін, каб не былі парушаны вашы правы, запомніце:

— набываць яго лепш праз інтэрнэт-магазіны, размешчаныя ў прасторы нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт, г. зн. зоне by;

— афармляючы заказ, трэба абавязкова пераканацца на сайце наяўнасць неабходнай інфармацыі, а канкрэтна:

— пра суб'ект гандлю — найменне арганізацыі (прозвішча, імя, імя па бацьку для індывідуальных прадпрымальнікаў), юрыдычны адрас, пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі (для індывідуальных прадпрымальнікаў), інфармацыя пра нумар ліцэнзіі, тэрмін яе дзеяння, дзяржаўны орган, які выдаў ліцэнзію, кантактны нумар тэлефона, рэжым працы;

— пра тавар — найменне тавару, яго цана і ўмовы аплаты, гарантыйны тэрмін (калі ён устаноўлены), тэрмін дастаўкі тавару, цана і ўмовы аплаты дастаўкі;

— іншая інфармацыя пра прадаўца і тавар можа быць даведзена прадаўцом у вусной форме.

НЕ САРОМЕЙЦЕСЯ ЎСЁ ПРАВЯРАЦЬ!

Але і гэта яшчэ не ўсё. Выбар зроблены, заказ — таксама (дарэчы, адмовіць у прыняцці заказу вам не могуць, паколькі дадзены дагавор куплі-продажу з'яўляецца публічным, адпаведна, умовы аднолькавыя для ўсіх), вы чакаеце дастаўкі тавару.

Падчас дастаўкі ў абавязковым парадку праверце:

— наяўнасць у прадаўца дакумента на права продажу тавару (адрас інтэрнэт-магазіна павінен быць указаны ў ліцэнзіі, з арыгіналам ці копіяй — афармленай ва ўстаноўленым парадку, — якой прадавец абавязаны азнаёміць спажыўца па яго запатрабаванні);

— якасць тавару (камплектнасць, наяўнасць знешніх пашкоджанняў, працаздольнасць, бяспека).

Прадавец, у сваю чаргу, павінен перадаць пакупніку:

— тавар, які цалкам адпавядае яго ўзору ці апісанню, якасць якога адпавядае інфармацыі, прадастаўленай пакупніку пры заключэнні дагавора, а таксама інфармацыі, даведзенай да яго ведама пры перадачы тавару, па запатрабаванні пакупніка павінен азнаёміць яго з дакументамі, што сведчаць якасць і бяспеку тавару;

— тэхнічны пашпарт на тавар;

— інструкцыю па эксплуатацыі;

— касавы чэк ці іншы дакумент, што пацвярджае куплю.

І апошняе — параўнайце інфармацыю, атрыманую на сайце праз інтэрнэт-магазін, з інфармацыяй у дакументах на набыты тавар (тэхнічны пашпарт, гарантыйныя талоны), у якіх у абавязковым парадку павінна быць адзнака пра прадаўца (найменне, кантактны тэлефон, пячатка прадаўца — калі апошняя маецца). Такія адзнакі, як проста імя прадаўца і нумар яго мабільнага тэлефона на ўказаных дакументах не дапускаюцца, паколькі ў выпадку выяўлення недахопаў потым часам цяжка ўстанавіць прадаўца. Яшчэ адным з асноўных парушэнняў правілаў гандлю з'яўляецца адсутнасць інфармацыі аб сэрвісных цэнтрах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГІСТОРЫЯ ПА ТЭМЕ

Калега з месяц таму праз інтэрнэт-магазін набыла лічбавы дыктафон за 300 тысяч рублёў. Пакуль ён працаваў, пра гарантыйны талон і не згадвала. Калі ж дыктафон выйшаў са строю, высветлілася, што ў ім на звычайным штампе ўказана толькі найменне прадаўца і мабільны нумар яго тэлефона. Ды і талон быў афармлены абы як, прыгадала, што кур'ер прапанаваў на развітанне ёй самой яго запоўніць. На самім сайце быў змешчаны толькі адрас для паштовых адпраўленняў і той жа нумар мабільнага... Адным словам, давялося пахвалявацца і пабегаць паміж прадаўцом і сэрвісным цэнтрам. У майстэрні віну за паломку дыктафона ўсклалі на пакупніка і прапанавалі дзяўчыне аплаціць рамонт. Вырашыла не даказваць сваю невінаватасць, асабліва з такім «ліпавым» гарантыйным талонам і адсутнасцю на руках касавага чэка. Палічыла, што лепш зберагчы свой час і не псаваць свае нервы.

РЫХТУЙ «САНІ» ЛЕТАМ

Гэтай народнай мудрасцю, як высветліла карэспандэнт «Звязды» падчас рэйду з інспектарам ДАІ Савецкага РУУС горада Мінска, кіруюцца далёка не ўсе вадзіцелі.

Падчас агульнарэспубліканскай дэкады «Дзяржтэхагляд».

Калі мінчанін Віталь своечасова прайшоў тэхагляд, памяняў летнія шыны на зімовыя і сустракае зіму ў поўным узбраенні, то яго калега — вадзіцель з Заслаўя, павінен перад тым, як пераняць яго прыклад, заплаціць штраф.

На маё пытанне, у чым прычына, засмучаны затрыманы адказаў, што спачатку ленаваўся гэтым займацца, тым больш час дазваляў. А пасля грошай лішніх не было. Вось і дацягнуў да апошняга.

А на што цяпер спадзяваліся?

— Думаў, што пранясе...

Невялікі працэнт транспарту праходзіць тэхагляд своечасова. Толькі ў сталіцы за дзесяць месяцаў гэтага года за кіраванне аўтамабілем з тэхнічнымі непаладкамі ці без пройдзенага тэхагляду да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты больш як 20 тысяч вадзіцеляў.

— Кожная, нават, на першы погляд, самая нязначная, тэхнічная непаладка можа стаць прычынай ДТЗ з сур'ёзнымі наступствамі. А тым больш восенню і зімой, калі надвор'е вельмі непрадказальнае, — адзначае **інспектар ДАІ Савецкага РУУС Андрэй ДЗЯРКАЧ.** — У сувязі з гэтым Дзяржаўтаінспекцыя сумесна з прадстаўнікамі транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь і УП «Белтэхагляд» напрыканцы года праводзіць агульнарэспубліканскую дэкаду «Дзяржтэхагляд».

Падчас рэйду інспектар ДАІ спыніў шмат вадзіцеляў грузавых аўтамабіляў, уладальнікі якіх — як дзяржаўныя, так і прыватныя прадпрыемствы.

— Хто нясе адказнасць за несвоечасова пройдзены тэхагляд — вадзіцель ці ўладальнік аўтамабіля? — пацікавілася я.

— Згодна з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях, за эксплуатацыю транспартнага сродку, які не прайшоў дзяржаўны тэхнічны агляд, адміністрацыйную адказнасць нясе вадзіцель. Калі прадпрыемства, на якім ён працуе, не ў стане аплаціць тэхагляд, то вадзіцель мае поўнае права адмовіцца сесці за руль.

— А калі вадзіцель не змог прайсці тэхагляд своечасова па ўважлівай прычыне?

— У Кодэксе таксама гаворыцца, што за «непрадстаўленне транспартнага сродку без уважлівай прычыны ва ўстаноўлены тэрмін для дзяржаўнага тэхнічнага агляду выносіцца папярэджанне ці накладанне штрафу ў памеры да дзвюх базавых велічынь». Уважлівая прычына паняцце адноснае, таму да кожнага парушальніка прымяняем індывідуальны падыход. Усё залежыць ад сітуацыі. Калі бачым, што чалавек усведамляе цалкам сваю віну ці не прайшоў тэхагляд па аб'ектыўнай прычыне (хваробу, напрыклад), то ў першы раз інспектар можа абмежавацца папярэджаннем на словах ці мінімальным штрафам.

— Як змагаецеся з фіктыўным тэхаглядам?

— Выяўляем транспартныя сродкі, якія нават па знешнім выглядзе, нягледзячы на тое, што маюць пасведчанне аб пройдзеным тэхнічным аглядзе, не адпавядаюць вызначаным патрабаванням. Інфармуем аб гэтым работнікаў УП «Белтэхагляд», якія і прымаюць у дачыненні да станцый тэхагляду адпаведныя меры. Сустракаюцца і падробленыя штампы, якія сведчаць, што аўтамабіль прайшоў тэхагляд. Па такіх фактах узбуджаюцца крымінальныя справы.

— Кожны вадзіцель абавязаны перад наступленнем зімовага перыяду правесці і асабісты невялікі тэхагляд: праверыць шчыльнасць электраліту ў акумулятары, стан сістэмы асцяплення і вентыляцыі салона, — рэкамендуе **старшы інспектар аддзела рэгістрацыйна-экзаменацыйнай дзейнасці і тэхнічнага нагляду УДАІ МУС Беларусі Сяргей КАМАР.** — Часта зімой можна ўбачыць аўтамабіль, шкло якога дрэнна адтайвае, што, у сваю чаргу, змяншае вугал агляду вадзіцеля, які не можа паўнацэнна бачыць, што адбываецца збоку і ззаду. Гэта адбіваецца на бяспецы дарожнага руху (і за гэта прадугледжваецца адміністрацыйная адказнасць). Таму зімой абавязкова трэба карыстацца спецыяльнай незамярзаючай вадкасцю для шклоачышчальнікаў. А старыя шклоачышчальнікі лепш замяніць на новыя, бо зімой імі даводзіцца карыстацца значна часцей, чым улетку. Не забудзьцеся адрэгуляваць святло фараў, бо зімой рана цямнее і позна віднеецца, таму большую частку сутак вадзіцель рухаецца ў стане дрэннай бачнасці.

ЧАС МЯНЯЦЬ «АБУТАК»

У адрозненне ад тэхагляду, які з'яўляецца неабходнай працэдурай, замена летніх шынаў на зімовыя носіць рэкамендацыйны характар.

— Вадзіцель сам прымае рашэнне: ездзіць яму на летняй ці на зімовай гуме, — гаворыць **выконваючы абавязкі начальніка УДАІ МУС Беларусі Васіль БУЛЬБЯНКОЎ.** — Але калі на абледзянелай дарозе адбудзецца аварыя, а летняя гума стане асноўнай прычынай ДТЗ, то, безумоўна, у дачыненні да такога вадзіцеля будуць прынятыя больш жорсткія меры адміністрацыйнага ўздзеяння.

Паводле слоў **кансультанта адной з фірмаў — падаўца шын**, замена летняга «абутку» аўтамабіля на зімовы абыдзецца значна танней, чым рамонт «жалезнага каня» пасля аварыі. Акрамя таго, гэта пазбавіць вадзіцеля ад хваляванняў пры экстранным тармажэнні на слізкай зімовай дарозе перад раптоўна падразаючай іншамаркай. Многія пакупнікі аддаюць перавагу ўсесезоннай гуме. Яна мае свае плюсы: каштуе танней і адпадае патрэба два разы на год плаціць за шынамантаж. Але кожны вадзіцель павінен разумець, што адна і тая ж гума не можа валодаць адначасова якасцямі, неабходнымі як для зімы, так і для лета. Таму ў галалёд тармазны шлях усесезоннай гумы будзе істотна даўжэйшы. Значна горш, калі вадзіцелі ездзяць на розных шынах: на пярэднія колы ставяць зімовыя шыны, на заднія — летнія. З-за нераўнамернага счаплення з дарогай пры павароце колы, абутыя ў летнюю гуму, сарвуцца ў занос, што прывядзе да разваротy аўтамабіля на непрадказальную колькасць градусаў.

НЕ ШЫНАЙ АДЗІНАЙ

Падрыхтоўка да зімы не абмяжоўваецца толькі праходжаннем тэхагляду і заменай «абутку» аўтамабіля. Кожны вадзіцель павінен разумець, што бездакорная тэхнічная падрыхтоўка аўтамабіля не гарантуе яму бяспеку.

— Неабходнай умовай з'яўляецца і псіхалагічная падрыхтоўка вадзіцеля да ўдзелу ў дарожным руху ў зімовых умовах, бо 3/4 усіх ДТЗ адбываецца па яго віне, — адзначае **начальнік навукова-метадычнага і прававога аддзела УДАІ МУС Беларусі Анатоль СУШКО**. — Таму вадзіцель, рухаючыся ва ўмовах слізкага дарожнага пакрыцця, павінен трымаць значна большую дыстанцыю і тармазіць нашмат раней, чым на летняй дарозе. Акрамя таго, пры руху на такой дарозе нельга рабіць ніякіх рэзкіх маніпуляцый: паварочваць руль, націскаць на педаль газу і тормазу. Што датычыцца хуткасці, то зімой трэба рухацца на кіламетраў 10 павольней. Гэта яшчэ адзін крок насустрач бяспеці. І нарэшце, не ігнараваць патрабаванні дарожных знакаў, шчытоў з такімі надпісамі, як «Слізкая дарога», «Асцярожна, небяспечная зона!».

«ЭХ, ДАРОГІ...»

На днях Дзяржаўтаінспекцыя завяршыла ва ўсіх раёнах рэспублікі праверку гатоўнасці дарожных арганізацый да эксплуатацыі дарог у зімовы перыяд.

— Вынікі абнадзейваюць, — гаворыць **начальнік аддзела арганізацыі дарожнага руху УДАІ МУС Беларусі Юрый ТРАЯН**. — Амаль усе дарожныя арганізацыі, за рэдкім выключэннем, запасліся неабходнымі рэагентамі (акрамя пяску і солі, для больш эфектыўнага ўздзеяння на галалёд, па меры неабходнасці, будуць выкарыстоўваць хларыдныя матэрыялы і расолы), увялі ў строй спецыялізаваную снегаўборачную тэхніку. Усе, напэўна, бачылі табло, якія паказваюць тэмпературу паветра і дарожнага пакрыцця. Гэта цэлыя дарожна-вымяральныя станцыі, на якіх, акрамя таго, устаноўлены відэакамеры, якія дазваляюць адсочваць сітуацыю на дарогах у рэжыме рэальнага часу. Усяго такіх станцый па Беларусі каля 60. Размешчаны раўнамерна па ўсёй тэрыторыі краіны. Але пры гэтым відэаназіраннем ахоплена ўсё ж нязначная частка нашых дарог, таму мы ўскладаем спадзяванні на ўсіх удзельнікаў дарожнага руху. Просім, каб яны не пакідалі без увагі як снежныя заносы, так і калегу, які спрабуе ўласнымі сіламі рэанімаваць рухавік, які заглох. Тэлефон міліцыі — 102 — бясплатны для ўсіх абанентаў. Работнікі ДАІ адразу ж выедуць на дапамогу.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

ДАМАФОНЫ Ў «ЗОНЕ АДКАЗНАСЦІ» КАМУНАЛЬНІКАЎ

Установўка металічных дзвярэй з перамоўнымі ўстройствамі цяпер звычайная практыка. Да прыкладу, у сталіцы «закрытыя» амаль усе 22 тысячы пад'ездаў. Праўда, толькі палова з іх маюць дамафоны.

Як заўважыў генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Віктар Вараб'ёў, з іх абслугоўваннем у жыхароў нярэдка ўзнікалі праблемы. Паколькі здаралася, што складана было наладзіць кантакт з адпаведнай арганізацыяй, якая праводзіла ўстаноўку. Каб палепшыць сітуацыю, быў выдадзены спецыяльны загад Мінжылкамунгаса. У адпаведнасці з гэтым дакументам цяпер праводзіцца перазаключэнне «дамафонных» дагавораў. Раней яны падпісваліся паміж жыхаром і пэўнай арганізацыяй, а зараз падключаецца і трэці бок — у Мінску, да прыкладу, гэта раённыя жыллёвыя рамонтна-эксплуатацыйныя аб'яднанні. Паводле слоў Віктара Вараб'ёва, ЖРЭА здольныя гарантаваць насельніцтву дакладнае выкананне работ па абслугоўванні дамафонаў. Зразумела, што ўсе адпаведныя выдаткі павінны кампенсаваць са сваёй кішэні жыхары.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

МУЗЕЙ ВУЧЫЦЬ ЭКАНОМІІ

Музей энергазберажэння адзіны ў рэспубліцы такога накірунку. Ён адкрыты ў Гомелі і пакуль што налічвае больш за сто экспанатаў. Прычым даволі цікавых. Ад падсвечніка апошняй гомельскай графіні Ірыны Паскевіч да аўтаматычнай сістэмы асвятлення лесвічных пляцовак пры з'яўленні на іх чалавека. Дарэчы, музей — гэта праект школьнікаў горада.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Грандиозная распродажа Volkswagen

Какой человек не любит распродажи? Особенно, когда распродажа грандиозная. И уж тем более, когда речь идет об автомобилях Volkswagen.

Ноябрь-декабрь самое подходящее время для покупки автомобиля. По крайней мере, марки Volkswagen. Есть масса аргументов в пользу данного утверждения.

Во-первых, Volkswagen уже сказал «нет» очередям. Сегодня каждый желающий может выбрать любой автомобиль из широкого модельного ряда Volkswagen. Это уникальная ситуация, ведь в 2009 году, судя по последним нововведениям в законодательстве, новые автомобили можно будет приобрести только под заказ со всеми вытекающими последствиями: большая предоплата, большие сроки поставки и более высокая цена.

Во-вторых, сегодня сроки поставок автомобилей в индивидуальной комплектации никогда ранее не были настолько короткими. Опытные менеджеры дилерской сети Volkswagen подберут для вас автомобиль в оптимальной комплектации, который уже находится на пути в Беларусь. А менеджеры по финансовому сервису сделают лучшее предложение по автокредиту.

И, **самый веский аргумент** грандиозной распродажи: таких цен на новые автомобили Volkswagen Беларусь еще не знала! Например, дизельный Volkswagen Passat B6 1.9 TDI в супер комплектации сегодня стоит столько же, сколько и 2-3-летний автомобиль с пробегом того же класса. Фактически, покупка автомобиля Volkswagen сегодня становится лучшим вложением капитала в это непростое время.

Предложение по распродаже распространяется на весь модельный ряд Volkswagen, имеющийся на складе.

Более подробная информация у официальных дилеров Volkswagen:

Минск: «Атлант-М Сухарево», ул. Шаранговича, 22, тел. (017) 206 0 206.
«Атлант-М Машиностроителей», ул. Машиностроителей, 26, тел. (017) 3 400 400.
Гомель: «НТС», ул. Ефремова, 23 тел. (0232) 62 50 50.
Брест: «Атлант-М Запад», ул. Старозадворская, 2, тел. (0162) 42 42 42.
Гродно: «Гродноавтосервис», пр. Космонавтов, 68, тел. (0152) 75 74 00.
«Автофан», ул. Издательская, 26, тел. (0152) 52 10 94.
Могилев: «Автотраст», пр. Пушкинский, 40Д, тел. (0222) 46 99 65.

УЧСП «Автофан» № 44010/0290062 Гродненским ГИК 13.12.06 12.12.11 УНП 590004205 , **ОАО «Гродноавтосервис»** № 44010/0048498 Гродненским ГИК 03.10.07 02.10.12 УНП 500034363 , **СООО «Атлант-М Восток»** № 50000/0298991 Минским ГИК 17.08.06 17.08.11 УНП 190660583 , **ИП «Автохаус Атлант-М»** № 62360/0309853 Минским РИК 26.07.07 26.07.12 УНП 600430524 , **ИЧУПТП «Атлант-М Запад»** № 14010/0412414 Брестский ГИК 26.02.08 21.02.13 УНП 800008069 , **ООО «НТС»** № 34010/0244488 Гомельским ГИК 05.10.05 05.10.10 УНП 400213102 , **ЧПТУП «Автотраст»** № 74010/0106748 Могилевским ГИК 20.07.05 20.07.10 УНП 790254846.

Сёння, дарагія нашы чытачы, пагаворым пра грыбы. Думаю, кожны беларус можа лічыць сябе буйным спецыялістам у гэтай галіне, і будзе мець рацыю. Грыбы вельмі карысныя, аднак прыгаванне да 100 градусаў, калі мы іх варым, смажым і марынуем, разбурае ўсе іх лекавыя ўласцівасці. Тое ж самае адбываецца і з замарожанымі грыбамі. Раней на Русі не хварэлі на рак. Усю доўгую зіму грыбы складалі значную частку рацыёну, але захоўвалі іх засоленымі ў сырым выглядзе ў бочках. У грыбах шмат серы, полісахарыдаў, таму менавіта ім належыць галоўнае месца ў барацьбе з анкалагічнымі захворваннямі. Гэта значыць практычна ў кожным доме трымалі магутны супрацьанкалагічны сродак. Колькасць бялку ў сушаным грыбе — да 30 працэнтаў, гэта значыць больш, чым у мясе. Але самае вялікае значэнне мае лецыцін, які змяшчаецца ў грыбах і перашкаджае адкладанню халестэрыну. Таму гриб — прадукт, які дапамагае прадухіліць атэрасклероз. З-за сваёй высокай каларыйнасці грыбы лічацца даволі цяжкай ежай. Арганізм засвойвае іх нават больш марудна, чым мяса. Таму пры ўжыванні грыбоў трэба памятаць, што яны далёка не дыетычны прадукт.

Салата «Птушачка» з грыбамі

На 3 порцыі вазьміце: *0,5 курынай грудкі, 200 г грыбоў, 0,5 бляшанкі кукурузы, 5—6 ст. лыжак смятаны ці маянэзу, 1 невялікі зубок часнаку, зяленіва, соль.*

Грыбы парэзаць паўпласцінкамі і абсмажыць на моцным агні пры памешванні да зарумянвання. Падсаліць і зняць з агню. Астудзіць. Курыную грудку адварыць у невялікай колькасці падсоленай вады з лаўровым лістом і перцам горошкам. Гатовую грудку злёгку астудзіць і разабраць на валокны (пры жаданні можна проста дробна парэзаць). Часнок працісnуць праз прэс. Змяшаць курыцу, грыбы, кансерваваную кукурузу, часнок і дробна парэзанае зяленіва. Заправіць смятанай ці маянэзам. Пры неабходнасці яшчэ дасаліць.

Рагу з белых грыбоў і гародніны

Нам спатрэбіцца: *500 г грыбоў, 5 бульбін, 2 ст. лыжкі тамат-пюрэ, 2 галоўкі рэпкавай цыбулі, 1 морква, 1 корань пятрушкі, 1 рэпа, 2 памідоры (можна без іх), 3 ст. лыжкі алею, 1/2 ст. лыжкі мукі, зяленіва пятрушкі, кроп, соль, перац гарошкам, лаўровы ліст.*

Свежыя грыбы адварыць, нарэзаць буйнымі кавалачкамі (дробныя грыбы не рэзаць) і абсмажыць на алеі, пасля заліць гарачым грыбным адварам, пасаліць, дадаць тамат-пюрэ, чорны перац гарошкам, лаўровы ліст і тушыць 10 хвілін.

Падсмажыць на алеі нарэзаную кружочкамі цыбулю і нарэзаныя долькамі карані, рэпу і бульбу. Падсмажаную да залацістага колеру муку развесці ахалоджаным грыбным адварам і разам з падрыхтаванай агароднінай і бульбай дадаць да грыбоў. Усё добра перамяшаць і працягваць тушыць на слабым агні да поўнай гатоўнасці прадуктаў. Пад канец тушэння дадаць (калі ёсць) нарэзаныя долькамі свежыя памідоры і даць закіпець. Гатовае рагу падаваць у глыбокім блюдзе, пасыпаўшы нарэзаным зяленівам пятрушкі і кропу.

Біточкі грыбныя

Вазьміце: *500 г свежых грыбоў, 40 г белага хлеба, 1 галоўку цыбулі, 1 яйка, 1 ст. лыжку паніровачных сухароў, 2 ст. лыжкі алею, соль, зяленіва.*

Грыбы перабраць, ачысціць, прамыць, апусціць у кіпячую ваду на 2-3 хвіліны, двойчы прапусціць праз мясарубку, дадаўшы замочаны ў малацэ хлеб і цыбулю. У атрыманую масу дабавіць яйка, соль, старанна ўсё перамяшаць, сфарміраваць біточкі, запаніраваць іх у сухарах і абсмажыць у раслінным масле.

Біточкі падаць з бульбяным пюрэ, пасыпаўшы іх дробна пасечаным зяленівам.

Салата з грыбоў з журавінамі

Нам спатрэбіцца: *100 г сушаных грыбоў, 300 г бульбы, 100 г рэпкавай цыбулі, 100 г журавінаў, 100 г маянэзу, соль, зяленіва.*

Бульбу адварыць у «мундзірах», ачысціць ад скуркі, нарэзаць кубікамі. Сушаныя грыбы прамыць, заліць на 2-3 гадзіны халоднай вадой, адварыць у гэтай жа вадзе, дробна нарэзаць. Рэпкавую цыбулю нарэзаць колцамі. Падрыхтаваныя прадукты змяшаць, дадаць журавіны, соль, перац, заправіць маянэзам і старанна перамяшаць. Гатовую салату ўпрыгожыць зяленівам, журавінамі.

Шампіньёны фаршыраваныя бульбяным пюрэ

Вазьміце: *600 г шампіньёнаў, 2 ст. лыжкі алею, 1 цыбуліну, 2 шклянкі бульбянога пюрэ, 2-3 марынаваныя агурочкі, перац, соль, мускатны арэх — на смак.*

Шампіньёны ачысціць і вымыць. Шапачкі (цалкам) патушыць у алеі, ножкі грыбоў дробна пасячы і патушыць з цыбуляй. Змяшаць тушаныя ножкі шампіньёнаў з бульбяным пюрэ, пасаліць, папярчыць, дадаць мускатны арэх. Напоўніць гэтай сумессю шапачкі. Зверху вылажыць тонкі скрылёк марынаванага агурка.

Тэлесеткі

«УДЖАЛІЛІ» — І ПЕРАМАГЛІ!

На міжнародным дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне-2008», які прайшоў 23 лістапада ў Лімасоле (Кіпр), перамогу па суме галасоў публікі і журы атрымала грузінскае трыа «Bzikebi». Такім чынам, як жартуюць некаторыя замежныя назіральнікі, Грузіі ўдалося ўзяць рэванш за дарослае «Еўрабачанне».

На другім месцы па суме балаў апынулася ўкраінская выканаўца Вікторыя Петрык, трэці радок у выніковай табліцы дастаўся прадстаўніцы Літвы Эгле Юргайцітэ. Беларускае трыа — Дар'я Надзіна, Аліна Молаш і Карына Жуковіч — з песняй «Сэрца Беларусі» заняло 6-е месца з 15 краін-удзельніц.

«Bzikebi» (у перакладзе — «Восы») аказаліся не толькі самымі юнымі ўдзельнікамі — ім усяго па 10 гадоў, але і самымі крэатыўнымі. Бо ў песні з назвай «Bzzz» слоў няма ўвогуле, толькі імітацыя гудзення пчол ды вос. Але затое ёсць завадны, жвавы рытм, нясложная вакальныя партыі, варыяцыі на класічную тэму «Палёт чмяля» Рымскага-Корсакава і нават нацыянальны каларыт — фрагменты народнай мелодыі. Мабыць, усё гэта ў сукупнасці з прыгожымі касцюмамі, танцавальнымі элементамі, а найперш з дзіцячай непасрэднасцю і адкрытасцю ўдзельнікаў і дапамагло грузінскаму трыа заваяваць перамогу. Юныя выканаўцы набралі 154 балы, атрымаўшы пры гэтым 8 максімальных адзнак — ад Бельгіі, Кіпра, Нідэрландаў, Літвы, Расіі, Украіны, Балгарыі і Арменіі.

У беларусак, якім папярэдняе глядацкае інтэрнэт-галасаванне прагназавала 3-е месца, у выніку 86 балаў і, на жаль, ніводнай «дванаццаткі». Кіраўнік трыа Святлана Стацэнка звязвае гэты вынік са змяненнем правілаў галасавання і ўвядзеннем журы, але таксама і з тым, што ўзровень дзіцячага конкурсу з кожным годам прыкметна расце. Майстэрства сёлетніх канкурсантаў адзначылі і пераможцы конкурсаў 2007 і 2005 гадоў — Аляксей Жыгалковіч і Ксенія Сітнік. «Не ведаю, ці ўдалося б мне перамагчы, калі б я выступала цяпер у гэтым конкурсе», — прызналася Ксенія падчас абмеркавання вынікаў дзіцячага «Еўрабачання-2008».

Зрэшты, у дзіцячым конкурсе, у адрозненне ад дарослых, празмерна палітызаваных, прайграўшых няма — ёсць адно агульнае свята, пасля якога ва ўсіх удзельнікаў з'яўляюцца новыя сябры. Шанц прыняць гэта свята ёсць у тым ліку і ў Беларусі, якая падала ў аргкамітэт заяўку на правядзенне дзіцячага «Еўрабачання» ў 2010 годзе. Налета ж конкурс, нагадаем, будзе праходзіць у Кіеве.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота з афіцыйнага сайта конкурсу www.junioreurovision.tv.

Суб'ектыў

ПАДКУПІЛА ДЗІЦЯЧАЯ НЕПАСРЭДНАСЦЬ

Сёлетні дзіцячы конкурс «Еўрабачанне-2008», на маю думку, у гледачоў і журы не выклікаў вялікага «галаўнога болю» пры вызначэнні лідараў і пераможцаў.

Усіх удзельнікаў можна падзяліць на дзве групы: тых хто заставаўся на сцэне дзецьмі са сваёй непасрэднасцю і тых хто хацеў пераняць дарослых.

Як «дарослыя» выступалі прадстаўнікі Бельгіі, Балгарыі, Сербіі, Нідэрландаў... а вось дзеці з Грузіі, Украіны, Літвы, Мальты падкупілі мастацкай самабытнасцю і дзіцячай наіўнасцю.

Лідары конкурсу вызначыліся з пачатку галасавання і да канца не здавалі сваіх пазіцый. Стаяла толькі пытанне — хто пераможа — Грузія ці Украіна?

Грузінскія «Пчолкі» гудзелі-гудзелі і занялі першае месца, а Вікторыя Петрык з Украіны сваёй песняй «Матросы» таксама скарыла гледачоў.

Перавага і адрыў грузінскіх і ўкраінскіх юных спевакоў ад астатніх быў істотным — у Грузіі — 154, ва Украіны — 135, а Літва, якая заняла трэцюю прыступку, — толькі 102 балы.

Ад паднятай узроставай планкі выканаўцаў сёлетні конкурс відовішчна прайграў. Маленькія дзесяцігадовыя дзеці з Грузіі выгадна вылучаліся на фоне іншых удзельнікаў — мы бачылі дзяцей. А вось дзяўчаткі з Нідэрландаў — хоць на выданне.

А зараз паглядзім на нашых, бо пра Дар'ю, Аліну і Карыну многа гаварылася і пісалася яшчэ задоўга да конкурсу на Кіпры. Складвалася ўражанне, што дзяўчатак чакае трыумф і чарговы еўраконкурс будзе нашым.

Пасля конкурсу наш каментатар у прамым эфіры заявіў, што ў нас усё ўдалося, выступілі годна, а адносна выніку, то гэта не так і важна.

Як для каго, а мне думаецца, што пасля мінулагоднік перамог сёлетняе выступленне можна лічыць правальным. Але да дзяўчынак прэтэнзій няма. Хоць яны тут самыя галоўныя, толькі ні для каго не сакрэт, што за імі стаяць дарослыя. Хіба без іх ведама вырашалася, якую песню спяваць? Кожная з дзяўчатак таленавітая, але стварыць эфектнае трыа, лічу, не ўдалося.

Выступленне атрымалася плакатным. Склалася ўражанне, што дзяўчаткі прыйшлі на стадыён падтрымліваць любімую каманду.

Узнёслыя словы мы пачулі, але калі ў песні неаднаразова гучыць слова Беларусь, то яно павінна быць напоўнена мастацкім зместам — па форме і духу, а дзецям гэта аказалася не пад сілу. Парыў і жаданне зразумець можна, але ж... на-на-на-а-а... — гэта не Беларусь.

Мастацкі і сцэнічны бок беларускага трыа з'яўляўся нейкім асарці і аказалася, што ў песні «Сэрца Беларусі» нічога беларускага няма — пра мову гаворка нават не ідзе. А назва песні да многага абавязвала.

Дзеці павінны заставацца дзецьмі.

«На палубе матросы, а ў небе альбатросы», — спявала ўкраінская дзяўчынка, і ў гэтых, здавалася б, нейтральных словах было столькі апантанасці і сілы, што мала хто мог застацца раўнадушным, а грузінскае трохгалосае гудзенне-спяванне хіба не ацанілі гледачы? Падкупіла непасрэднасцю і юная спявачка з Літвы.

У простым і натуральным многа непадробленай прыгажосці. Магчыма, песенька, напрыклад, «Мокрыя вераб'і» пры адпаведнай пастаноўцы была б чарговым шэдэўрам на конкурсе і склала б дастойную канкурэнцыю грузінскаму трыа «Bzikebi».

Не будзем толькі забываць, што ўсе гэтыя конкурсы не болей як шоу. І калі ўступілі на гэты раз, то ёсць магчымасць здзівіць свет у будучым. У нас яшчэ ўсё наперадзе.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ПОСПЕХІ ЗВЯЗДОЎЦАЎ

Як паведаміў нам галоўны сакратар 42-га першынства Беларусі па завочных шашках-64 Міхаіл Гельман, чэмпіёнамі рэспублікі сталі майстры Анатоль Рогач з Вілейкі (вышэйшая ліга, класічная гульня), Аляксандр Лясхоўскі з Жодзіна (вышэйшая ліга, сучасная версія) і кандыдат у майстры Пётр Шклудаў з Наваполацка (першая ліга, класічная і сучасная версіі).

Турнір жа кандыдатаў у майстры спорту выйграў Леанід Давідовіч з Полаччыны.

Наступныя магчымасці ў партыі заслугоўваюць вашай увагі:



БЕЛЫЯ (К. Барэль): a1, a3, c1, c3, f2, g1, g3, h2 (8). ЧОРНЫЯ (М. Суздалёў): a7, b8, d8, e5, g5, g7, h6, h8 (8).

Белыя падрыхтавалі пастку на ход 1. ... bc7, якую адшукайце самастойна ў якасці задання № 11 класіфікацыйнага конкурсу «Пагода ў доме»-5. У партыі ж было 1. ... gh4 2. cb2 hg5 3. cd4 4. b:d4 gf6 5. dc5 fe5 6. ab2 de7? (нічыю даваў 6. ... dc7) 7. bc3. Чорныя разлічвалі пайсці 7. ... bc7, але перадумалі, бо заўважылі кінжальны ўдар белых, які зрабіце за іх самі ў рамках нашага бліца-41/6. Таму замест 7. ... bc7? яны згулялі 7. ... gf4, аднак пасля 8. cb4 ef6 9. cd6 10. g:g7 11. bc5 прайгралі пазіцыйна.

Па-за конкурсам разгледзьце і такую сітуацыю, якая ўзнікла ў другой партыі тых жа супернікаў:

БЕЛЫЯ (М. Суздалёў): a5, c3, d2, дамка e5 (4). ЧОРНЫЯ (К. Барэль): a3, b4, c7, дамка g1 (4). Ход і выйгрыш чорных.

Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рубрыка «Шашкі».

Дарэчы, Канстанцін Барэль узначальвае калектыў Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, на прызы якога мы праводзім конкурсы «Пагода ў доме». Як бачым, у вольны час ён захапляецца старадаўняй гульнёй і даволі паспяхова. У гэтым чэмпіянаце краіны ў першай лізе заваяваў сярэбраны медаль па класічных шашках і бронзавы — па сучаснай іх версіі і перайшоў у вышэйшую лігу, з чым мы яго і віншуем. І яшчэ нам прыемна адзначыць, што начальнік электрычных сетак Вілейскага раёна Анатоль Рогач і інжынер-аператар тэхналагічнай установкі ААТ «Нафтан», майстар па шашачнай кампазіцыі Пётр Шклудаў з'яўляюцца нашымі канкурсантамі. Як яны самі пішуць, звяздоўскія конкурсы дапамагаюць ім быць у спартыўнай форме.

ЗАДАЧЫ ЎКРАІНЦА

Для аматараў сталеткак наш чытач з Украіны Уладзімір Рычка даслаў у рэдакцыю свае новыя задачы. Яны зацікавяць вас сваім механізмам запірання фігур:



№ 1. БЕЛЫЯ: 27, 31, 32, 34, 45, дамка 30 (6). ЧОРНЫЯ: 25, 43 (2).

Замкнуць простую чорных на палях 25, 35 і 45: 28 (48 А) 23, 21, 34#. А (49) 35, 27, 49, 44 (35 В) 45-40#. В (34) 45-40, 50#.

№ 2. БЕЛЫЯ: 12, 13, 21, 28, 29, 43, дамкі 9, 15, 23, 35 (10). ЧОРНЫЯ: 4, дамка 45 (2).

Заблакіраваць простую чорных на 4 і 15: 23-10 (16 А) 12-8, 40, 2, 13#. А (49) 15-24, 9-20, 7, 24#.

№ 3. БЕЛЫЯ: 9, 13, 18, 37, 42, дамкі 15, 25, 38, 46 (9). ЧОРНЫЯ: 4, дамка 47 (2).

Заданне тое ж самае, што і ў № 2: 38-20 (1 А) 34, 29, 10#. А (2) 13, 10, 9, 24, 25-20#.

№ 4. БЕЛЫЯ: 8, 12, 14, 21, 22, 38, дамкі 1, 5, 20, 27, 46 (11). ЧОРНЫЯ: 3, дамка 9 (2).

Пазбавіць простую чорных хадоў на палях 3 і 36: 36 (49 А) 6, 32, 5-10, 6-22, 9#. А (16) 6, 7, 38, 37, 11, 47, 26, 31, 46-41#.

Чакаем вашых водгукаў!

Фонд «Минскоблгосимущество»

26 декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5

ПРОВОДИТ АУКЦИОН

с условиями по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности поселка Плещеницы, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания, составляющих единый предмет аукциона

На аукционные торги выставляется:

Здание учебного класса 4/149 (инв. № 601/С-13923), расположенное по адресу: Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», 1989 года постройки, общей площадью 721,6 кв. м. Одноэтажное, фундамент — железобетонные столбы, стены — железобетонные плиты, кирпичные, перекрытие — железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, полы — бетонные плиты, электроснабжение — открытая электропроводка, вентиляция естественная, и **право заключения договора аренды земельного участка**, площадью 0,2115 га, сроком на 99 лет, предоставленного для обслуживания и эксплуатации недвижимого имущества.

Условия использования недвижимого имущества: организация производства с созданием не менее десяти рабочих мест в течение 6-ти месяцев со дня перехода права собственности на здание.

Начальная цена предмета аукциона 69 607 465 рублей (в том числе: недвижимое имущество — 64 592 800 рублей и право заключения договора аренды земельного участка — 5 014 665 рублей).

Сумма задатка предмета аукциона 6 000 000 руб.

Продавец имущества: Плещеницкий поселковый исполнительный комитет, Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, ул. им. В.И. Ленина, 7, тел. (801774) 71435, 71035.

Арендодатель земельного участка: Логойский районный исполнительный комитет.

Здание учебного класса 4/149 имеет **обременение** в виде договора аренды сроком до 31 мая 2009 года.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заявление на участие в аукционе, заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон, по формам, утвержденным постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов»;

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом — доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем — нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическом лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина — нотариально удостоверенная доверенность.

Логойский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан:

1. В течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка — договор аренды земельного участка.

2. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 30 декабря 2008 года.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел.: 224 57 09, 500 47 10.

Последний день подачи заявок: 23 декабря 2008 г. до 16.00.

УНН 600181684

Фонд «Минскоблгосимущество»

26 декабря 2008 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5

ПРОВОДИТ АУКЦИОН

с условиями по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Борисовского района, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания, составляющих единый предмет аукциона

На аукционные торги выставляется:

Здание Дома-Музея (инв. № 610/С-45362), расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Черняховского, 17, 1948 года постройки, общей площадью 226,1 кв. м. Одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, облицованы кирпичом, перегородки бревенчатые, перекрытие деревянное, крыша шиферная, полы дощатые, линолеум, отопление — трубы металлические, электроснабжение — открытая проводка, вентиляция естественная, и **право заключения договора аренды земельного участка**, площадью 0,0682 га, сроком на 25 лет, предоставленного для обслуживания здания Дома-Музея.

Условия использования недвижимого имущества: создание спортивно-развлекательного центра и благоустройство прилегающей территории с размещением архитектурно-дизайнерского и ландшафтного ансамбля.

Условия использования земельного участка: использовать земельный участок для обслуживания здания с возможным изменением направления его использования в установленном порядке.

Начальная цена предмета аукциона 74 674 707 рублей (в том числе: недвижимое имущество — 67 890 697 рублей и право заключения договора аренды земельного участка — 6 784 010 рублей).

Сумма задатка предмета аукциона 5 000 000 руб.

Продавец имущества: Государственное учреждение «Борисовский парк культуры и отдыха имени М. Горького», расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, пр. Революции, 11, тел. (801777) 3 25 51.

Арендодатель земельного участка: Борисовский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заявление на участие в аукционе, заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон, по формам, утвержденным постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов»;

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом — доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем — нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическом лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина — нотариально удостоверенная доверенность.

Борисовский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан:

1. В течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка — договор аренды земельного участка.

2. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 30 декабря 2008 года.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел.: 224 57 09, 500 47 10.

Последний день подачи заявок: 23 декабря 2008 г. до 16.00.

Плательщик Борисовский РИК.

В извещении о проведении открытого аукциона по продаже изолированного помещения общ. пл. 379, 8 кв.м (цокольный, 1, 2 и 3 этажи), расположенного в административном здании по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7, опубликованном в газете «Звязда» от 17.10.2008 г., вместо: **«Начальная цена снижена на 20 % и составляет — 1 706 400 000 бел. руб. с НДС.»** читать: **«Начальная цена снижена на 20 % и составляет – 2 390 468 000 бел. руб. с НДС.».**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

На слыху

ДАРАГІЯ КАРАСІ

Пад Баранавічамі на вадасховішчы «Мышанка» двое жыхароў горада вырашылі палавіць рыбы і паставілі сеткі.

Браканьераў затрымалі супрацоўнікі Слонімскай міжрайінспекцыі. Улоў у іх быў не дужа ўжо і багаты: два шчупакі, столькі ж плотак, некалькі акунькоў, а найбольш карасёў — 99 штук. Страты прыродзе вызначаны ў 24 базавыя, а вось штраф можа быць удвая большым. Яго вызначыць суд.

Сымон Свістуновіч.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:

№ лота	Объект	Общая площадь (кв.м)	Адрес	Начальная цена (снижена на 10 %, бел. руб.)	Задаток
1	Одноэтажное кирпичное здание (состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, кран-балки)	851,1	г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5	387 976 500	10 %
2	Административное здание (2-этажное кирпичное)	474,9		464 497 200	10 %
3	Бокс гаражный	92,8		41 245 200	10 %
4	Шиферный склад	130,4		54 430 200	10 %

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **9 декабря 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **8 декабря 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Капитальные строения и сооружения и право заключения договора аренды земельного участка
Продавец недвижимого имущества	БТПРУП «Фармация» г. Брест, ул. Я. Купалы, 104, тел. 8(0162) 41 69 50
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская область, Барановичский район, Молчадский с/с, д. Молчадь, ул. Кирова, д. 37
Сведения о предмете аукциона	**Капитальное строение** (здание аптеки № 52) 1-этажное, 1929 г.п., общая площадь – 167,8 кв.м, фундамент бетонный ленточный, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная. Имеется отопление, электроснабжение, водопровод (газопроводные трубы), канализация. В состав имущества входит: аптека, погреб, веранда, уборная, забор. **Капитальное строение** (сарай) 1-этажное, 1985 г.п., общая площадь – 17,6 кв.м, стены – пеноблоки, фундамент бетонный, крыша шиферная. **Капитальное строение** (сарай) 1-этажное, 1985 г.п., общая площадь – 23,6 кв.м, стены кирпичные, фундамент бетонный, крыша шиферная. **Асфальтобетонное покрытие** – постилающий слой песчаный, основание гравийное, протяженность согласно тех. паспорта 18,0 м. Земельный участок площадью 0,1173 га, срок аренды – 50 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	41 063 916
Сумма задатка, руб.	4 106 390
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 23 44 06, 20 87 85, www.brest-region.by*

Аукцион состоится **30 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица.

4. Индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

7. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае рассрочки), возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и расходы на подготовку и проведение аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 29 декабря 2008 года включительно.

Выставы

АЛХІМІЯ ПРЫРОДЫ РЭНАТЫ БАЭРА

Выстаўка работ знакамітай італьянскай мастачкі Рэнаты Баэра адкрылася ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры.

Пасол Італіі ў Беларусі Нарберта Капела, прадстаўляючы мастачку, адзначыў, што яе работы вельмі падыходзяць да атмасферы, якая пануе ў Беларусі. «Спадарыня Баэра мае вялікі міжнародны вопыт, сёлета ўдзельнічала ў Б'енале ў Венецыі. Італія добра вядомая класічнымі помнікамі культуры. Разам з тым мае добрыя традыцыі і ў сучасным мастацтве, якое з'яўляецца выражэннем нашага нестабільнага часу».

Рэната Баэра — адна з найбольш адметных прадстаўнікоў сучаснага еўрапейскага мастацтва. З 1968-га, бурнага пратэснага для многіх еўрапейскіх краін года, яна адышла ад класікі і пачала працаваць у сваім, уласцівым толькі ёй стылі. «Мая мэта — не пратэставаць, а здзіўляць публіку», — прызнаецца мастачка.

У творах Рэнаты Баэра галоўны «персанаж» — жывапісная матэрыя. Колер у самых простых сваіх формах надае рытм кампазіцыі, свабоднай ад канкрэтнага вобраза. Інстынктыўнымі, амаль што рытуальнымі жэстамі мастачка з Генуі нібыта аднаўляе арганічныя формы і антычныя абразы. Яна выкарыстоўвае старажытныя тэхнікі, прыродныя пігменты. Карані, камяні, травы, грунты змешваюцца, перамолваюцца, варацца і разліваюцца амаль што алхімічным спосабам. Шматразова складзенае палатно прамочваецца фарбамі, слаі якіх кладуцца кожны раз па-новаму, набываючы нейкую чароўную сілу.

Адна з работ Рэнаты Баэра.

Рэната Баэра жыве і працуе ў Мілане, выкладае ў Акадэміі мастацтваў Брэра.

— Сучаснае мастацтва — частка нашай прыроды. Я выкарыстоўваю ў сваіх работах натуральныя арганічныя рэчывы: корань як сімвал жыцця, травы, каменне... Раслінныя матэрыялы — гэта своеасаблівы алфавіт, на які нанізваецца гісторыя жыцця, — гаворыць мастачка. — Я імкнуся выказаць ідэі, агульныя для прагрэсіўнага свету, у тым ліку пратэст супраць вайны. А ідэя згортвання і разгортвання мастацкага палатна — гэта як разгортванне і згортванне карцін свету. Для мяне вельмі важная ідэя дарогі, шляху.

Выстаўка твораў Рэнаты Баэра будзе працаваць да 4 снежня.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Фестывалі

Давайце знаёміцца!

Гала-канцэрт першага Міжвузаўскага фестывалю нацыянальных культур адбудзецца 26 лістапада ў Ліцэі Белдзяржуніверсітэта.

Яго ўдзельнікамі стануць студэнты сямі ВНУ сталіцы: БДУ, БДУІР, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Беларускага інстытута кіравання, Інстытута кіравання і прадпрымальніцтва. Усе яны выйшлі ў фінал па выніках адборачнага тура і прадставяць 10 краін: Беларусь, Азербайджан, Арменію, Грузію, Бельгію, Кітай, Турцыю, В'етнам, Іран і Нігерыю. Прыкмячальна, што многія канцэртныя нумары будуць выконвацца сумесна беларусамі і інша-земцамі.

Трэба дадаць, што Міжвузаўскі фестываль нацыянальных культур арганізаваны Белдзяржуніверсітэтам для папулярызацыі беларускай культуры сярод студэнтаў іншых нацыянальнасцяў, а таксама развіцця міжнародных сувязяў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ВІРТУАЛЬНАЕ ВЯСЕЛЛЕ «ПА-БЕЛАРУСКУ»

Усе прывабнасці і недахопы віртуальнага вяселля выпрабаваў на сабе наш карэспандэнт

Прызнацца, наша вяселле было вельмі сціплым. Не было ні сведкаў, ні кветак. Нават шлюбнае пасведчанне мы не заказвалі. Таму выдаткі ў нас былі мізэрнымі — толькі плата за інтэрнэт.

Усё, развод!

Адразу ж пасля вяселля Кацю пачалі адольваць сумненні.

— Сяргей, можа, нам усё гэта не трэба? Давай развядзёмся, пакуль не позна!

— А што тут такога страшнага? Навошта разводзіцца? — настойваў я. Але Каця вырашыла развесціся.

— Добра, я сама падам на развод!

Праз некалькі хвілін мне на электронную скрыню прыйшло паведамленне: «Грамадзянін! У адпаведнасці з законам вы пададзеныя на развод! Чакайце, да вас прыедуць!». Наш віртуальны шлюб праіснаваў усяго некалькі хвілін. Цяпер мы зноў свабодныя.

Кампетэнтна

Юлія КОХАВА, урач-псіхолаг: «Віртуальны шлюб — гэта ілюзія»

Віртуальная рэгістрацыя шлюбу роўна настолькі ж нефармальная з юрыдычнага пункту гледжання, як і шлюб у царкве. Але людзі ствараюць ілюзію таго, што віртуальны шлюб дае ім пачуццё ўнутранай адказнасці перад партнёрам, адчуванне маральных абавязкаў. Гэта далёка не так. Віртуальнае вяселле — гэта вынік таго, што людзі шмат часу праводзяць за камп'ютарам, які замяніў ім жывыя стасункі. Усё гэта можа прывесці да нечаканых наступстваў. А для кагосьці віртуальны шлюб — гэта проста жарт.

Дзмітрый БОБРЫК.

За паўгадзіны я паспеў не толькі ажаніцца, але і развесціся.

ноўчае «так», то па завяршэнні цырымоніі маладым выдаецца «Шлюбнае пасведчанне», якое можна раздрукаваць і захоўваць усё жыццё.

Прызнаюся, наконт вяселля я яшчэ не задумваўся, рана пакуль. Для гэтага патрэбна нейкая матэрыяльная аснова, інакш побыт з'есць каханне. А вось віртуальнае вяселле — гэта нешта новенькае, патрэбны сайт, праходжу рэгістрацыю. Вяселле было прызначана на 20.10. Праз трыццаць хвілін пачалася цырымонія віртуальнага шлюбу.

«Сяргей і Кацярына, мы рады вітаць вас у нашай віртуальнай «Зале шлюбаў». Ага, мы таксама рады. Далей нам трэба было адказаць на некалькі пытанняў. Прычым адказ павінен быць станоўчым у абодвух, інакш шлюб не будзе лічыцца сапраўдным.

«Ці згодны вы падтрымліваць каханую ва ўсіх пачынаннях? Ці абяцаеце вы на пляжы не зазірацца на маладых прыгажунь, калі побач каханая? Ці згодны вы любіць цешчу як родную маці, а цесця — як бацьку? Ці згодны вы не раздражняцца з-за свякоў каханай? Ці згодны вы глядзець усе тэлеперадачы, нават ненавісныя, калі яны падабаюцца каханай?».

Я адказаў на ўсе пытанні станоўча, як і Каця. Працэс шлюбу быў скончаны. Цяпер мы — віртуальныя муж і жонка!

Віншуем!

Сяргей і Кацярына, вы сталі віртуальнай сям'ёй.
Жадаем на жыццёвым шляху
Дарогу дакладную знайсці,
Перашкод не ведаць,
беды не мераць,
Кахаць, спадзявацца і верыць!

Тоўстых просьба не турбаваць!

«Шукаю прыстойнага і сімпатычнага маладога хлопца для заключэння віртуальнага шлюбу. Гарантую вернасць. Псіхічнахворых і тоўстых выradкаў просьба не турбаваць. Сняжана». Гэтае паведамленне я выпадкова знайшоў у інтэрнэце.

«Нічога сабе, ужо і да віртуальных шлюбаў дайшлі! А як жа першая шлюбная ноч! Таксама віртуальная?!» — здзівіўся я.

Добра, што дзяўчына пакінула кантакты, па якіх можна было з ёй звязацца. Пішу ёй ліст на паштовую скрыню з просьбай падрабязней расказаць мне аб віртуальных вяселлях.

Аказваецца, што Сняжана насамрэч хоча згуляць... віртуальнае вяселле. Яна тры разы выходзіла замуж «па-сапраўднаму», і ўсе няўдала. Цяпер вось вырашыла нічым сябе моцна не абцяжарваць.

Як праходзіць вяселле?

Вяселле ў інтэрнэце выглядае вельмі «цікава». Адзін з партнёраў падае заяву, у якой пазначае імя і адрас электроннай пошты выбранніка, а таксама дату і час цырымоніі. Жаніх і нявеста атрымліваюць электронныя лісты з запрашэннем і паролем на вяселле. У прызначаны час яны збіраюцца ў так званай «Зале шлюбаў» і ўводзяць дасланы пароль. Адбываецца рэгістрацыя шлюбу, падчас якой жаніху і нявесце задаюцца пытанні. Калі з двух бакоў прагучала толькі станоўчае «так», то па завяршэнні цырымоніі маладым выдаецца «Шлюбнае пасведчанне», якое можна раздрукаваць і захоўваць усё жыццё.

Прызнаюся, наконт вяселля я яшчэ не задумваўся, рана пакуль. Для гэтага патрэбна нейкая матэрыяльная аснова, інакш побыт з'есць каханне. А вось віртуальнае вяселле — гэта нешта новенькае, ні да чаго нікога не абавязвае. Можа, і мне паспрабаваць? А чым я рызыкую?

Тэлефаную сваёй дзяўчыне Каці, прапаноўваю ёй руку і сэрца, праўда, віртуальныя.

— Што? Што ты прыдумаў? Рана яшчэ нам жаніцца!

— Каця, ты не зразумела, я прапаноўваю табе віртуальны шлюб. Як ты на гэта глядзіш? — усё ніяк не супакойваюся.

Далей мне давялося доўга тлумачыць, што такое віртуальнае вяселле. Калі Каця зразумела, у чым сутнасць, адразу ж пачала смяяцца.

— Вядома, я згодна! А калі вяселле?

— Ды хоць зараз! — кажу я.

Я падключаю інтэрнэт, заходжу на

«ЛЯКУ, ЛЯКУ, ПЕРАЛЯКУ...»

Сіла слова

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 22 лістапада.)

Сустракаюцца і такія сведчанні: «Мохам, узятым на цвintары з трох магільных камянёў, трэба абкурыць хворага тры разы — на ўсходзе сонца, апоўдні і на захадзе». Абкурванне павуціннем, сабраным пад лавамі, з чатырох месцаў накрыж — добры сродак ад пуду, але адначасова шкодны вачам, бо ж хворага зрок прытупляецца, часам аж да поўнай слепаты.

Трэба развесіць на сцяне кажух воўнаю навыварат. Паставіць хворага ля сцяны, «раскрыжаванага» на тым кажуху, і ўрэшце, узяўшы з чатырох месцаў накрыж (ля галавы, ля ног, ля левай і правай рукі) патроху воўны з кажуха, абкурыць ёю хворага. П. Шэйн падкрэсліваў: «Ад сполаху і чараў абкурваюць дзіця свянцоным зеллем. Калі гэта не дапаможа, то дзіця (ад аднаго месяца да года), калі замесяць хлеб, кладуць у дзяжу зверху на цеста) і, закрыўшы накрыўкаю, трымаюць там прыблізна паўгадзіны. Калі дзіця пачне крычаць, яму даюць дунду і кажуць: «Як ён гэта на цесце прапацее, то будзе вельмі здароў і чараў не баіцца, бо ляжаў на дару Боскім». Вельмі цікава разважаў П. Дземідовіч: «Каб адагнаць пярэпалах, качаюць яйка хвораму чалавеку па целе, галоўным чынам па страўніку, спадзеючыся яйкам выбраць пярэпалах; у гэты час гавораць асобую замову. Пасля гэтага выліваюць у якую-небудзь пасудзіну ваду, яйка разбіваюць і жаўток з яго выліваюць у ваду. На тых фігурах, якія набудзе ў вадзе разбіты жаўток, вызначаюць, чаго напалохаўся хворы. Практыкуецца таксама змыванне пярэпалаху: яно робіцца над самім напалоханым, над пучком ягоных валасоў ці над якой-небудзь яго адзежынай. Супраць пярэпалаху ў міску з вадой над галавой у хворага выліваюць волава. Калі пры гэтым пачуецца гучны рэзкі гук — хворы паправіцца».

Калі ж пры такіх дзеяннях ды яшчэ пачнеш шаптаць замову, то любы ляк, бясспрэчна, адступіць: «Ляку-ляку, па касцях табе не хадзіць, касцей не ламіць, галаву не крушыць, сэрца не таміць. Ідзі ты, ляку, на мхі, на балоты, на ніцыя лозы, дзе птушкі не пяюць, дзе траўка не расце, там табе, ляку, бываць і жываць. Я й цябе, ляк, выгаварыла і дзённы, і касцяны, і курыны, і сабачы, і цялячы, і матчын, і бацькін. Чур цябе, раба божая Ніна... Гасподзь Бог і з помаччу, а я і з словам. Амінь». Трэба гаварыць на самым світанні. У канцы абавязкова сказаць тры словы: «Любі мой дух і дух Гасподні». Падуць тройчы. Усё паўтараецца. І замова, і дзеянні тройчы.

Цікава будзе даведацца і пра наступны факт: «Калі дзіця неспакойна варочаецца ўночы, матка лічыць, што гэта ад пярэпалаху. Каб адагнаць благое, купаюць дзіця ў ночвах. З абодвух канцоў ночваў трэба насыпаць шмат попелу. Дзіцяці націраюць тым попелам крыж і грудзі, беручы па шчопаці з кожнага канца. Выняўшы дзіця з ночваў, ссыпаюць у ваду рэшту попелу, а попел, што застаецца на дне, рукой збіраюць і сціскаюць у шарык. Яму даюць высахнуць і разломваюць на дзве палавіны. У самай яго сярэдзіне звычайна будзе тое, што прычынілася да дзіцячага пярэпалаху. Напрыклад, шэрсць. Тады, мяркуюць, чыя яна, ці сабакі, ці чорнага ката, ці іншай жывёлы іншай масці, тады кідаюць шарык разам з яго змесцівам у агонь і кажуць: «Як гэта шэрсць сабакі (ката) чорнага (рудога) гіне, так няхай яго сурок міне».

Вельмі баяліся маладыя мацярокі «чорных» вачэй злых, неспагадлівых людзей, якія маглі зрабіць так, што іхнія дзеці адразу пачыналі хварэць. У гэтае паняцце можна ўключаць і тое, што малыя і самі не спалі, і іншым не давалі адпачыць, не бралі есці, гарэлі ў гарачцы і г.д. Лічылася, што ад такіх вачэй можа дапамагчы толькі спагадлівая варажбітка, якая магла нават указаць, хто на дзяцей можа напускаць такую «порчу». Зноў-такі, спадзяваліся на замовы і на ўсёмагутныя замоўныя словы. «Госпадзі Божа, благаславі, ні самім сабою, а вячэрняю зарою. Вячэрняя зара-заранiца — божая памачніца. Выгаворваю. Вымаўляю і палёгку рабу божаму (імя) даваю. Амінь». (Жлоб. р-н.).

У П. Шэйна чытаем: «Трэба ўзяць засланку, дзе прагарэла, туды трэба тры разы сыпаць попел ад сябе. Потым перавярнуць рэшата і перасеяць попел на дошчачку і, узяўшы дзіця, паставіць ад сябе накрыж ножкамі, пасля чаго ўзяць дошчачку з попелам і паставіць на вугал. Дзе відаць, як сонца заходзіць. Пасля гэтага сурок пройдзе. Яшчэ трэба тры разы плюнуць, а калі не паможа, то бяруць вады з рота таго, хто сапсаваў, і даюць хвораму».

А. Багдановіч згадваў: «Уздрыгванне ад спалоху беларускія сяляне тлумачаць тым, што гэта «душа выскачыць хацела». Калі спалох вельмі моцны, лічаць, што душа ад гэтага можа апынуцца не на месцы ці зусім выскачыць з цела... Бяруць чатыры гарачыя вугольчыкі з печы апускаюць іх адзін за адным у пасудзіну з чыстай крынічнай вадой і потым гэтай вадой абмываюць хворага. Калі ж хвароба яшчэ больш моцная, то, каб вярнуць спалоханы дух, стрыгуць патроху валасоў у тых, хто мог напалохаць хворага, і тымі валасамі падкурваюць яго, прымушаючы глытаць дым. Калі прычынай спалоху была нейкая жывёліна, то і яе стрыгуць і поўсцю ці перыйкамі падкурваюць. Так робяць, відавочна, з таго меркавання, што разам з дымам увойдзе ў хворага яго спалоханы дух, які мог пасля спалоху спачуць на кім-небудзь з прысутных або на тых, хто да яго прычапіўся». Тое ж падкурванне робяць здабытымі няўзнак поўсцю ці пер'ем. Трэба заўважыць, што хвароба з усімі яе вынікамі пераходзіць пасля падкурвання на яе віноўніка, калі той выклікаў наўмысныя «спуды».

М. Нікіфароўскі апісаў два спосабы лячэння ад сурокаў. Першы спосаб вылячэння сурочанага дзіцяці называецца «прадзяванне»: дзіця «прадзяваецца», пераносіцца тры разы праз бацькоўскія штаны ад паяскоя разрэзу праз правую калашыну або левую. Другі спосаб мае назву «дапамога жывёле». Паводле гэтага спосабу, са штаноў вымаюць мотуз і надзяваюць на шыю жывёле, пакуль дзіця не вылечыцца.

П. Шэйн падкрэсліваў: «Вераць нашы сяляне і ў сілу паганага вока. Такому чалавеку, на іх думку, варта толькі паглядзець на парасятаў, ягнятаў, куранятаў, гусянятаў, качанятаў і інш., і абавязкова ўсе пераохнуць, а калі ён гляне на тоўстую кабылу, карову, свінню і г.д., то гэтыя жывёлы адразу пачнуць худнець. Але такіх шкадлівых людзей сяляне не вінавацяць, не ад іх залежыць, што іх вока такое небяспечнае, уся адказнасць падае на іх матак. Калі маці праз тры дні ці праз чатыры пасля таго, як адняме ад грудзей, шкадуючы яго, зноў дасць смактаць, яго вочы абавязкова зробяцца шкадлівымі. Такога чалавека ўсе пазбягаюць і стараюцца схаваць ад яго тыя рэчы, якім яго вока можа нашкодзіць».

Можна прывесці і іншае сведчанне: «Народ верыў, што іншыя людзі маюць благія, сурочлівыя вочы. Часамі гэткі чалавек сам не рад гэткім вачам, але ж гэта не ад яго залежа. Часамі, калі нейкі чалавек з сурочлівымі вачыма паглядзіць на нейкую жывёлу, дык гэта жывёла можа захварэць, а часам й здохнуць. З жывёлаў былі чулымі да сурокаў цяляты. Злодзей уздзейнічаў на радзіх і толькі што народжаных маладзёнкаў. Абаронай ад уродлівых вачэй быў ліванрэх (гэта было нейкае чорнае рэчыва, падобнае на смалу). Яго радзіхі трымалі і пры народжаных маладзёнках. Яго каровам прывязвалі да рог, а маленькім цялятам — да шыі. Найболей шкадавалі, калі ўродлівая людзіна пахваліць маленькую жывёліну ці дзіця, а не — калі хоць пільна паглядзіць... Дык трэба яму сказаць, а не — хоць падумаць: «Не ўрачы хаця».

Аляксей НЕНАДАВЕЦ.

КЛЁВА!

Практыка

ЯК ВЫБРАЦЬ ПАВАДОК ДЛЯ РЫБНАЙ ЛОЎЛІ

Пры вуджэнні ў праводку, нахлыстам, паплавочнымі вудамі ўжываюць тонкія капронавыя павадкі (жылкі). Пры лоўлі спінінгам, кружкамі і іншымі снасцямі, разлічанымі на драпежных рыбаў, часцей за ўсё шчупака, ставяцца металічныя павадкі. Але ж эластычныя, малапрыкметныя павадкі з капронавай жылкі лепшыя, чым металічныя.

У многіх выпадках лоўлі да ніжняга канца лёскі прывязваецца павадок. У залежнасці ад спосабу і ўмоў вуджэння ён прызначаецца для таго, каб: а) зрабіць снасць каля кручка і прынады менш прыкметнай для рыбы; б) засцерагчы лёску ад абрыву (металічны павадок засцерагае ад зубоў драпежнай рыбы); в) хутка змяніць штучную мушку або кручок з павадком.

Зменныя павадкі з жылкі робяцца даўжынёй ад 26 см да 1 м і болей, калі гэтага патрабуюць умовы лоўлі і асцярожнасць рыбы. Так, пры лоўлі ў праводку каля дна можна выкарыстоўваць павадок даўжынёй 25-30 см, а пры лоўлі з вадзяным змеем па паверхні вады прыходзіцца ставіць павадок 2-3 м.

Таўшчыня павадка залежыць ад спосабу лоўлі, памеру рыбы і таўшчыні лёскі. Трэба імкнуцца да яго найменшай таўшчыні, якая дапускаецца ўмовамі лоўлі, не забываючы пры гэтым, што ён абавязкова павінен быць разлічаны ў адпаведнасці з усёй снасцю. Нельга, напрыклад, ставіць вельмі тонкія павадкі, калі вудзільна грубае, цвёрдае або лёска тоўстая.

Прывязваецца павадок да лёскі зацяжным вузлом або пятлёй. Часам паміж лёскай і павадком ставіцца карабін. Карысна пафарбаваць павадкі з улікам умоў лоўлі.

Металічныя павадкі бываюць рознымі. Прасцейшы з іх — адзінарны, стальны, таўшчынёй 0,1—0,3 мм. Ён робіцца з прамога адрэзка дроту, які не звіваецца ў свабодным становішчы невялікімі кольцамі і не ламаецца пры згібах. Кручаныя металічныя павадкі з двух сталёвых дроцікаў часта цвёрдыя і грубаватыя. Перакручаныя, яны ламаюцца хутчэй адзінарных.

Мяккія, зручныя і моцныя павадкі са сталёвага троса, звітага з 12—15 вельмі тонкіх дроцікаў: яны не перакручваюцца, не баяцца пералому, але канцы іх слаба трымаюцца пры закручванні. Гэты недахоп можна ліквідаваць, змазаўшы канцы павадка, якія трэба скручваць, клеем БФ-2 і затым даць ім цалкам высахнуць. Пайка канцоў менш зручная, паколькі яна стварае цвёрдыя месцы ў павадку, каля якіх хутчэй можа атрымацца пералом.

Не варта браць для павадкоў медны або латунны дрот, бо тонкі для гэтай мэты слабы, а таўсцейшы — грубы. Для павадкоў, якія выкарыстоўваюцца ў аснастцы кружкоў, часам выкарыстоўваюць плацініт. Павадкі з яго мяккія і малапрыкметныя, але саступаюць па трываласці стальным. Даўжыня металічных павадкоў звычайна невялікая — ад 10 да 30 см.

На жыўцовых снасцях выкарыстоўваюць каленчатыя металічныя павадкі з адзінарнага сталёвага дроту, якія складаюцца з 2-6 каленаў, яны менш ломкія, амаль не абмяжоўваюць рухаў жыўца.

Каленчатыя павадкі выкарыстоўваюць на донных дарожках, пры вертыкальнай глыбіннай лоўлі на жыўца. Яны дазваляюць трымаць прынаду на зададзеным узроўні, не даючы ёй блытацца вакол асноўнай лёскі. Металічныя павадкі рэкамендуецца аксідаваць у цёмныя тоны і пакрываць супраць карозіі змазкай або водатрывалым лакам. Бліскучыя і светлыя павадкі для лоўлі непрыдатныя.

Часам прыходзіцца лавіць ва ўмовах, калі любое грузіла захрасае на дне, сярод камянёў. У гэтым выпадку рэкамендуецца выкарыстоўваць асобныя тонкія бавоўняныя павадкі для грузілаў, а ў якасці грузу выкарыстаць невялікі камень. Такі павадок лёгка абрываецца пры выцягванні снасці, а сама снасць застаецца цэлай.

Запасныя павадкі варта захоўваць у адмысловай «кніжачцы» з канвертамі з цэлафану. У іх яны не блытаюцца паміж сабой, іх добра відаць, і лёгка выбраць патрэбны.

Майстэрня

ПАДЛЁДНАЯ ЖАРЛІЦА

Падлёдную жарліцу падвешваем да пакладзенай папярок лункі дошкі-трымальніка (мал. 1). У ёй высвідроўваем адтуліну Б1, і робім прапіл Ф для стрыжня сцяжка. Сам трымальнік папярэдне зачышчаем скуркай і пакрываем лакам. Усталёўваем сігналізатар, які складаецца з балта са спружынай і чырвонага сцяжка на стрыжні з тонкай гнуткай сталёвай палоскі даўжынёй 250—300 міліметраў.

Мал.1.



Стойка для балта сігнальнай прылады ўяўляе драўляны кубік (мал. 2), выпілаваны з дошкі таўшчынёй 30 міліметраў. У цэнтры высвідроўваем скразную адтуліну б2 дыяметрам 8 міліметраў. Стойку ўмацоўваем шрубамі на трымальніку такім чынам, каб адтуліны Б1 і Б2 супалі. На стрыжань балта надзяваем спружыну, болт устаўляем у адтуліны б2, Б1 і замацоўваем гайкай. У сабраным выглядзе галоўка балта павінна выступаць над паверхняй стойкі на 4—5 міліметраў.

Мал.2.



Адзін канец злучальнага шнура прапускаем у адтуліну балта і трывала замацоўваем, да другога прывязваем сталёвую зашчапку, з дапамогай якой жарліца злучана з сігнальнай прыладай. Даўжыня злучальнага шнура залежыць ад умоў лоўлі.

Націснуўшы пальцам на галоўку, якая выступае, правяраем свабодны ход балта ў адтулінах Б1, б2. Ціск спружыны павінен быць такім, каб болт не змяшчаўся ўніз пад цяжарам грузіла і рухаў бойкага жыўца, а рэагаваў толькі на рывок драпежніка.

Спружына сігнальнай прылады (мал. 3) адначасова выконвае функцыю амартызатара — гасіць рыўкі рыбы, якая ўзяла жыўца, пасля таго як яна сцягнула з рамкі жарліцы ўсю лёску. Пераканаўшыся, што механізм сігналізатара дзейнічае нармальна, устаўляем у прапіл Ф стрыжань сігнальнага сцяжка; згінаем стрыжань такім чынам, каб канец са сцяжком упіраўся ў частку галоўкі балта, якая выступае.

Мал.3.

Пацягнуўшы за злучальны шнур (імітуем момант, калі рыба бярэцца), ссоўваем уніз частку галоўкі балта, якая выступае, пры гэтым вызваляецца і распросцваецца стрыжань сцяжка. Замест П-падобнай драцяной рамкі для падлёднай жарліцы выкарыстоўваем больш трывалую — рамку-квадрат (мал. 4), якая не дэфармуецца пры намотванні лёскі дыяметрам 0,5—0,7 міліметра. Згінаем рамку з адрэзка ацынкаванага або нержавеючага дроту дыяметрам 2,5—3 і даўжынёй 360 міліметраў. Канцы Б рамкі абмотваем тонкім медным дротам, запайваем і надзяваем на іх гумовую шайбу-стопар.

Мал.4.



У кольца А рамкі ўводзім зашчапку злучальнага шнура, з дапамогай якога рамка падвешваецца да балта сігнальнай прылады. На рамку намотваем лёску, абсталёўваем грузілам і трайніком. Жарліца гатовая (мал. 5).

Мал.5.

Мал. 1. *Трымальнік: 1— месца для стойкі; 2 — адтуліна для балта Б1 (6 мм); 3 — прапіл Ф.*

Мал. 2. *Стойка.*

Мал. 3. *Сігнальная прылада: 1— болт; 2 — гайка; 3 — спружына; 4 — сталёвы стрыжань; 5 — сцяжок.*

Мал. 4. *Рамка-квадрат: 1 — металічная рамка-квадрат; 2 — гумовая шайба-стопар.*

Мал. 5. *Падлёдная жарліца ў сабраным выглядзе: 1 — прапіл; 2 — сцяжок; 3 — болт; 4 — спружына; 5 — стойка; 6 — гайка; 7 — адтуліна для шнура; 8 — злучальны шнур; 9 — зашчапка; 10 — рамка-квадрат; 11 — стопар; 12 — трымальнік.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.56	15.57	8.01
Віцебск —	7.52	15.41	7.49
Магілёў —	7.46	15.48	8.02
Гомель —	7.35	15.51	8.16
Гродна —	8.09	16.13	8.04
Брэст —	8.03	16.21	8.18

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Барыса, Івана, Канстанціна, Ніла, Уладзіміра.*

К. *Кацярыны, Марыі, Клеменса, Яўхіма.*



Дзве даты

25 лістапада

1714 год — нарадзіўся (г. Навагрудак) Тамаш Жаброўскі, беларускі архітэктар, матэматык. Прадстаўнік стылю барока. Выкладаў у Віленскай іезуіцкай акадэміі і Полацкім калегіуме. Сярод асноўных яго работ — іезуіцкі касцёл у Бабруйску, касцёл св. Ігната і калегіум у Вільні і інш. Праектаваў таксама палац Агінскага ў вёсцы Руцыца на Вілейшчыне.

1500 год — па абвінавачанні ў злоўжываннях у Санта-Дамінга закаваны ў кандалы і адпраўлены ў Іспанію Хрыстафор Калумб.

Цытата дня:

«Лёгкім здаецца слова таму, хто яго кіне, але цяжкім — таму, у кага яно трапіць».

Бальтасар Грасіян (1601—1658), іспанскі пісьменнік.

РАЗБІЦЬ ПОСУД

СВЕТ І СУСВЕТ ЧАЛАВЕКА

Разбіванне посуду — рытуальна-магічнае дзеянне, якое выконвалі ў працэсе развіцця некаторых сямейна-радавых абрадаў ці ў дні некаторых святаў каляндарнага цыкла. Гэты рытуал меў дваісты характар. З аднаго боку, калі разбівалі посуд, зычылі багацця, нараджэння здаровых дзяцей, пладаноснасці, шчасця. З другога боку, разбіць посуд азначала «знішчыць» штосьці (хваробу, няшчасці, беды і г.д.).

- У вясельным абрадзе практычна паўсюдна выкарыстоўвалі рытуал разбівання посуду. Гэтым самым сімвалізавалі змену фізічнага і сацыяльнага статусу маладых: гаршкі білі ў знак таго, што да вяселля дзяўчына была «цэльная», а пасля вяселля «разбілася».
- Ва Украіне і ў Беларусі і сёння выконваюць наступны абрад: пасля вянчання або рэгістрацыі ў ЗАГСе маладых сустракаюць на парозе бацькоўскай хаты, і бацькі, перш чым маладыя пераступяць парог, падносяць ім дзве чаркі гарэлкі. Згодна з традыцыяй, маладыя павінны пакаштаваць «горкую» і ў знак пратэсту выліць гарэлку праз левае плячо. Дзеянне паўтаралася двойчы, а за трэцім разам трэба было чарку з гарэлкай перакінуць цераз левае плячо такім чынам, каб яна разбілася. Такое рытуальнае дзеянне маладыя выконвалі толькі ў тым выпадку, калі нявеста была цнатлівай.
- Часцей за ўсё посуд білі перад або пасля першай шлюбнай ночы. Пасля таго як у пакой зайшлі маладыя, нехта з гасцей — можа, бацькі, можа, сваты — падыходзілі да дзвярэй гэтага пакоя і разбівалі аб дзверы гліняны посуд. Пры гэтым казалі: «Колькі чарапкоў, столькі дзяцей маладым!».
- Доўгі час у шматлікіх раёнах Беларусі існаваў звычай: пасля першай шлюбнай ночы жаніх выходзіў з пакояў і разбіваў талерку ў доказ таго, што нявеста была цнатлівай.
- Некалькі стагоддзяў запар на вяселлях існаваў звычай біць посуд на другі ці трэці дзень вяселля, калі высвятлялася, што маладая была «нячэснай». Бясчынствы гасцей дасягалі такіх памераў, што ў хаце нявесты магло не застацца ні адной цэлай рэчы.
- У пахавальным абрадзе таксама існаваў звычай біць посуд, напрыклад, неабходна было разбіць гаршчок, дзе была вада, якой мылі памерлага.
- Разбіванне посуду прысутнічала і ў радзінным абрадзе. Так, напрыканцы святочнага абеду ў гонар хрышчэння дзіцяці, бабка-павітуха выносіла гаршчок з кашай і прасіла за яго выкуп. Той, хто больш за іншых даваў грошай, а звычайна гэта былі хросныя бацькі дзіцяці, атрымліваў права разбіць гаршчок. Па кашы меркавалі аб будучым лёсе дзіцяці: калі каша рассыпалася па стале, гэта было дрэннай прыкметай, калі ж яна захоўвала форму гаршка, гэта было добрым знакам.
- Абавязкова неабходна было разбіць штосьці з посуду ў дзень свайго нараджэння ці імянін — гэта лічылася добрым знакам.
- Ганчары верылі ў тое, што калі не разбіць адзін новы гаршчок перад пачаткам гандлю, поспеху не будзе.
- У народнай медыцыне таксама выкарыстоўвалі разбіванне посуду. У гаршку варылі траўкі-зёлкі, паілі хворага чалавека і імгненна разбівалі гэты гаршчок у яго над галавой, каб тым самым прадухіліць, спыніць хваробу.
- Паўсюдна лічылася: калі посуд б'ецца пры пабочных асобах, гэта прадказвае прыбытак, дабрабыт дому і гаспадарцы: «На піру посуд б'ецца — шчасце гаспадару».
- У той жа час посуд, які разбіўся на Раство ці на Новы год, на Вялікдзень, прадказваў няшчасці і беды, смерць аднаго з дамачадцаў.
- Няшчасце прадказвае трэснуты посуд. Дома ніколі не захоўвалі надколаты, шчарбаты, трэснуты посуд.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Па радыё паведамляюць: з турмы збег небяспечны злачынец, прыметы перадаюць, будзьце асцярожныя... На другі дзень паведамленне — усё ў парадку, злачынец раніцай добраахвотна вярнуўся ў турму. Набеглі журналісты, пытаюцца: як жа так, чаму, маўляў, вы вярнуліся, пазбавілі сябе волі?

Мужык:

— Я ў дамавіне бачыў гэтую волю! Пад раніцу прабраўся дадому, а мне жонка — ты дзе швэндаўся, сабака, па радыё яшчэ ў шэсць вечара сказалі, што ты збег!

☺

Эфектыўней за ўсё міннае поле размініруецца пры дапамозе палахлівых страусаў.

☺

Дзве сяброўкі ў аўтасалоне.

— Лена, а якую машынку ты хочаш?

— «Мерседэс».

— І як ты яго тут шукаць збіраешся? Глянь, колькі тут машын.

— Мне Мішка сказаў, што трэба шукаць машыну, у якой спераду кальцо з нацягнутымі на яго стрынгамі...

ЗВЯЗДА
БЕ